Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

ЛіМ

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ISSN 0024-4686

№ 37 (4532) 2 кастрычніка 2009 г.

У нумары:

У Саюзе пісьменнікаў Беларусі

Будзе падпісана дамова аб супрацоўніцтве СПБ і інстытутаў НАН Беларусі.

Стар. 2

«У кучу думкі пазбіраю»

Выпуск кніг «у аўтарскай рэдакцыі»: што за гэтым хаваецца?

Стар. 4

«Шчасце, Грышачка, гэта...»

Прыкра, калі ў чытацкі дзённік выпісваецца толькі назва кнігі ды імя аўтара.

Стар. 6

Бацькавай зямлі — паклон

Анджэй Струміла — адметная постаць у сусветнай культуры — наш зямляк.

Стар. 10

Якуб Колас і музыка

Упершыню друкуецца тэкст аднаго з выступленняў Данілы Міцкевіча на Беларускім радыё.

Стар. 15

ІДЗЕ ПАДПІСКА НА IV КВАРТАЛ 2009 г.

Для індывідуальных падпісчыкаў:
1 месяц — 7760 руб.
Падпісны індэкс — 63856

Ведамасная падпіска:
1 месяц — 10060 руб.
Падпісны індэкс — 638562

Індывідуальная льготная падпіска для настаўнікаў: на 1 месяц — 5200 руб. Падпісны індэкс — 63815

Льготная падпіска для ўстаноў культуры і адукацыі:
1 месяц — 7870 руб. Падпісны індэкс — 63880

Каб год для вас быў неблагім — падпішыцеся на «ЛіМ»!

Раскрытая кніга. Францыск Скарына. Біблія. Крыштальны легкакрылы журавель. Еўфрасіння Полацкая. Кнігі. Пяро і сшытак. Нацыянальная бібліятэка Беларусі... І зноў — легкакрылы журавель. Яго палёт над сцэнаю Ліцэя БДУ азнаменаваў, адкрыў, узвысіў фінал традыцыйнага, напярэдадні Дня настаўніка, штогадовага конкурсу прафесійнага майстэрства педагагічных работнікаў — «Настаўнік года».

Я сэрцам табе прысягаю...

Спраектаваныя на сцэну малюнкі школьнага жыцця і выявы каштоўнасцей, без чаго немагчыма ўяўленне пра Радзіму, спадчыну, мову плаўна змянялі ўрачысты фон, насычаючы прысутных духам любові да свайго, роднага. Мелодыя-пралог урачыстасці ўшанавання пераможцаў, лепшых з лепшых настаўнікаў, лаўрэатаў і ўдзельнікаў суперфіналу конкурсу "Крыштальны журавель" была да болю знаёмая: "Каб любіць Беларусь нашу мілую"... І хор хлопчыкаў, які выйшаў затым на сцэну, заспяваў: "Радзіма мая дарагая"...

А пасля з высокай сцэны загаварылі пра тое, якія на гэтай Радзіме людзі і які ён — сённяшні беларускі настаўнік. Напачатку — менавіта пра тое, які *беларускі* настаўнік — ва ўмовах існавання камп'ютэраў, а з імі і Інтэрнета, розных іншых супертэхналогій. Чаму ён лепшы?

"Каб паглядзець, як працуюць настаўнікі, я пайшоў на ўрок — падзяліўся сваімі назіраннямі міністр адукацыі Аляксандр Радзькоў. — *Гэта быў урок астраноміі аднаго з лепшых настаўнікаў краіны — Валерыя Васільевіча Барашкава. Мне было цікава, як жа можна з вучняў звычайнага класа зрабіць пераможцаў Міжнародных алімпіяд, якія вярнуліся з залатымі медалямі, прычым, некалькімі! І я ўбачыў сапраўднага настаўніка, у якога — сапраўды педагагічны лёс!"*

Настаўнікам года-2009 названы дырэктар Ганцавіцкай школы Брэсцкай вобласці, настаўнік біялогіі Юрый Андрэйчык.

Але пытанне пра першаасновы немагчымае без клопату пра мову. *Які ж ён, настаўнік беларускай мовы і літаратуры?* Чым жыве?

Удзельніца суперфіналу конкурсу "Крыштальны журавель", уладальніца Дыплома III катэгорыі, настаўніца беларускай мовы і літаратуры з Віцебска Галіна Сухава атрымала яшчэ і Дыплом, які быў ёй уручаны падчас правядзення конкурсу ў Акадэміі паслядыпломнай адукацыі — "За любоў да роднай мовы". У школе Галіна Анатольеўна вядзе 9-я і 11-я класы. Настаўнічае 15 гадоў — пасля Віцебскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута. "Ва ўмовах скарачэння праграмы на дапамогу прыходзіць метадыка, — заўважае лаўрэат конкурсу. — Трэба так спланаваць, так заінтрыгаваць, каб быць упэўненым, што вучань прачытае твор. Тэмай маёй праектнай

дзейнасці на конкурсе "Настаўнік года" было "Разуменне". Гэта цікава, калі можна зразумець твор і знайсці шляхі інтэрпрэтацыі вобраза, тэмы. Неабходна развіваць дыскусійнасць — тады ёсць гарантыя, што дзеці будуць чытаць і фармуляваць сваё бачанне твора".

У размове між іншым кранаем тэму сучасных тэхналогій: у Інтэрнеце заўсёды можна знайсці скарочаны пераказ літаратурнага твора. Дапаможнік для лянівага школьніка? Ды вось бяда: часам да такіх крыніц звяртаюцца, каб... правільна адказаць на тэставыя заданні. У часопісе "Беларуская мова і літаратура" ў тэставых заданнях для вучняў пытаюцца, да прыкладу, колькі частак у рамане І. Шамякіна "Сэрца на далоні"? Варыянты адказаў: да прыкладу 42, 45, 47. "І я не запамінаю, колькі частак, — гаворыць Галіна Анатольеўна. — Мне гэта нецікава! Пры такіх заданнях няма куды падзецца, як толькі чытаць скарочаны твор! Хтосьці з настаўнікаў, магчыма, і выкарыстоўвае падобныя методыкі. Я іх абсалютна не прымаю! Галоўнае — тэма, аўтарская задума!"

Галіна Анатольеўна распавядае, што знаёміць вучняў з сучаснай беларускай літаратурай, выкарыстоўвае часопісы "Полымя", "Маладосць", газету "Літаратура і мастацтва". Вывучаць і літаратуру і мову, спасцігаючы яе багацце, найлепш, лічыць лаўрэат конкурсу, па творах Уладзіміра Караткевіча, Янкі Брыля, Васіля Быкава.

У наступным годзе для настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры новы клопат: трэба пераходзіць да выкладання прадмета па новых правілах беларускай арфаграфіі. Пытаюся наконт гэтага думкі аднаго з лепшых настаўнікаў — "Вельмі баюся, каб не пачалася блытаніна. Бо творы мастацкай літаратуры не адразу пераўладуць па новым правапісе. Будзе так, што літаратура адна, а вучым другое. Маё глыбокае перакананне: ўсё залежыць ад настаўніка. Калі мы будзем плакаць і гаварыць, што мала гадзін адводзіцца на беларускую літаратуру, то адкуль дзеці будуць любіць гэты прадмет? У мяне летась дзеці сталі размаўляць па-беларуску ў паўсядзённым жыцці. Атрымалася!"

Гэта сапраўды майстэрства — у надзвычай камп'ютэрызаваных умовах грамадскага жыцця ўмець яшчэ столькі ўкладаць у маладыя душы, з клопатам пра адукацыю і маладую асобу, якая сталее на тваіх вачах. Калі чалавек увогуле прыгожа працуе — гэткае гледзішча заварожвае! Калі прыгожа настаўнічае — "Каб любіць Беларусь нашу мілую" — душа спявае, а сэрца прысягае...

Ірына ТУЛУПАВА

На здымках: міністр адукацыі Рэспублікі Беларусь Аляксандр Радзькоў і настаўнік года-2009 Юрый Андрэйчык; настаўніца беларускай мовы і літаратуры з Віцебска Галіна Сухава.

Фота Кастуся Дробава

Валянцін ЛУКША

Слова пра першага настаўніка

Калі сярод усіх зямных прафесій,
І вывераных за вякі навук,
Мяне папросяць
вызначыцца з першай, —
Настаўніцкую справу назаву.

Я помню, як у год пасляваенны,
Прывёў у школу пераможны час.
Ў штанах, зацыраваных на каленях,
Зайшоў настаўнік
першы ў першы клас.

Спазнаўшы партызанскія дарогі,
Прайшоўшы ўсю Еўропу напрасткі,
Ён быў, як камісар, занадта строгі,
І быў занадта мяккі, як бацькі.

За кожнага хварэў душой і целам,
І кожнаму ў жыцці дапамагаў:
"Каб мара, як пухір, не адляцела,
На вёслы штохвілінна налягай!"

Ён не пабачыць, кім мы сёння сталі, —
Трымаем край надзейна на руках, —
Прадымлены, прастрэлены настаўнік,
У цыраваных франтавых штанах.

Пункцірам

• У Інстытуце гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі прайшла Міжнародная навуковая канферэнцыя "Восень 1939 года ў гістарычным лёсе Беларусі". Удзел у канферэнцыі прынялі навукоўцы з Беларусі, Польшчы, Украіны, Эстоніі. Доктар гістарычных навук Аляксандр Кавaленя выказаўся за тое, што беларускія гісторыкі не павінны маўчаць, а даносіць сваю пазіцыю да навукоўцаў з іншых краін: "Мы не асуджаем пакт Рыбентропа — Молатава, мы прапаноўваем не палітызаваць гісторыю, а сумеснымі намаганнямі больш дасканала вывучаць агульнае мінулае".

• Беларуская дэлегацыя на IV Форуме творчай і навуковай інтэлігенцыі дзяржаў-удзельніц СНД падтрымала ініцыятыву Арменіі па абвяшчэнні 2011-га Годам гісторыка-культурнай спадчыны ў СНД. Разгляд гэтага пытання яшчэ адбудзецца. Форум прайшоў у Кішынёве пры ўдзеле 450 вядомых навукоўцаў, дзеячаў мастацтва, прадстаўнікоў сферы адукацыі.

• У Вілейскім раёне адкрылі памятны знак у гонар Эдварда Жалігоўскага і Тараса Шаўчэнкі. Дзве мемарыяльныя дошкі з'явіліся на ўспамін пра сяброўства паэтаў. Сёлета спаўняцца 195 гадоў украінскаму пісьменніку, а праз год столькі ж споўніцца з дня нараджэння польскага паэта беларускага паходжання. Таксама закладзены дубовы гай. Удзел у мерапрыемстве ўзяў Пасол Украіны ў Беларусі Ігар Ліхавы.

• На XII Міжнародным фестывалі анімацыйных фільмаў "Анімаёўка-2009" гран-пры атрымала стужка кінастудыі "Беларусьфільм" "Аповесць мінулых гадоў". Рэжысёр — Ігар Воўчак. Над мультфільмам працавалі таксама Аляксандр Ленкін, Мікалай Касцючэнка, Наталля Хаткевіч, Яўген Надточай, Таццяна Кубліцкая. У "Аповесці мінулых гадоў" распавядаецца пра гісторыю гербаў беларускіх гарадоў. У праграме сёлетняга фестывалю ўдзельнічалі 42 мультыплікацыйныя стужкі з дванаццаці краін, а перамагла беларускамоўная.

• У Гомелі ў палацы Румянцавых-Паскевічаў працуе выстава, прысвечаная модзе XVI—XIX стагоддзяў. На ёй прадстаўлена мужчынскае і жаночае адзенне Іспаніі XVI, Англіі і Францыі XVII—XIX стагоддзяў. Калекцыя касцюмаў выканана сучаснымі майстрамі ў адпаведнасці з фасонамі тых часоў. Мадэльеры пры працы абапіраліся на матэрыялы жывапісных палотнаў еўрапейскіх музеяў і карцінных галерэй. Гэта дазволіла майстрам у поўнай ступені паказаць, якія змены адбываліся ў адзенні.

• Заўтра, 3 кастрычніка, пройдзе фестываль "Галышанскі замак". Гэта будзе рэпетыцыя перад святкаваннем 400-годдзя замка ў наступным годзе. Асновай фестывалю стане выступленне гурта "Стары Ольса", які сёлета адзначае сваё дзесяцігоддзе. Удзел прымуць таксама гурты "Келіх кола", "Расалія", "Тэстаментум Тэррэ". Каля сценаў замка разгорнецца восеньскі кірмаш і продаж вырабаў беларускіх майстроў. Мерапрыемства арганізавана Ашмянскім райвыканкамам і адным з турыстычных агенцтваў.

• У Мінску ў Літаратурным музеі імя Максіма Багдановіча прайшла прэзентацыя кнігі Рыгора Барадуліна "Паслаў бы табе душу..." Выданне склала ліставанне народнага паэта Беларусі з мамай Кулінай Андэеўнай. Гэта лісты 1954 — 1971 гадоў. Першыя допісы прыпадаюць акурат на час, калі Рыгор Іванавіч паехаў з роднай вёскі на вучобу ў Мінск. Кніга з'явілася да стагоддзя Куліны Андрэеўны.

Падрыхтаваў Павел РАДЫНА

У Саюзе пісьменнікаў Беларусі

"Трэба працаваць разам, дружна на карысць Радзімы" — такім стаўся галоўны лейтматыў сустрэчы членаў прэзідыума Саюза пісьменнікаў Беларусі і дырэктараў гуманітарных інстытутаў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

За "круглым сталом" абмяркоўваўся шэраг пытанняў па напрамках магчымага супрацоўніцтва. І пісьменнікі, і навукоўцы адзінадушна прызналі: падмурак для такога супрацоўніцтва даўно закладзены. Але гэта — пачатак дыялога, які б мог быць больш прадметным і змястоўным. Ініцыятарам супрацоўніцтва творцаў і навукоўцаў выступіў старшыня СПБ Мікалай Чаргінец. З боку інстытутаў НАН Беларусі падрыхтаваны шэраг прапаноў, дзе пазначаны агульныя падыходы да ажыццяўлення дыялога. Да прыкладу, прапануецца падрыхтоўка і выданне кніг па літаратуразнаўстве і крытыцы ў серыі "Бібліятэка Саюза пісьменнікаў Беларусі", аказанне Саюзу пісьменнікаў Беларусі садзейнічання ў пошуку дакументальных архіўных матэрыялаў аб гістарычных персанажах; рэцэнзаванне літаратурных (мастацкіх і дакументальных) рукапісаў, сцэнарыяў з мэтай вызначэння іх гістарычнай дакладнасці; ажыццяўленне сумеснага гісторыка-папулярнага праекта — выданне літаратурна-мастацкай серыі пра знаных літаратараў, асветнікаў, грамадскіх дзеячаў Беларусі; арганізацыя пры падтрымцы Інстытута філасофіі пастаяннa дзеючага семінара для маладых пісьменнікаў па актуальных праблемах сучаснасці. Гэтыя прапановы былі вынесены для абмеркавання, а канкрэтнае іх напаўненне адбудзецца падчас працы ў інстытутах. Цяпер рабочая група будзе працаваць над канчатковым варыянтам дакументаў, неабходных для падпісання дамовы аб супрацоўніцтве.

Рыта СТАХ

* * *

Удзельнікаў Рэспубліканскага конкурсу творчых і навукова-даследчых вучнёўскіх прац узнагародзіў часопіс "Роднае слова". На цырымонію ўручэння ў Дом літаратара прыехалі настаўнікі і школьнікі з самых розных раёнаў краіны. Паколькі гэта першая спроба "Роднага слова" правесці такую акцыю, было вырашана, што ў гэтым спаборніцтве будуць толькі пераможцы — аўтары ўсіх дасланых прац атрымалі дыпломы першай, другой ці трэцяй ступеняў, кніжкі, часопісы. Геаграфія конкурсу вельмі багатая, асабліва актыўна ўдзельнічалі юнакі з Вілейкі, Смаргоні, Брэста, а вось з Мінска конкурсныя працы даслалі толькі дзве школы і прафесійна-тэхнічнае вучылішча будаўнікоў № 148, якія аднак вельмі

ўразілі журы. "У хлопцаў цудоўныя вершы, іх калектыўныя зборнікі былі адзначаныя першым дыпломам, а адзін з навучэнцаў Юрый Роўба асобна атрымаў узнагароду за кнігу "Не Авідый я, не Дантэ", — распавёў адказны сакратара часопіса "Роднае слова" Аляксандр Кананoвіч. Згадваючы самыя запамінальныя працы, ён таксама назваў паэтычныя творы першакурсніцы філфака БДУ Бажэны Мацюк і юнай удзельніцы конкурсу пяцікласніцы Уладзіславы Жаваранкавай.

Узнагароды за навукова-даследчыя працы школьнікі атрымлівалі разам са сваімі педагогамі — часцей за ўсё, настаўнікамі беларускай мовы і літаратуры.

Саша ДОРСКАЯ

На здымках: удзельнікі сустрэчы ў археалагічным музеі Інстытута гісторыі НАН Беларусі; Віктар Праўдзін уручае дыпломы навучэнцам ПТВ № 148 будаўнікоў.

Фота Кастуся Дробава

Пад святым крыжам Еўфрасінні

За падзеяй

"Я радуюся таму, что гэты дзівосны Крыжаўзвіжанскі храм, абноўлены пасля дзесяцігоддзяў забыцця, яўляе сабою пэўны вобраз перамогі народнай веры, народнага духу над усімі цяжкімі і пакутлівымі перыпетыямі гісторыі", — словы Патрыярха Кірыла (падчас яго знаходжання ў Полацку), які наведаў нашу краіну апошнімі вераснёўскімі днямі.

Першасвяціцельскі візіт Патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі Кірыла ў Рэспубліку Беларусь адбыўся падчас аднаго з галоўных гадавых царкоўных двунадзесятых свят — Узвіжання Крыжа Гасподняга. І людзі, помнячы запаветы продкаў, рыхтаваліся да свята разважна і мудра: чысцілі і ўпрыгожвалі святыні, вярталіся думкамі да высокага, духоўнага. Балазе, мажлівасць такая мелася. Цягам апошніх дзесяцігоддзяў у многіх рэгіёнах Беларусі адноўленыя храмы. Так што ўпрыгожваць можна было і свае, маленькія малельні — "чырвоныя" куточкі ў хатах, дзе зазвычай вісіць іконка-абярэг, і нашы агульныя святыні. Што да апошніх, то яны смірэнна і годна, ва ўрачыстым убранні сустракалі высокіх гасцей.

Патрыярх Кірыл наведаў многія з іх: галоўны наш праваслаўны храм — Свята-Духаў кафедральны сабор, таксама храм-помнік у гонар Усіх Святых, Дом Міласэрнасці ў Мінску; Свята-Крыжа-Узвіжанскі сабор і Спаса-Праабражэнскі храм Свята-Еўфрасіньеўскага жаночага манастыра і сабор Святой Сафіі ў Полацку, Свята-Пакроўскі кафедральны сабор і Свята-Успенскі кафедральны сабор горада Віцебска, ды ў ім жа: Свята-Уваскрасенскі і Свята-Нікалаеўскі храмы. У праграму царкоўнага знаходжання арганічна ўвайшлі і мерапрыемствы духоўнага зместу агульнаграмадзянскага гучання: ускладанне кветак да Вечнага агню на плошчы Перамогі ў Мінску, удзел у цырымоніі адкрыцця плошчы Перамогі ў Віцебскуя. Паўсюль — сустрэчы са святарамі і прыхаджанамі, з беларускімі людзьмі і пакланенне нашым святыням.

Праваслаўны місіянер, прафесар Маскоўскай духоўнай акадэміі протадыякан Андрэй Кураеў заўважыў адну з галоўных асаблівасцей нашага краю: паводле яго слоў, у Беларусі праваслаўе ў меншай ступені імкнецца толькі капіраваць мінулае. Не парушаючы канонаў, тут не баяцца і не баяліся раней адлюстроўваць свой уласны час. Гэта бачна па архітэктуры Мінскага епархіяльнага ўпраўлення, Дома Міласэрнасці і беларускай іканаграфіі XX стагоддзя — сказаў айцец Андрэй.

Між іншым, і канцэрт на ўрачыстым акце ў Палацы Рэспублікі, дзе адбылася сустрэча з навуковай і творчай інтэлігенцыяй, яскрава ілюстраваў рэальны час.

Мастацкае афармленне сцэны было выканана з выкарыстаннем архітэктурнага вобраза Полацкага Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра і вянчалася выявай Крыжа прападобнай ігуменні Еўфрасінні. І тэму беларускіх святых, адначасова — асветнікаў зямлі беларускай імкнуліся працягнуць і як мага шырэй раскрыць усе артыстыі.

Заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўны ансамбль танца Беларусі (мастацкі кіраўнік — народны артыст Беларусі Валянцін Дудкевіч) прадставілі кампазіцыю "Еўфрасіння", харэаграфію "Беларускія мадонны" выканаў Беларускі дзяржаўны заслужаны харэаграфічны ансамбль "Харошкі", спеўную кампазіцыю "Як велічна, як хораша" выканала салістка Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь Анастасія Масквіна і Дзяржаўны акадэмічны сімфанічны аркестр Рэспублікі Беларусь. Песню "Белавежская пушча" выканаў народны артыст Беларусі Анатоль Ярмоленка і ансамбль "Сябры". Дарэчы, сумесна з аркестравай музыкай гучала са сцэны і выратавальная музыка званоў. Званы, на якіх гралі лепшыя з уцэркаўлёных музыкаў, былі таксама ўстаноўлены на сцэне. Пад іх перазвон на экране паказваліся кадры з нашай праваслаўнай сучаснай гісторыі — як адраджаліся і будаваліся храмы.

Ірына ТУЛУПАВА

На здымку: Патрыярх Кірыл накіроўваецца ў "Свята-Духаў" кафедральны сабор.

Фота Кастуся Дробава

Анонс

Зоркі граюць класіку

Сузор'е майстроў сусветнага ўзроўню і маладых, але ўжо вядомых талентаў — гарантыя поспеху Міжнароднага фестывалю Юрыя Башмета, што чацвёрты год запар ладкуецца ў нашай сталіцы. Урачыстае адкрыццё падзеі адбудзецца 4 кастрычніка, і пачнецца сапраўдны зорны тыдзень — тыдзень сустрэч з цудоўнай музыкай і яе натхнёнымі выканаўцамі.

Безумоўна, у цэнтры падзеі — "Паганіні альта" Юрый Башмет, легендарны саліст, маэстра, прафесар Маскоўскай дзяржаўнай кансерваторыі, педагог з сусветным імем. Маэстра Башмет, узняўшы альт як сольны інструмент на вышыню музычнага Алімпа, выступае і як дырыжор з лепшымі сімфанічнымі аркестрамі: Берлінскім, Венскім, Нью-Йоркскім філарманічнымі, "San Francisco Symphony", "Chicago Symphony", "Orchestra Radio France", "Orchestra de Paris" ды іншымі. У Мінску ён ужо не ўпершыню выступіць і як альтыст, і як кіраўнік аркестра "Новая Россия".

Зрэшты, ні Юрый Башмет, ні яго знакамітыя калегі — удзельнікі фестывалю, не маюць патрэбы ў рэкамендацыях. Імёны народнага артыста СССР, скрыпача, прафесара Вышэйшай музычнай школы ў Кёльне Віктара Траццякова, піяніста і кампазітара, таксама прафесара гэтай ВНУ Васіля Лабанава, народных артыстак СССР — легендарнай спявачкі, стваральніцы і кіраўніка Цэнтра оперы Галіны Вішнеўскай ды віяланчэлісткі, прафесара Маскоўскай дзяржаўнай кансерваторыі Наталлі Гутман гаворацъ самі за сябе.

Канцэрты, майстар-класы прафесараў з Кёльна, Лондана, Мадрыда, Масквы, Санкт-Пецярбурга, творчыя сустрэчы адбудуцца ў Беларускай дзяржаўнай філармоніі і ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. У межах фестывалю разгорнецца дзейнасць Маладзёжнай акадэміі краін СНД.

Не пералічыць усіх удзельнікаў фестывальных імпрэз. У іх ліку — нашы суайчыннікі: салісты і аркестр Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі, Прэзідэнцкага аркестра Рэспублікі Беларусь пад кіраўніцтвам В. Бабарыкіна, Акадэмічны сімфанічны аркестр краіны пад кіраўніцтвам А. Анісімава, стыпендыяты спецыяльнага фонду Прэзідэнта Беларусі па падтрымцы таленавітай моладзі. Новае пакаленне музыкантаў прадставяць, напрыклад, бліскучы беларускі скрыпач, лаўрэат міжнародных конкурсаў Арцём Шышкоў і піяніст Расціслаў Крымер — выпускнік Рэспубліканскага каледжа пры БДАМ, музычных акадэмій у Хельсінкі ды Кёльне, аспірантуры Каралеўскай музычнай акадэміі ў Лондане, ініцыятар і мастацкі кіраўнік фестывалю. Так, выступленні маладых талентаў поруч са знакамітасцямі — у традыцыях гэтага форуму.

Шыкоўным будзе яго адкрыццё ў Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатры оперы і балета Беларусі. Замоўлена вялікая праграма "Вечар Кармэн" з удзелам сімфанічнага аркестра "Новая Россия" пад кіраўніцтвам Юрыя Башмета, артыстаў Беларускай і Баварскай оперы, акадэмічнай балетнай трупы Украіны, прыма-балерыны Марыінскага тэатра Ульяны Лапаткінай, салістаў балета Вялікага тэатра Расіі.

Я. КАРЛІМА

Вектар

У Беларусі пачалася праца па стварэнні электроннай бібліятэкі, у будучым — Нацыянальнай электроннай бібліятэкі. Пра гэта стала вядома падчас прэс-канферэнцыі з нагоды Дня бібліятэк, якая праходзіла днямі ў Нацыянальным прэс-цэнтры. Намеснік дырэктара НББ Людміла Кірухіна падкрэсліла: на сёння аблічбавана звыш 40 тысяч дакументаў з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і зроблена 430 тысяч запісаў.

...Плюс яшчэ адна нацыянальная скарбніца

Сёлета нашай Нацыянальнай бібліятэцы ўдалося атрымаць і доступ да электроннай бібліятэкі старадрукаў, так званы "Манускрыптарый", які з'яўляецца папулярным сярод еўрапейскіх карыстальнікаў. Адначасова ідзе актыўная падрыхтоўка да ўступлення НББ у Сусветную электронную бібліятэку. Мы становімся паўнапраўнымі чытачамі духоўных скарбніц усяго свету!

Між іншым, у чэрвені гэтага года споўнілася тры гады з таго моманту, як Нацыянальная бібліятэка Беларусі гасцінна расчыніла свае дзверы наведвальнікам. За гэты час шмат што зроблена, і з дня на дзень паслядоўна рэалізуецца канцэпцыя стварэння на базе бібліятэкі рэспубліканскага інфармацыйнага сацыякультурнага цэнтра. Яшчэ адзін крок да гэтага — сёлета ў НББ адкрылі інтэрнет-версію электроннага каталога бібліятэкі. Цяпер усе жадаючыя праз інтэрнет-партал могуць звяртацца да інфармацыйных рэсурсаў — здзяйсняць пошук і выконваць такую функцыю, як заказ дакумента ў рэжыме аддаленага часу.

Інтэрнет-версія электроннага каталога сёння налічвае 1 млн. 2 тыс. запісаў. Таксама створаны імідж-каталог — гэта версія таго, што мае НББ у сваіх фондах. Кожны, хто звяртаецца да інфармацыі праз партал НББ, атрымлівае амаль усю інфармацыю пра фонды.

Нацыянальная бібліятэка Беларусі як галоўная кніжная скарбніца краіны налічвае ў сваіх фондах каля 9 мільёнаў адзінак захоўвання. Штогод яе наведваюць больш як 2,5 млн. чалавек. Гэта тыя, хто бывае ў чытальных залах і карыстаецца сайтам установы, а таксама становіцца ўдзельнікам арганізаваных бібліятэкай мерапрыемстваў.

Цалкам жа сучасная бібліятэчная сістэма Беларусі ўключае каля 9 300 публічных і спецыяльных бібліятэк з агульным фондам звыш 200 мільёнаў экземпляраў. Пра гэта паведаміла начальнік упраўлення ўстаноў культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры Беларусі Наталля Аўдзеева. Гаворачы пра ролю кніжных скарбніц, Наталля Пятроўна зазначыла: яны адыгрываюць вялікую ролю ў фарміраванні культуры нацыі, а яна, у сваю чаргу, фарміруе лад жыцця, сістэму каштоўнасцей і светапогляд. Таму так важна, каб у краіне бібліятэкі маглі паўнацэнна функцыянаваць.

Найбольш шматлюднай у сучасных умовах, натуральна, з'яўляецца сетка бібліятэк Міністэрства культуры Беларусі. Маецца 6 абласных бібліятэк, 3 918 публічных.

Цягам гадоў застаецца адносна стабільным працэнт ахопу насельніцтва публічнымі бібліятэкамі — каля 40 працэнтаў. На сяле — 52 працэнты! Аддаючы даніну часу і сусветным тэндэнцыям, у сістэме абслугоўвання цяпер развіваюцца новыя формы, да прыкладу, усё больш становіцца бібліятэк-аўтобусаў, якія прывозяць літаратуру ў самыя аддаленыя куточкі дзяржавы (практыка, між іншым, амаль усяго свету, мы яе запазычылі ў краінах Еўропы).

Шмат бібліятэк перапрафіляваліся, з'явіліся такія новыя формы як бібліятэкі-клубы і інш.

На адну бібліятэку сёння прыходзіцца 2, 4 тыс. жыхароў. Гэта адпавядае нарматывам ЮНЕСКА. Амаль кожны другі жыхар Беларусі з'яўляецца карыстальнікам публічных бібліятэк.

Ярына РЫТАМІНСКАЯ

Фота Кастуся Дробава

З-пад пяра

У Музеі кнігі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі адбылася выстаўка "Азербайджан, Беларусь і сусветныя класікі ў мініяцюрнай кнізе". У нашай краіне ўпершыню экспанаваліся каштоўнасці з азербайджанскага Музея мініяцюрнай кнігі — прыватнага музея, стваральнікам якога ў горадзе Баку з'яўляецца Зарыфа Салахава, заслужаны работнік культуры Азербайджана. У экспазіцыі — больш як 350 рарытэтаў з дадзенага музея, выдадзеных у Азербайджане, Японіі, Германіі, Англіі, Францыі, Расіі, ЗША, Ізраілі, Саудаўскай Аравіі і іншых краінах. У тым ліку найбольш рэдкія — японскія мікракнігі фарматам 2х2 мм.

На выстаўцы экспанавалася таксама беларуская мініяцюрная кніга. Да слова, у фондзе Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі захоўваюцца тры беларускія мініяцюрныя выданні першай паловы XX стагоддзя — кнігі, выдадзеныя ў Гомелі ў 1930-м, у Мінску ў 1932 годзе і ў Баранавічах у 1948-м. Другая палова XX стагоддзя прадстаўлялася мініяцюрнымі выданнямі прозы і паэзіі А. Міцкевіча, Якуба Коласа, Янкі Купалы, М. Багдановіча, В. Быкава, М. Танка, Р. Барадуліна, Н. Гілевіча, Л. Дранько-Майсюка ды іншых, а таксама выданнямі твораў замежных класікаў літаратуры.

В. К.

Факультэт беларускай філалогіі і культуры Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта наведаў галоўны рэдактар часопіса "Полымя" паэт Мікола Мятліцкі.

На пачатку сустрэчы паэт павіншаваў першакурснікаў са здзяйсненнем іх мары — набыццём статуса студэнтаў вышэйшай навучальнай установы. На яго думку, выбар менавіта філалагічнага факультэта дапаможа не толькі набыць багатыя веды па літаратуры — ён у многім прадвызначыць лёс кожнага. "Я асабіста пераканаўся ў тым, што філолагі вельмі гуманныя і шчырыя людзі. Там дзе ёсць філалагічны выток, там ёсць вялікае адчуванне справы, чалавечая годнасць і мудрасць" — зазначыў Мікола Мятліцкі.

Факультэт беларускай філалогіі і культуры педуніверсітэта ўжо колькі год рыхтуе як выкладчыкаў беларускай мовы і літаратуры, так і выдатных журналістаў. Таму Мікола Мятліцкі цікавы студэнтам не толькі як паэт, але і як галоўны рэдактар часопіса "Полымя".

Пазнаёміўшы студэнтаў з дзейнасцю часопіса на працягу яго існавання, сённяшні яго галоўны рэдактар расказаў пра сучасны стан "Полымя", запрасіў прысутных да больш актыўнага супрацоўніцтва з літаратурна-мастацкімі выданнямі. Вядома, не засталася ўбаку і творчасць самога госця. Студэнты з задавальненнем слухалі вершы паэта, а самыя смелыя творцы не пабаяліся вынесці на яго суд уласныя вершы і пачулі справядлівую ацэнку.

Ірына ЧАРНЯЎСКАЯ

Актавая зала мінскай бібліятэкі № 5 сабрала шмат гасцей, у тым ліку студэнтаў ваеннага факультэта Мінскага дзяржмедуніверсітэта і навучэнцаў будаўнічага архітэктурнага каледжа. Дырэктар бібліятэкі Алёна Калейнік прадставіла гасцям паэта-барда Анатоля Кудласевіча.

Так пачаўся творчы вечар паэта "Не хлебам адзіным...", на якім гучалі песні на вершы Францішка Багушэвіча, Якуба Коласа і Янкі Купалы, на вершы сучасных паэтаў Міхася Шэлехава і Міколы Пракаповіча, а таксама аўтарскія песні. Паэзія не пакінула слухачоў абыякавымі — прагучалі шматлікія пытанні: пра сучасны стан літаратуры, пра месца чалавека ў жыцці, пра маральныя крытэрыі, якіх чалавек павінен прытрымлівацца.

На заканчэнне Анатоль Кудласевіч усцешыў слухачоў яшчэ і парыдыйным жанрам. Прагучалі пародыі на вершы сучасных паэтаў Рыгора Барадуліна, Казіміра Камейшы, Раісы Баравіковай, Уладзіміра Марука, Алеся Бадака ды іншых.

Мікола ФЛАРЯНОВІЧ

Анкета

Шаноўны чытач, як зазвычай, адразу пасля летніх вакацый заканчваецца перыяд "адпрацоўкі" пэўных творчых і літаратурных планаў, а таксама калектыўных рэдакцыйных вымаганняў. З наступам новага "сезона" (пачаткам навучальнага года і непазбежным набліжэннем новага года ўвогуле) само сабой напрошваецца падсумаванне зробленага і нейкія намёткі ды накіды наступнага. Адчуваючы пульс нашага часу, яго павевы, новыя літаратурныя і культурніцкія дачыненні ў ім творчых людзей розных поглядаў і мастацкіх накірункаў, хацелася б мець не толькі вузка-рэдакцыйную, але і больш шырокую, чытацкую думку па гэтых пытаннях.

З гэтай прычыны рэдакцыя тыднёвіка і прапануе сваю анкету.

1. Раскажыце коратка пра сябе.

2. З якой пары і з якой прычыны вы з'яўляецеся чытачом нашай газеты?

3. У чым палягае лімаўская адметнасць у параўнанні з іншымі выданнямі падобнага накірунку?

4. Хто з аўтараў (штатных і пазаштатных) найбольш імпануе вам сваім мысленнем і стылем? Якія рубрыкі вам найбольш цікавыя?

5. Якія тэмы газета павінна закранаць глыбей і шырэй (перыядычна)?

6. Што перашкаджае вам быць нашым пастаянным аўтарам?

Адказы прыносьце і дасылайце звычайнай і электроннай поштай да 1 лістапада 2009 года. Аб'ём адказаў не павінен перавышаць трох старонак машынапісу альбо 4000 знакаў.

Загадзя дзякуем.

«Залаты яблык» зноў у Беларусі

Узнагароды

Штогод у Браціславе праводзіцца Міжнароднае біенале кніжнай ілюстрацыі.

Сёлета галоўны яго прыз "Залаты яблык-2009" атрымаў беларускі мастак Павел Татарнікаў, гэта — найважнейшая ўзнагарода Еўропы сярод конкурсаў кніжных ілюстрацый. Тым большы гонар для нашага мастака і для ўсёй Беларусі, што ён атрымаў міжнародны прыз двойчы: упершыню ганаровую міжнародную ўзнагароду сярод кніжных ілюстратараў Павел Татарнікаў атрымаў у 2001 годзе за ілюстрацыі да народнай казкі "Царэўна ў падземным царстве", "Залаты яблык" гэтага года мастаку прысудзілі за ілюстрацыі да кнігі "Артур — кароль Альбіёна", над якімі П. Татарнікаў працаваў цэлы год.

Неаднойчы Павел Татарнікаў атрымліваў прызы і ўзнагароды на прэстыжных міжнародных конкурсах: у 1999 годзе — «Залатое пяро Белграда» за ілюстрацыі да кнігі «Аповесць мінулых гадоў», яго працы двойчы праходзілі на Балонскую кніжную ярмарку. Кнігі з яго ілюстрацыямі перакладзены на многія мовы народаў свету. Вось і апошняя, «Артур — кароль Альбіёна», за якую мастак атрымаў «Залаты яблык», ужо выдадзена ў Англіі, Канадзе, ЗША, Нарвегіі, Харватыі... Але, па словах мастака, з асаблівай цеплынёй адносіцца ён да ўзнагарод, якія атрымаў у Беларусі, сярод якіх прызы нацыянальнага конкурсу «Мастацтва кнігі» і «Мастак і кніга».

У бліжэйшых планах мастака — выхад кнігі Алеся Краўцэвіча «Рыцары і дойліды Гародні» і ўдзел у рэспубліканскай выстаўцы ў Палацы мастацтва, прысвечанай тысячагоддзю Літвы, якая павінна прайсці ў кастрычніку.

Анатоль КУДЛАСЕВІЧ

Сувязны беларускай і таджыкскай літаратур

Садружнасць

Прэзідэнт Таджыкістана Эмамалі Рахмон не аднойчы падкрэсліваў: "...істотна пашырыліся сувязі народа Таджыкістана з народамі краін свету, яго знаёмства з агульначалавечымі каштоўнасцямі і іх успрыманне..."

Адметным фактам літаратурнага пабрацімства стаў прыём вядомага пісьменніка Ато Хамдама ў члены Саюза пісьменнікаў Беларусі. І гэта не выпадковасць. Літаратар, які жыве і працуе ў Душанбе, зрабіў нямала для развіцця стасункаў беларускай і таджыкскай літаратур. У Таджыкістане ў 2009 годзе па яго ініцыятыве выдадзена анталогія сучаснай беларускай паэзіі і прозы "Вячэрні касцёр", а таксама кніга афарызмаў беларускага празаіка Георгія Марчука. Ато Хамдам ініцыіраваў многія публікацыі таджыкскіх пісьменнікаў і паэтаў у Беларусі. Як выдавец і літаратар ён неаднойчы прыязджаў у Беларусь, наведаў Хатынь і Брэсцкую крэпасць.

Ато Хамдам нарадзіўся 13 чэрвеня 1948 года ў кішлаку Ташбулак Гісарскага раёна тады яшчэ Таджыкскай ССР. У 1973 годзе скончыў філалагічны факультэт Таджыкскага дзяржаўнага універсітэта. У 1977 — аддзяленне журналістыкі Ташкенцкай ВПШ. Працаваў у раённай газеце, затым — у рэспубліканскім друку. З 1977 года — галоўны рэдактар таджыкскай рэспубліканскай маладзёжнай газеты. Першыя нарысы і апавяданні надрукаваў на пачатку 1970-х гадоў. Аўтар кніг публіцыстыкі "Усмешка шчасця", "Сэнс жыцця", "Працяг шляху", "Два тыдні на БАМе", "Залатыя рукі", "Маладыя гаспадары зямлі", "Вышыня", "Ключ да сэрца". У тэатрах Таджыкістана былі пастаўлены яго п'есы "Першынец", "Плады", "Апошняя ахвяра", "Пачатак", "Сын радзімы", "Перад дажджом", "Жыццё працягваецца"... Асобныя п'есы перакладзены на рускую, узбекскую, туркменскую, марыйскую і іншыя мовы. У сааўтарстве з нашым земляком Леанідам Чыгрыным Ато Хамдам напісаў больш за дзесяць гістарычных раманаў. Яны выдадзены не толькі на таджыкскай і рускай мовах, але перакладзены на італьянскую, турэцкую, кітайскую і іншыя мовы свету. Першы сярод таджыкскіх пісьменнікаў Ато Хамдам адзначаны Вышэйшай літаратурнай прэміяй Пакістана. Цяпер літаратар працуе галоўным рэдактарам душанбінскага выдавецтва "ЭР- граф".

Кастусь ХАДЫКА

«Бібліятэка Саюза пісьменнікаў Беларусі»

Шчодрасць таленту

Прырода бывае вельмі шчодрай да асобных людзей: яна адорвае іх шматгранным талентам. Да ліку такіх трэба аднесці і Ю. Фатнева. Ён і добры паэт, і празаік, і ўдумлівы літаратурны крытык.

У Гомельскай абласной бібліятэцы імя А. С. Герцэна адбылася прэзентацыя яго новага рамана "У эха нет лица". Аўтару прыхільнікі яго творчасці выказалі шмат цёплых слоў, далі высокую ацэнку яго літаратурнай працы.

У сваім творы пісьменнік пераносіць нас у вельмі далёкую па храналогіі эпоху — XI—XII стагоддзі. Старажытная, раздробленая на асобныя ўдзельныя княствы Русь. Пастаянная барацьба за ўладу, за новыя землі... Незлічоныя ваенныя паходы князёў, набегі полаўцаў, якія адымалі жыццё ў тысяч людзей... бязлітаснасць, каварства, здрадніцтва... Суровы, бязлітасны час! Але, як кажуць, з песні словы не выкінеш. Гэта наша гісторыя, і ад яе нікуды не схаваешся, нікуды не ўцячэш.

Ю. Фатнеў углядаецца ў далёкі час вострым, уласцівым мастаку позіркам. Праз увесь яго твор праходзіць думка пра шкоду міжусобіц, пра неабходнасць яднання славянскіх народаў. Гэта было важным у XI—XII стагоддзях, як і сёння.

У рамане шмат персанажаў. Літаратурныя героі і гістарычныя асобы пададзены як звычайныя жывыя людзі з уласцівымі ім пачуццямі і слабасцямі. Пісьменнік умее яркімі мазкамі паказаць асаблівасці чалавечых характараў. Магчыма, аўтару трэба было больш увагі ўдзяліць апісанню мірных жыццёвых будняў герояў. Не пашкодзіла б для вызначэння родавых сувязей асобна змясціць генеалагічныя звесткі дзеючых асоб.

Як і ў добрай паэзіі, тэкст рамана сціслы, метафарычны, кожнае слова напоўнена глыбокім сэнсам. Таму аўтару кнігі ўдаецца адлюстраваць такі вялікі гістарычны перыяд з мноствам падзей на 350 старонках. У пацвярджэнне гэтага хочацца прывесці невялікі ўрывак з рамана.

«Это было странное состояние — он потерял себя, будто его размыло туманом. Но зримый мир остался. Клубились кроны деревьев. Трепыхались пятна света. Мелькала какая-то птица. Вроде дятел или удод. По-прежнему звучала музыка, то становясь отчетливей, то отступая в неведомую глубь.

Он осознал себя слишком поздно. Конь оступился с невидимой струны и вместе со всадником оказался на ладони волхва. Остай усмехнулся:

— Что, испугался, князь? Ну погляди разок на то, от чего отрекся твой прадед...»

Якая вобразнасць, якое харство мовы і глыбіня думкі! І так амаль на кожнай старонцы.

Зразумелае імкненне Ю. Фатнева наблізіць нас як шчыльней да далёкага мінулага. Таму ў рамане шырока выкарыстоўваецца стараславянская мова. Але гэта крыху і ўскладняе ўспрыманне тэксту, а асобныя словы, на мой погляд, патрабуюць спецыяльных тлумачэнняў.

Гэта не простая кніга. Але тыя, каму неабыякава гісторыя Радзімы, без сумнення з вялікім інтарэсам прачытаюць яе. Сур'ёзнасць і значнасць рамана пацвярджаецца і тым, што ён выдадзены ў серыі кніг "Бібліятэка Саюза пісьменнікаў Беларусі" немалым накладам — 1000 экземпляраў.

Трэба асабліва адзначыць, што напісанню кнігі, паспяховаму творчаму палёту думак аўтара, безумоўна, папярэднічала значная праца Ю. Фатнева з архіўнымі матэрыяламі. Можна толькі вітаць такую зайздросную працавітасць.

І хоць раман называецца "У эха нет лица", пры чытанні яго мы добра бачым твар таленавітага пісьменніка.

Вядома, гэтыя мае развагі не прэтэндуюць на шырокі літаратуразнаўчы разгляд кнігі. Гэта толькі першыя чытацкія ўражанні ад прачытанага, якімі хочацца падзяліцца з іншымі. Да таго ж, апошняя кропка ў рамане не пастаўлена. Ю. Фатнеў мяркуе напісаць другую частку. І застаецца толькі пажадаць яму новых творчых поспехаў.

Барыс КАВАЛЕРЧЫК

«У кучу думкі пазбіраю»

З цікавасцю прачытала ў «ЛіМе» пра паэтычны зборнік гамяльчанкі Марыі Маліноўскай (нумар за 31 ліпеня г.г.). Выйшаў зборнік у выдавецтве "Барк" з наступнай прыпіскай: "у аўтарскай рэдакцыі". Мяне гэта прыпіска навяла на роздум. Маладая і здольная аўтарка не даверыла нікому рэдагаванне сваёй першай кніжкі? А можа, не знайшла вопытнага рэдактара? Тады чаму выдавецтва не прапанавала ёй неабходную паслугу? Я ўспомніла, што ў маёй бібліятэцы ўжо ёсць некалькі выданняў, дзе аўтар "сам сабе рэдактар". На практыцы гэта азначае, што кніга выдадзена, але не падрыхтавана да друку. Па прынцыпе: плаці грошы, і мы цябе прадставім па поўнай праграме.

Вершаваны зборнік без рэдактара пазнаць не цяжка. Перш за ўсё ён, як кажуць, не выбудаваны, г. зн. вершы высыпаны, як бульба з каша, без усялякай унутранай логікі і без раздзелаў. (Адзначу, што падзел кніжкі на раздзелы — справа для пачаткоўца не такая простая.) Па-другое, цалкам адсутнічае адбор па якасці. Што аўтар "накрэмзаў" і набраў, тое і выдаецца, падчас нават з захаваннем граматычных памылак. Па-трэцяе, нават някепска задуманыя вершы могуць быць сапсаваны стылёвымі "ляпамі" і сэнсавай блытанінай — калі не расчытаеш, а што ж уласна паэт хацеў сказаць. Як тут не згадаць колішняга галоўнага рэдактара "ЛіМа" Міколу Гіля: "Хай будзе што заўгодна, але — уцямна!" Між тым рэдактар можа выратаваць верш, проста адцяўшы лішнюю страфу альбо замяніўшы недакладнае слова.

Дастаю з паліцы падобную кнігу, дзе няма пазнакі "у аўтарскай", але і прозвішча рэдактара адсутнічае. Кніга як кніга, нармальна афармленая, усе УДК і ББК на месцы... Разгортваю — і... Няхай чытачы самі ацэняць мастацкую вартасць такой вершатворчасці.

Пра Мінск:

"У пералівах вуліц і праспектаў
Я ***безлічоны раз*** *гатоў прайсці." (с.10)*

Пра Беларусь:

"І чамусьці ***маўклівыя крыкі***
Як прадмова да нейкага ***здання..."*** *(с.12)*

Пра класіка:

"Кроплі твораў *яго неўміручыя..." (с.7)*

Пра свет:

"Гінуць людзі ***мноствамі***
У шалёных дзеяннях".(С.14)

Пра храм:

"І мне тады здаецца, ***паміж волі,***
Звон у душу ўразаецца глыбока". (с.13)

Пра старасць:

Напомніць здалёку, успрыгне на плечы,
А што маладосць? Уцячэ ад яе.
Бо ёй бараніцца, гаворачы, нечым,
І нават пытанне зусім не ўстае."

Пра роднае слова:

"Ільецца яно ад сучасных
Паэтаў і паэтэс.
Становішся быццам п'яны,
З'яўляецца інтарэс.
Я быў на адным семінары,
Дзе песняй гучала мова,
А ў ціхім ***сардэчным абшары***
Нібы прыбівалі падкову." *(с.19)*

Пра культуру:

"Зубамі сціснеш цыгарэту,
Дакурыш, а куды шыбнуць?
Пішу ў раённую газету
Курс на культуру павярнуць." (с.22)

Пра паэзію:

"У кучу думкі пазбіраю
І ў глыбіні душы сваёй
У вершы разам аб'яднаю,
Ахутаныя чысцінёй".

Пра лёс:

"...Хоць на хвілінку свой убачыць лёс,
Ахутаны зялёнаю сумою."

Мяне б расчуліла гэтая "зялёная сума", калі б не так шмат было ў зборніку звычайнай непісьменнасці. Што-што, а шматлікія русізмы тыпу "луна", "няўдачны паварот", "гарызонт", "вярцець" і г.д. мог бы выправіць і карэктар.

Дзеля справядлівасці трэба зазначыць, што калі творца не замахваецца на "хвіласофію", а піша пра знаёмае, роднае, блізкае, яго голас цяплее, інтанацыі робяцца жывымі, а вобразы — нязмушанымі. Надзённа гучыць экалагічная тэма, ёсць прабліскі ў жанрах сатыры і гумару. Такога тыпу творчасць выдаюць звычайна сціплымі брашуркамі самвыдату і раздаюць знаёмым.

Зразумейце мяне правільна. Ніхто не адмаўляе ў праве літаратурна адоранаму чалавеку выдаць за свой кошт кніжку — для ўласнага самасцвярджэння ці на памяць дзецям. Напрыклад, паэтка з Клецка Альдонія Наўчанкова выпусціла першую паэтычную кнігу да свайго 70-годдзя, і яе можна павіншаваць як з юбілеем, так і з выхадам "на людзі".

Калі дападны пачатковец (любога ўзросту і полу) здольны знайсці фундатара і выдаўца, то чаму б з гэткім самым поспехам не адшукаць літаратурнага кансультанта? Першы зборнік можа мець не сто, а пяцьдзесят старонак, затое ў яго ўвойдзе сапраўды лепшае з напісанага. Плюс практычная работа над словам, якую патрабуе творчае ўзаемадзеянне з літаратурным памочнікам. Плюс уменне бачыць свае творы вачамі іншага чалавека (чаго так не хапае паэтам-аматарам). Прачытае, дапусцім, рэдактар, наступны радок *"Песня бы нясецца каляскіцай"* — і скажа: "Нясецца, памойму, курыца на седале. Лепш — імчыцца. А ваша "бы" азначае, што вы неяк не ўпэўнены наконт таго, хто там нясецца. Да таго ж, каляскіцай карысталіся ў старажытныя часы." І гэтак далей. Я, вядома, утрырую. А як яшчэ пераканаць самаўпэўненага піята з рукапісам пад пахай, які не засвоіў азоў вершаскладання, затое спіць і бачыць сябе аўтарам саліднай кніжэнцыі?!

"Як магу, так пішу. Не вучыўся нідзе я", — шчыра прызнаецца аўтар, якога я вышэй цытавала. Свядома не называю яго прозвішча, назаву толькі год выдання — 2005, і выдавецтва — "Тэхналогія".

Праблема палягае якраз у гэтай плоскасці — у **адказнасці** выдавецтваў за прадукцыю, якую яны выпускаюць. На практыцы ствараецца заганны ланцужок: выдавец падводзіць аўтара (бо не трымае планку якасці), аўтар — фундатара, які "адшчыкнуў" паэўную суму на аматарскую творчасць. Дарэчы, раскажу показку пра фундатара (пачутую ў 90-я гады). Паэтка N. займела моду выпрошваць грошы на выданне сваіх кніжак у банкіраў. Адзін з іх, калі яна зноў прыйшла, сказаў памочнікам: "Калі вы яе дапусціце да мяне яшчэ раз, я выкінуся з акна".

Паважаныя аўтары тэкстаў! Пашкадуйце дзядзькоў з грашыма! Яны ж звычайна не ведаюць, на **што** даюць грошы!

Галіна ЗІНКЕВІЧ

З рэдакцыйнай пошты

Выпакутаваная вера

І вось я застаюся толькі з Небам...

Анэля Тулупава,
"Чайка над Дняпром"

З аднаго боку, трэба падзякаваць за тое, што пра Анэлю Тулупававу памятаюць. Але з другога, як сваякі паэтэсы, яе блізкія людзі, мы не можам не выказаць свайго абурэння колькасцю ў прысвечаным ёй артыкуле ў кнізе "Речица лирическая" (выдавецтва "Сож", Гомель, 2007 год) фактычных памылак і меркаванняў, далёкіх ад творчасці Анэлі Тулупавай.

Калі мы даведаліся пра падрыхтоўку гэтай кнігі, то некалькі разоў прапаноўвалі аўтару артыкулаў, прысвечаных Анэлі Тулупавай і Янку Тулупаву, азнаёміцца з матэрыяламі паэтэсы, з яе перапрацаванымі вершамі і нават аўдыёзапісамі. На жаль, па незразумелых прычынах, ён зрабіць гэта не пажадаў. У выніку — мноства біяграфічных памылак плюс бясконцае жаданне ва ўсёй творчасці пісьменніцы ўбачыць дрымучае язычніцтва.

Мажліва, мяне абвінавацяць у суб'ектыўнасці. У тым, што гэта толькі пункт гледжання аўтара кнігі, а ён мае права на сваё меркаванне. Але ці можна НЕ быць суб'ектыўнай, калі справа тычыцца твайго роднага і любімага чалавека, побач з якім давялося вырасці? Вось чаму я бяруся крытыкаваць гэты артыкул з кнігі "Речица лирическая".

Пачнем з біяграфічных памылак.

Па-першае, Анэля Тулупава была не *дырэктарам,* а *дыктарам* Віцебскага тэлебачання. Спадзяюся, гэта толькі памылка друку.

Па-другое, кнігу «Мой сад», пакуль не выпусцілі ўвогуле. Рукапіс кнігі быў падрыхтаваны да друку самой паэтэсай. Мы з маёй маці пасля смерці Анэлі Тулупавай аднеслі рукапіс у выдавецтва "Мастацкая літаратура", дзе ён ціпер і знаходзіцца. Да гэтага часу спадзяёмся, што аднойчы кніга ўбачыць свет.

Таксама трэба дадаць некалькі слоў адносна датаў напісання вершаў. Напрыклад, аўтар прыводзіць урывак з паэмы "Гарывада" — "Скажыце ўсім", які ніяк не мог быць напісаны ў 1958 годзе. Для таго, каб гэта праверыць, можна хаця б паглядзець у бібліяграфічы слоўнік "Беларускія пісьменнікі" пад рэдакцыяй А. В. Мальдзіса, дзе падаецца, бадай, самы поўны спіс літаратурных твораў Анэлі Тулупавай.

Што да язычніцва, так званага "фальклору".

Цалкам зразумелае жаданне аўтара паўсюль убачыць "родную" тэму. Але гэта, прабачце, не той выпадак.

Мая бабуля была чалавекам глыбока верующым, няхай і неафітам. І веру сваю яна выпакутавала. І перамену ў душы неаднаразова падкрэслівала. Гэта бачна і ў перапрацаваных яе творах, і ў вершах апошніх гадоў жыцця. А вось яе ўласныя словы, што яна сказала ў інтерв'ю Галіне Шаблінскай для перадачы Першага Нацыянальнага канала радыё "Крылы" яшчэ ў 1998 годзе:

"...Я шчаслівая сваімі самымі апошнімі, самымі страшнымі, жахлівымі гадамі, таму што нешта новае расквітнела ў душы. Мне хочацца з усімі падзяліцца. І вось, ведаеце, я насмешліва пра сябе гавару: цяля, як выпусціш на пашу, на зялёную траву, прабачце мяне, задзярэ хвост і носіцца. Я нагадваю менавіта такое цяля, такое неразумнае, якое нешта адкрыла для сябе: вось, пазнала раптам, што ёсць вечнае жыццё, ёсць Божая Маці, да якой можна звярнуцца з малітвай, ёсць Анёл-ахоўнік, ён чуе цябе. І былі такія святыя старцы, жыццё якіх было подзвігам..."

Больш за тое, калі Анэля Тулупава пайшла з жыцця, высветлілася, што яна прыняла таемны пострыг, стала манахіняй. Канечне, аўтар мае права паспрачацца са мной, але пры такіх абставінах тэма язычніцтва, якую аўтар так упарта намагаецца адшукаць ва ўсіх яе творах, становіцца некарэктнай і не актуальнай у дачыненні як да жыцця паэткі, так і да пэўнага перыяду яе творчасці.

Увесь аналіз аўтары артыкула ў кнізе "Речица лирическая" рабілі па старых рэдакцыях вершаў. І духоўнай перамены, якой бабуля так даражыла да апошніх дзён жыцця, ён, на жаль, не заўважыў ці не хацеў заўважаць увогуле і фактычна ўсё перакрэсліў адным гэтым артыкулам.

Чалавек робіць памылкі і выпраўляецца, узлятае і падае. Чалавек змяняецца і зусім іншым прыходзіць да канца свайго жыцця. Бадай, гэтага аўтар і не паказаў. І таму праца выглядае павярхоўна.

У нас, і ў мяне асабіста, пасля чытання артыкула ніякіх светлых пачуццяў не ўзнікла, наадварот, засталося адчуванне, нібы дарагога табе чалавека палілі брудам, сказіўшы тэму, важную для Анэлі Тулупавай і яе творчасці.

(Я таксама хачу заўважыць, што памылка ёсць і ў артыкуле, прысвечаным бацьку Анэлі Тулупавай — Янку Тулупаву).

Напрыканцы, я хацела б дадаць: нам, сваякам Анэлі Тулупавай, думаецца, што гэтая цудоўная кніга, якая магла б стаць найлепшым даведнікам для тых, хто хоча ведаць пра творчых людзей сваёй зямлі, на крайні выпадак — у дачыненні да жыцця і творчасці маёй бабулі...

Валерыя САРОТНІК,
унучка паэтэсы

Дзверы, якія заўсёды адчыненыя

Пружаншчына здаўна вылучалася любоўю да кнігі

Яшчэ ў Сярэднявеччы ў навакольных уладаннях магнатаў Сапегаў — Ружанах і Дзярэчыне існавалі самыя вялікія на той час прыватныя бібліятэкі. Пачатак мясцовага кнігазбору дала ружанская бібліятэка, якая пазней была перанесена ў Дзярэчын, дзе як сцвярджаюць навукоўцы, налічвалася 232 назвы рукапісаў і кніг XV—XVI стст., сярод якіх сустракаліся надзвычайныя бібліяграфічныя каштоўнасці. Увогуле збіранне кніг у тыя часы было сярод знатных і багатых людзей шырока распаўсюджаным.

Хаця сённяшняя Цэнтральная раённая бібліятэка ў Пружанах не можа пахваліцца надзвычай рэдкімі выданнямі, яна нашмат апярэдзіла мясцовых першапраходцаў. Цяпер яна налічвае ў сваіх фондах 57 тысяч разнастайных кніг і дакументаў і з'яўляецца адной з лепшых установ культуры Пружанскага раёна.

І не дзіва, бібліятэка існуе з 1940 года. За нялёгкія ваенныя і пасляваенныя часы, а потым год за годам яе супрацоўнікі старанна і метадычна павялічвалі кніжны фонд, далучалі мясцовых жыхароў да духоўнага свету кніг і ведаў. Сёння мы бачым, што праца людзей, якія прысвяцілі сябе служэнню вечнаму і мудраму храму кнігі, не была дарэмнай. Цяпер раённая бібліятэка — інфармацыйна-выхаваўчы і культурны цэнтр, без якога немагчыма ўявіць сабе горад. У наступным годзе бібліятэка адзначыць сваё 70-годдзе. А летась тут адзначалі 100-годдзе Міколы Засіма, імя якога яна носіць, паэта, родам з Пружаншчыны, вёскі Шані. У бібліятэцы адбылося ўрачыстае свята паэзіі "Быў заўсёды я з народам і ў прыгодах і нягодах...", на будынку бібліятэкі адкрыта мемарыяльная дошка ў гонар знакамітага земляка.

У наш час добрай славай мясцовы храм кнігі абавязаны свайму дырэктару, Наталлі Супруновіч, прафесіяналу высокага класа, якая не толькі кіруе гэтай установай, але і адказвае за дзейсную працу 43 бібліятэк цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы ўсёй Пружаншчыны. Бібліятэка жыве і развіваецца яшчэ і таму, што ў ёй працуюць дасведчаныя людзі, калектыў аднадумцаў, якія не страчваюць апантанасці да сваёй прафесіі, жадання пастаянна ўдасканальвацца ў ёй. І, каб завабіць да сябе зацікаўленых чытачоў, яны разам з дырэктарам шукаюць новыя формы працы з імі. Так, пры бібліятэцы працуюць тры клубы. Гэта літаратурная гасцёўня "Сустрэча", клуб для жанчын сталага ўзросту "Сяброўка" і згуртаванне маладых людзей, у асноўным з агратэхнічнага каледжа, "Вытокі".

Асаблівай гаворкі заслугоўвае літаратурная гасцёўня, пра якую даўно марылі творчыя і ініцыятыўныя людзі горада. Яе дзверы адчыніліся яшчэ ў 1992 годзе, і з тых часоў стваральнікі і госці пераканаліся, што гэта лепшае месца для шчырых і добразычлівых зносін паміж людзьмі мастацтва і культуры. У клубе рэгулярна праходзяць прэзентацыі кніг мясцовых паэтаў і пісьменнікаў, прычым усе яны адбываюцца з удзелам аўтараў. Тут імкнуцца не прапусціць ніводнай літаратурнай навінкі таленавітых землякоў. Гасцёўня прыносіць радасць сустрэч і са сталічнымі творцамі. Яе наведвалі многія сучасныя пісьменнікі. І заўсёды такія сустрэчы выклікаюць цікавасць шырокай аўдыторыі, заўсёды яны выліваюцца ў сапраўднае літаратурнае свята. Як, да прыкладу, прэзентацыя пасмяротнай кнігі прозы М. Купрэева "Палеская элегія". Часта наведваюць гасцёўню не толькі літаратары, але і музыкі, спевакі, творчыя калектывы. Неаднойчы тут выступалі народны хор "Вербніца" Пружанскага палаца культуры, фальклорны ансамбль "Забава", хор Рудніцкай царквы. Адметнымі сталіся вечары раманса і беларускай бардаўскай песні, а на лірычнай вечарыне "Песні мінулых гадоў" спявала ўся зала.

Не забыліся ў бібліятэцы і пра жанчын, асабліва пра тых, каму за сорак і болей. Нягледзячы на ўзрост і жыццёвыя цяжкасці, большасць з іх прагне душэўнай цеплыні і сяброўскіх сустрэч з блізкімі па духу людзьмі. Таму з 2006 года па ініцыятыве Наталлі Канстанцінаўны пачаў сваю дзейнасць жаночы клуб "Сяброўка". І кожная сустрэча ў ім — прыемная падзея для пружанскіх жанчын, гэта іх усмешкі і добры настрой. "Сяброўкі" — вясёлыя і таленавітыя жанчыны, сярод іх людзі самых розных прафесій і інтарэсаў, але на клубныя сустрэчы яны збіраюцца як на свята. Спрыяльная атмасфера, якая пануе ў клубе, калі кожны можа раскрыцца як творца і чалавек, аб'яднала і зблізіла іх. Тэматыка сустрэч самая розная. Прыкладам, сёлета ўзімку тут наладжваліся вячоркі з літаратурна-паэтычнай старонкай пра зіму і з заўсёдным чаяваннем, праводзіліся пазнаваўчыя размовы на тэму здароўя і экалогіі. Міжнароднаму дню моваў была прысвечана вечарына "Вандроўка ў родную мову". У сакавіку — вечар гумару і жартаў, у красавіку — вечар паэзіі, прымеркаваны да 85-годдзя Юлії Друнінай, а ўвосень — свята беларускага фальклору. На сустрэчах у клубе распавядаюць пра лёсы жанчын-суайчыннiц, якія выявілі сябе ў самых розных галінах грамадскага і культурнага жыцця. Арганізуюць сяброўскія сустрэчы таленавітыя бібліятэкары. Так яны дапамагаюць жанчынам пазбавіцца ад адзіноты, знайсці цікавых сяброў, рэалізаваць свае веды, падзяліцца жыццёвым досведам.

Трэці клуб "Вытокі" арганізаваны ў 2003 г. Як было сказана вышэй, удзельнікамі яго з'яўляюцца хлопцы з пружанскага агратэхнічнага каледжа. Супрацоўнікі раённай бібліятэкі апякуюцца яго навучэнцамі з першага курса, і потым на працягу чатырох гадоў займаюцца з імі. Накірунак працы клуба — духоўны. І таму тут адбываецца шмат сустрэч з настаяцелем Рудніцкага храма, айцом Андрэем, які праводзіць сярод навучэнцаў асветніцкую дзейнасць. Святар ведае псіхалогію юнакоў і таму можа закрануць у размове з імі якія заўгодна пытанні, і тут жа атрымлівае шчырыя адказы. Апроч пытанняў на рэлігійныя тэмы і тэмы хрысціянскіх каштоўнасцей, самымі апошнімі тэмамі, якія хвалявалі хлопцаў, былі даверлівыя размовы пра патрыятызм і службу ў войску. Існуе папулярная думка, што хлопцаў-аграрыяў і "тэхнароў", вельмі цяжка далучыць да агульных і вечных пытанняў пра сэнс існавання чалавека. Але практыка працы клуба "Вытокі" гаворыць пра іншае. Хлопцы рады такім сустрэчам, потым яны з захапленнем дзеляцца сваімі ўражаннямі з аднагодкамі, рыхтуюць самыя мудрагелістыя пытанні. Айцец адкрыта радуецца, што хлопцы неабыякавыя да царквы, што іх цікавяць розныя бакі духоўнага развіцця.

Кнігазбор пружанскай шляхты Швыкоўскіх, які месціўся ў іх мясцовай рэзідэнцыі — Пружанскім палацыку, пад канец XIX стагоддзя налічваў ужо 1407 адзінак розных найменняў на польскай, рускай, нямецкай і французскай мовах. Тут разам з забаўляльнымі французскімі раманамі меліся сур'ёзныя навуковыя выданні па агульнай гісторыі і гісторыі Рэчы Паспалітай, рэлігійныя тэксты, карты і атласы розных краін, распрацоўкі па эканоміцы і гаспадарцы, часопісы па садаводстве.

Можна і надалей апісваць стваральную і такую патрэбную для людзей працу раённай бібліятэкі ў Пружанах. Ясна адно, што галоўную сваю мэту — удасканальванне баўлення вольнага часу і павышэнне інтэлектуальнага патэнцыялу яе наведвальнікаў яна выконвае на "ўсе сто". Апроч гэтага, супрацоўнікі бібліятэкі змаглі сабраць і згуртаваць творчую эліту горада, дзякуючы ім, дзверы бібліятэкі заўсёды адчынены ў іншыя сусветы. Сусветы тыя неабсяжныя і шматлікія, але кожны чалавек зможа знайсці там свой, дзе ён адпачне душой і далучыцца да лепшых узораў культуры і мастацтва.

Ірына КЛІМКОВІЧ

На здымку: дырэктар цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы Пружанскага раёна Наталля Супруновіч.

Фота аўтара

За плённую працу на ніве беларускай літаратуры, актыўны ўдзел у дзейнасці грамадскага аб'яднання "Саюз пісьменнікаў Беларусі" Кацярыне Сосне прысвоена званне "Ганаровы член Саюза пісьменнікаў Беларусі".
Кажуць, што пісьменніку не толькі трэба пісаць, але яшчэ абавязкова сустракацца з аўдыторыяй, каб атрымаць далейшы імпульс для творчасці. Такая сустрэча адбылася ў Язненскай сярэдняй школе з самабытнай пісьменніцай з Шаркаўшчыны Кацярынай Сосна.

Ёй любы бераг толькі родны!

К. Сосна — аўтар кніг вершаў і апавяданняў "Імгненні жыцця", "На скрыжаванні лёсу", "Не истраченное...". Друкавалася ў калектыўных зборніках паэзіі "Шаркоўшчынскаму краю", у рэспубліканскіх зборніках "День паэзіі", "Гоман". У намінацыі "Паэзія" за 2008 год атрымала "Бронзавае пяро".

— Можа, вам будзе і дзіўна, — казала яна ў час сустрэчы сваім уважлівым слухачам, — але адукацыю я атрымала ў Беларускай дзяржаўнай сельгасакадэміі. Мой прадзед быў іканапісцам, таму з дзяцінства ў мяне былі здольнасці да малявання. Вось і параілі мне маляваць... схемы і чарцяжы. Вучылася я па спецыяльнасці "інжынер-землеўпарадкавальнік", а паралельна хадзіла на факультэт грамадскіх прафесій, пасля якога стала яшчэ журналістам, фотакарэспандэнтам і мастаком-афарміцелем.

Пасля заканчэння акадэміі яна працавала ў Гродзенскім філіяле інстытута "Белгіпразем", яшчэ сем гадоў — інжынерам-гідратэхнікам у саўгасе на малой радзіме. Менавіта там, на прыродзе, як прызнаецца сёння Кацярына Мар'янаўна, вершы пісаліся асабліва натхнёна. А ў 1983 годзе ёй прапанавалі пасаду загадчыка сельгасаддзела ў раённай газеце "Кліч Радзімы", дзе аўтарка і працавала да нядаўняга часу. Займаючыся журналістыкай, К. Сосна не пакінула пісаць вершы і апавяданні.

Лёс, лічаць, у кожнага свой. І кожны выбірае сваю дарогу ў жыцці. К. Сосна прысвячае вершы і апавяданні роднаму краю і землякам. Яна шмат дзе была за мяжой, ёй прапаноўвалі працу ў Германіі, але яна шчыра прызнаецца, што нашыя людзі больш багатыя духоўна і лепш за Радзімы месца няма.

Малюнкі да сваёй першай кніжкі "Імгненні жыцця" а потым і да зборніка "Не истраченное", Кацярына Мар'янаўна зрабіла сама. А вось зборнік "На скрыжаванні лёсу" праілюстравала малюнкамі дзяцей з Шаркоўшчыны. Аўтарка кажа, што калі малыя падрастуць, ім будзе цікава пабачыць свае малюнкі ў кніжцы. Дарэчы, 18 вершаў К. Сосны ўжо сталі песнямі. Музыку для іх напісалі кампазітары Мікола Яцкоў з Магілёўскай вобласці і Валянціна Шчэнава з Барысава. А яшчэ — малодшы сын Кацярыны Мар'янаўны Валерый, які закончыў універсітэт культуры ў Санкт-Пецярбургу.

У жыцці К. Сосны былі і цяжкія выпрабаванні. Ад хваробы вельмі рана пайшоў з жыцця муж. Але яна выгадавала і сваіх двух сынкоў, і чатырох дзяцей другога мужа, з якім не пабаялася звязаць свой лёс.

— У Лёні памерла жонка, — расказвала Кацярына Мар'янаўна. — Засталіся малыя дзеткі, вось мы і вырашылі быць разам, каб выгадаваць сваіх дзетак, даць ім адукацыю і пуцёўку ў жыццё. Лёня мне ва ўсім дапамагаў, на ім была хатняя гаспадарка. Ён і сёння добры гаспадар і сябар.

...У гэтым годзе выйшаў новы зборнік вершаў К. Сосны "Не истраченное...". Выдадзены ён у горадзе Курску. Спансіраваў выданне яе аднакурснік — генеральны дырэктар Таварыства з абмежаванай адказнасцю "Калужское землеўпарадкавальное праектна-вышуковае прадпрыемства", заслужаны і ганаровы землеўпарадкавальнік Расіі Сяргей Браніслававіч Падаў. А дастаўку 200 асобнікаў з Гомеля арганізаваў зноў жа аднакурснік Аляксандр Новік — намеснік кіраўніка аддзела землеўпарадкавання Гомельскай абласной і геадэзічнай службы. Вось што значыць студэнцкае сяброўства! Дарэчы, у тым жа выдавецтве Курска вось-вось выйдзе яшчэ адзін яе зборнік вершаў "Калінавыя каралі".

І яшчэ адзін цікавы факт. У Лондане ў пачатку лета выйшла 14-палосная газета "Міжнародная асацыяцыі пісьменнікаў-публіцыстаў", 7 палос яе аддадзена творам беларускіх аўтараў. Дык вось, на конкурснай аснове тут змешчаны і творы К. Сосны.

Але вернемся да творчай сустрэчы ў школе, якая праходзіла пад назвай "Паэтычная гасцёўня". Прысутныя зачараванa слухалі сціплы аповед аўтара пра сябе, вершы Кацярыны Мар'янаўны пра харaство, багацце нашага краю, пра тое, што кожны з нас павінен сваім жыццём узбагачаць яго.

У канцы сустрэчы К. Сосна пагутарыла з тымі, хто піша вершы, усім жадаючым падарыла свае кнігі з аўтографам. Добры дзесятак іх набыла мая зямлячка Алена Урбан, якая павязе кнігі ў горад Перм, дзе яна жыве. Алена — вялікая прыхільніца паэзіі К. Сосны, падзякавала ёй за сустрэчу, пажадала далейшых творчых поспехаў.

Тамара ЯЦКЕВІЧ

Падарунак землякам

У Магілёўскай цэнтральнай гарадской бібліятэцы імя К. Маркса адбылася сустрэча з паэтэсай Валянцінай Паліканінай. Яе візіт быў сапраўдным падарункам для жыхароў горада.

Ва ўтульнай зале, на фоне кніжнай выставы пад назвай "Найдите время для любви...", на адным дыханні, пад акампанемент гітарыста А. Барысенкі, вяла літаратурны вечар загадчыца чытальнай залы Алена Кандраценка, якая прадставіла госцю, а таксама прачытала яе вершы. Затым сама аўтар распавяла пра свае літаратурныя зборнікі і прачытала свае вершы, якія кранулі ўсіх прысутных. А інакш і быць не магло, бо вершы В. Паліканінай — гэта цудоўнае зерне жыццёвай мудрасці, кахання, шчырасць жанчыны, якая мае чулую душу. Прагучалі таксама песні на вершы паэтэсы, а адна з іх — "Зорка надзеі" ў выкананні самой паэтэсы разам з Л. Захлеўным.

На вечарыне выступілі магілёўскія паэты Мікалай Емяльянаў, Марына Сліўко, Наталля Кажэўнікава, Рыма Сорына, Алесь Казека, Тамара Аўсяннікава, а таксама старэйшы чытач бібліятэкі Іван Аношкін.

Падарункам ад магіляўчан сталася выкананне салістамі Студыі класічнага вакала любімай песні Валянціны Паліканінай "На тот большак". У сваю чаргу, на добрую памяць пра цёплую сустрэчу з зямлякамі-магілёўцамі паэтэса падаравала шэсць зборнікаў вершаў са сваім аўтографам.

Ірына ЦІНЯКОВА,
галоўны бібліятэкар
Магілёўскай цэнтральнай
гарадской бібліятэкі
імя К. Маркса

Зацугляны шчупак

Не знойдзецца на Беларусі такой ракі або рачулкі, у якіх водзіцца рыба, каб там не сустрэлі рыбака з вудаю. Гэтай цікавай справай з задавальненнем займаюцца дарослыя і дзеці. Яшчэ больш цікавым з'яўляецца паляванне.

У кніжцы "Зацугляны шчупак", што выдадзена РВУ "Літаратура і Мастацтва", якраз і расказваецца пра гэтыя рамантычныя захапленні чалавека. А яшчэ гэта аповед пра здаровы лад жыцця і яго радасці.

Ёсць у Бярэзінскім раёне, што на Міншчыне, вёска Паплавы. Жыве ў ёй Рыгор Канстанцінавіч Ігнаценка, настаўнік музыкі вясковай школы, рыбалоў і паляўнічы, чалавек улюбёны ў свой край і ў сваю маленькую радзіму з яе лясамі, рэкамі і азёрамі. Ён і напісаў кнігу, пра якую я хачу вам расказаць.

Любое падарожжа на паляванне ці рыбалку пачынаецца са збораў. У аўтара кнігі ёсць рыбацкі партфель, збіраць які такая ж прыемная справа, як і сама рыбалка. І тут чытачы праходзяць першапачатковую рыбацкую азбуку, лікбез на тэму, што павінна быць у рыбака са стажам. "У першым аддзеле захоўваюцца шпулькавыя жарліцы з цяжкімі, грамаў на пяцьдзесят, грузіламі. Такую жарліцу закідваеш на сярэдзіну ракі, і яна там ляжыць, не зносіцца плынню. Тры сухія рагулькі для падтрымкі вудаў, бляшанка для чарвякоў, пляшачка з шырокім рыльцам для шыцікаў, апарышаў і ножык. У другім аддзеле ўсялякая драбяза: карабок з рознага памеру кручкамі, блешні спінінгавыя самых розных сістэм і канструкцый, запасныя лёскі, паплаўкі, грузілы. У трэцім — складны кошык для падсадка, садок, брызентавая торба на рыбу. Чацвёрты, апошні аддзел адведзены пад кнігі, якія я нярэдка бяру на раку. Тут заўсёды ляжыць аловак і блакнот, у які я занатоўваю свае назіранні і думкі".

Дзякуючы блакноту і алоўку, мы з вамі маем магчымасць захапляцца прыгодамі і расповедамі аўтара кнігі пра ўдачы і няўдачы на паляванні і рыбалцы, смешныя і кур'ёзныя выпадкі, цікавыя назіранні.

Якое ёмкае слова ёсць у беларускай мове — "зацугляны". Яно звычайна стасуецца са словам конь, але ў дадзеным выпадку зацугляны быў не конь, а шчупак вялізных памераў, славіць якога было б за шчасце любому рыбаку. Папаўся ж ён на снасць аўтару апавядання, але выцягнуць яго не змог: пацягала-такі рыбіна Рыгора па возеры і вывернулася, адкусіўшы трайнік разам з металічным павадком. Але перад тым, як сысці з кручка, вырашыў шчупак паглядзець на таго, хто спакусіўся на яго волю і "...высунуў з вады сваю чорную кашчастую галаву, люта зыркнуў на мяне сваім жоўтым, з капейку, вокам і так адчайна пляснуў шырокім хвастом па вадзе, што мяне ўсяго абдало вадою". Апісанне рыбалкі настолькі зацягвае чытача, што не заўважаеш, як перагорнута апошняя старонка апавядання.

А іх у кнізе шмат. Магнітам вабіць чытача лаканічная, простая і зразумелая проза Рыгора Ігнаценкі. У ёй — замілаванне краявідамі Беларусі, сустрэчамі са звярамі і птушкамі. Разам з аўтарам спасцігаем плёскат вады і шолах лістоты, адчуваем пахі кветак на лузе, для абазначэння якіх часцей за ўсё і слоў не знаходзіцца. А ў яго атрымліваецца данесці да нас харство прыроды роднага краю. У кнізе расказваецца пра паляванне і рыбалку, якія робяцца не дзеля таго, каб прыйсці з трафеямі (спартыўны азарт тым не менш у творах прысутнічае). У кожным абразку далікатны, трапяткі падыход да ўсяго жывога, што акаляе нас.

Захапляе асаблівае стаўленне аўтара да харства, ёмкія мастацкія вобразы, даступнасць пераказу. У адным з апавяданняў лясны казёл не ўцякаў ад сабакі, а пайшоў у наступленне: "пачуўся глухі ўдар і сабака, перакуліўшыся праз галаву, з лямантам пакаціўся пад елачку. Усхапіўшыся на ногі, ён у гарачцы кінуўся наўцёкі, але прабегшы колькі метраў, вярнуўся назад. Толькі казла ўжо не было на месцы... Сабака падбег да пня і злосна загаўкаў на яго. Быццам ён пытаўся ў пня: ты завошта ж мяне лупцануў гэта? Чым я цябе пакрыўдзіў? Але пень маўчаў...". Гэтым гісторыя з казлом не скончылася, падрабязней — у кнізе.

Цікавыя і ўсе іншыя гісторыі.

А сабрана ў гэтай кніжцы Рыгора Ігнаценкі сорак пяць апавяданняў, уключаючы абразкі з "Рыбацкіх світанкаў", героі якіх — шчаслівы заяц, разумны гусак, дзікі, малады яструбок, зацугляны шчупак, жучок і многія іншыя. Выданне прызначана для дзяцей сярэдняга школьнага ўзросту, але будзе цікавым кожнаму, каго вабіць паляванне і рыбалка.

Надзвычай удалыя ілюстрацыі для кнігі зроблены таленавітым кніжным мастаком Валянцінам Макаранкам.

Валянціна СМАНЦАР

«Шчасце, Грышачка, гэта...»

У школе, з сёмага па адзінаццаты класы, у мяне была вельмі добрая, патрабавальная настаўніца па рускай мове і літаратуры. Кожны год на лета Святлана Васільеўна задавала доўгі спіс літаратуры, неабходнай як для духоўнага развіцця, так і для пашырэння кругагляду. Там былі і творы са школьнай праграмы, і творы, што не ўваходзілі ў яе. Апошніх было болей. Вынікам актыўнага летняга чытання быў літаратурны дзённік, у які мы старанна ўпісвалі імя аўтара, назву твора, герояў, а таксама цытаты, што нам запомніліся, нас уразілі. Гэтыя дзённікі я захоўваю і цяпер, часам перачытваю...

Да чаго я гэта распавядаю? Калі б Святлана Васільеўна задала прачытаць кнігу Паўла Ляхновіча "Золата князёўны", то я б наўрад ці дачытала яе да канца. А калі б і дачытала, то ў дзённік выпісала б толькі аўтара ды назву кнігі. Болей — няма чаго. Хаця, каб зусім не пуставаў дзённік, я, мабыць, выпісала б наступныя словы Толіка з апавядання "Чэсьімею": *"Шчасце, Грышачка, гэта перш за ўсё адчуванне ўласнага гонару і годнасці! Толькі той, хто мае гонар і годнасць, заслугоўвае павагу да сябе і толькі ён можа быць шчаслівым"*. Выпісала б — і забылася б. Бо класікі сусветнай літаратуры (Э. Хемінгуэй, М. Шолахаў, Дж. Сэлінджэр, ды нават А. Пушкін (эпіграфам да аповесці "Капітанская дачка" — "Береги честь смолоду!") неаднаразова казалі пра гэта. І не у лоб, а так, што гэта сапраўды запамінаецца. З гэтым веданнем — жывеш.

У другую кнігу П. Ляхновіча "Золата князёўны" (першая — зборнік апавяданняў "Пачатак сезона") увайшлі 9 апавяданняў ды 2 байкі. Ёсць сярод іх і апавяданне "Пачатак сезона". Напэўна, яно пераходзіць са зборніка ў зборнік П. Ляхновіча. Няцяжка здагадацца, што гаворка ў творы ідзе пра паляванне. Аўтар не прымушае нас чакаць, пачынаючы апавяданне словамі "О, паляванне!". П. Ляхновіч наогул не любіць недасказанасці, таямніцаў ды цьмянасці. Усё ў яго творах прасталінейна. Сюжэты немудрагелістыя, падзеі ідуць строга адна за адной (толькі ў апошнім апавяданні "Чэсьімею" аўтар уплятае ў звыклы ход падзей успаміны галоўнага героя Рыгора).

Тэматыка ды праблематыка твораў не надта шырокія: паляванне (прычым, у двух апавяданнях галоўны герой губляе сваіх сабак, якіх зводзіць у першым выпадку алень, у другім — ліса, але неўзабаве гаспадар знаходзіць іх цалюткімі і здаровымі) і праблема сумлення ды маральнага выбару, злачынствы НКВД, вайна і паліцаі, вернасць Радзіме ды справе. Вось, па вялікім рахунку, і ўсё. Нічога новага. Тое ж, што мы чыталі шмат разоў.

У досыць роўным зборніку П. Ляхновіча можна вылучыць хіба што два апавяданні: "Золата князёўны" ды "Апошні нячысцік".

Першы твор — гістарычны. Размова ідзе пра скарб, вярнуць які з палаца, што занялі рускія, папрасіла князёўна Канстанцыя габрэя Міхоля Пупкіна. Ён адмовіўся. Але праз колькі гадоў наняў чалавека Чэся. Ён і дастаў золата князёўны. Пасля прыйшлі немцы, Пупкіна з жонкай расстралялі. Дом габрэя заняў Іван Пякарскі. Скарб князёўны дапамог адшукаць... пацук, які *"увайшоў у сонечны прамакутнік і нешта кінуў"*. "Нечым" аказалася залатая царская манета. Досыць звычайны сюжэт з вельмі прадказальнай канцоўкай. Варта адзначыць мастацкі прыём паўтору, што скарыстоўвае аўтар. Так, паўтараюцца сказы *"Сонца, як сабака, высалапіла язык і цяжка дыхала"* ды *"Палын патыхаў так, што круцілася галава (займала дух)"*. Гэтыя паўторы, якімі распачынаюцца новыя часткі аповесці, новыя (іншыя!) часавыя адрэзкі, паказваюць нам, з аднаго боку, кругазварот жыцця (усё цячэ, усё змяняецца), а з іншага — пэўную зададзенасць падзей і з'яў. Такім чынам, людзі, падзеі змяняюцца, а навакольны свет застаецца нязменным з году ў год (памятаеце Холдэна Колфілда з аповесці "Над бязданню ў жыце" Сэлінджэра і ягонае юнацкае адкрыццё: *"Нічога не змянялася, мяняўся толькі ты сам"?..)*.

Галоўны герой аповесці "Апошні нячысцік" — лясны чалавек Шыхх, надзелены звышнатуральнай здольнасцю: скура яго станавілася такога ж колеру, як дрэва, на якім ён сядзеў, альбо трава, у якой ляжаў... Гэта абараняла яго ад небяспекі, адной з якіх было паляванне. У кіраўніка той дзяржавы, у лясах якой жыў Шыхх, была навязлівая ідэя, быццам на яго палююць тэрарысты. Адным з тэрарыстаў лічылі апошняга лясного чалавека... І вось Шыхх апынаецца акурат перад кіраўніком дзяржавы, што жыве ў пастаянным страху. Кіраўнік нацэльвае на "тэрарыста" браўнінг, але памірае ад сардэчнага прыступу. Што хацеў сказаць чытачу гэтай аповесцю Павел Ляхновіч? Фантазіі на лясного чалавека, надзеленага цікавай асаблівасцю, хапіла, а на развіццё сюжэта — не.

Кніга П. Ляхновіча "Золата князёўны" — з тых, што чытаецца адзін раз (калі наогул дачытваецца) і ставіцца на паліцу. Пасля з яе час ад часу сціраюць пыл.

Ася ПАПЛАЎСКАЯ

Галінка бэзу як сведчанне паэзіі

Што ні кажыце, але прыемна браць у рукі цудоўна аформленую кнігу паэзіі. Аднак радасць не перашкаджае і з'яўленню пэўнай насцярогі. Міжволі выплывае з памяці вядомае: па апратцы сустракаюць, а па... Хоць гэтым разам у мяне падобная насцярога адсутнічала, бо браўся чытаць новы зборнік аўтара, добра вядомага мне. Маю на ўвазе Уладзіміра Шуглю, лепшыя творы якога выклікаюць жаданне не проста чытаць іх, а перачытваць, а то і прамаўляць услых.

Кніга «С полей судьбы не собраны хлеба...» у гэтым сэнсе — не выключэнне. У першым жа вершы «[xxx] Вечереет. В первых звездах небо...» традыцыйныя матывы гучаць па-новаму. Усё тое, пра што гаворыць паэт, не столькі пішацца ім, колькі прамаўляецца. Прапушчанае праз сэрца, яно паўстае своеасаблівым душэўным усплёскам, у якім — замілаванне харастом прыроды, а праз яе і самім жыццём. Пэўная элегічнасць радкоў і ў чытача выклікае аналагічны настрой, а гэта значыць, што пастаўленая мэта дасягнута: прамоўленае і запісанае знайшло належны водгук, а сама сістэма вобразаў, стаўшы адзіным цэлым, ператварылася ў цэласны, зрокава-выразны малюнак:

Вечереет. В первых звездах небо,
Желтый свет
печальных фонарей.
День уходит, гаснет,
будто не был,
В парке все темнее и темней...

Вобразная насычанасць радкоў навідавоку. Але гэта зусім не тая наўмысная ўскладнёнасць, якую можна напаткаць у вершах некаторых аўтараў, што адсутнасць таленту імкнуцца кампенсаваць фармальнымі пошукамі, прагнуць любым способам падацца арыгінальнымі. Тут жа, у Шуглі, пры ўсёй нечаканасці ўспрымання рэчаіснасці, ніводзін вобраз не адарваны ад рэальнасці.

Верш "[xxx] Мне стук в пути колес вагонных..." прывабіў мяне і іншым: уменнем паэта так праўдзіва перадаваць свой настрой, што міжвольна ў лірычным героі заўважаеш і самога сябе. Асабліва тады, калі яшчэ не паспеў сцішыцца боль ад горычы незваротнай страты:

Мне стук в пути колес вагонных,
Как мамы быстрые шаги,
Со мной в порыве устремленной
К огням, что ныне далеки...

Гэтаксама блізка ўспрымаеш верш «[xxx] Я помню детства светлые мгновенья...» Памяць, быццам з нітак, саткана з успамінаў. Не сказаць, каб яны былі надта арыгінальныя, але менавіта гэтай сваёй звычайнасцю і прыцягваюць, бо нішто не прыдумана паэтам, нішто не ўзята ім напавер.

Душа лірычнага героя У. Шуглі — такая ж пяшчотна і адкрытая, як і ў юнацтве, але гэта не значыць, што ён, герой гэты, ужо не адчувае цяжару пражытых гадоў. Наадварот, з прыходам, усведамленнем яго становіцца больш мудрым. Аднак гэтая мудрасць з'яўляецца не сама па сабе, яна набытая цягам часу, а асновы яе закладзены яшчэ тады, калі была мажлівасць браць жыццёвыя ўрокі ў самага блізкага табе чалавека: «Я повзрослел, когда // Мне мама говорила: // «Уйдет жена — беда, // Но это не могила! // Все может в жизни быть, // Но главное на свете // Дал Бог — детей любить, // Ведь дети — это ДЕТИ!».

Памяць перажытага для У. Шуглі — гэта і непаўторныя малюнкі прыроды, як у вершы «[xxx] Белым-бело. Зима!». Канечне, гэта зіма сібірская, якую У. Шугля і памятае з маленства. У той жа час гэта і зіма наша, беларуская. Толькі не цяперашняя, а такая, якой яна была некалькі дзесяцігоддзяў таму. У паэта, як вядома, беларускія карані. Уражанне такое, што інтуітыўна адчуў яе такой, якой памятаем і мы: «Клубится дым из труб, // Уходит в небеса. // Одеты в сотни шуб // Замерзшие леса. // Сверкает в поле снег // В кристаллах на свету. // Затих вдруг ветра бег // И замер на лету...».

Эпіграфам да кнігі «С полей судьбы не собраны хлеба...» У. Шугля ўзяў такія радкі Барыса Пастэрнака: «Во всем мне хочется дойти // До самой сути. // В работе, в поисках пути, // В сердечной смуте. // До сущности протекших дней, // До их причины, // До оснований, до корней, // До сердцевины». Гэтага правіла ён нязменна прытрымліваецца ў паэзіі, у чым і пераконваюць яго лепшыя вершы, напісаныя зусім нядаўна, аб чым і сведчыць раздзел «Новыя стихи (2008—2009 гг.)».

Другую палову гэтай кнігі складае раздзел «Стихи прошлых лет». Гэта ўжо як бы выбранае, зразумела, самае лепшае. А калі лепшае, то не можа не выклікаць зацікаўленасць. Нават не хочацца звяртаць увагу на тое, што часам аўтар не заўважае, як паўтарае сваіх вядомых папярэднікаў. У адным месцы ён без двухкоссяў прыводзіць тое, што ў кожнага наслыху: «У природы нет плохой погоды». У другім — крыху перайначвае не менш вядомае «Душа обязана трудиться»: «Работай, работай, работай — // Не должно душою лениться».

Толькі падобны недагляд яму даруеш, калі трапляеш на тое, ад чаго становіцца светла і ўсцешна. Балазе, такіх вершаў ва У. Шуглі шмат. У садзе ягонай паэзіі заўсёды квітнее бэз.

Алесь МАРЦІНОВІЧ

Храм зямнога кахання наведваюць

Так можна было б назваць водгук на кнігу "У Храме зямнога кахання". І водгук гэты варта напісаць. Хаця б таму, што ўпершыню сустрэўшы гэту кнігу на паліцы сваёй сельскай бібліятэкі, са здзіўленнем адзначыў, што яна карыстаецца нават большай папулярнасцю, чым бульварныя выданні з камерцыйнага аддзела, якія апошнім часам увайшлі ў моду ў чытацкім асяродку. Дык вось, у той Храм штомесяц нехта заходзіць. А гэта – ужо салідны паказчык.

Вырашыў і сам пачытаць. Найперш паспрабаваў зразумець, чым кіраваўся ўкладальнік і прыйшоў да высновы, што арыентаваўся ён на пэўную драматызацыю феномена кахання. Таму і назва кнігі аксюмаранічная: эпітэт "зямное" знаходзіцца ў апазіцыі адразу да двух канцэптаў — "Храм" і "каханне". Вытрымаць абраны прынцып збольшага ўдалося. Прынамсі пачаўшы чытаць кнігу са сваіх улюбёных В. Гардзея і А. Федарэнкі, у абодвух адразу патрапіў на траіх персанажаў, як сёння мовяць, з асаблівасцямі фізіялагічнага развіцця — на кульгавых. Далей была А. Брава. Яна пераказвае чарговую "драму" ў Кубе. І таксама не абыходзіцца без хваробы ног свайго героя. Былі яшчэ аналагічныя прыклады. У матрыцу рамантызму з яго выключнасцямі высокага штылю, такім чынам, тыя вобразы аніяк не ўпісваюцца.

Аднак не трэба думаць, што ў кнізе каханне зямное атаясамляецца з фізіялагічным інтымам. Нярэдка ўсё застаецца ў платанічных межах ("Тадэвуш і Людвіка" Я. Конева). Але ёсць і пасцельныя прыгоды ("Казанова з Амерыкі" А. Ветаха, "Белая кроў" Н. Галыпяровіча). Спектр шырокі. І, як падалося, без асаблівых паўтарэнняў. Кожны аповед адметны і сюжэтам, і характарамі. Калізіі сапраўды вырваныя з жыцця ці як мінімум падгледжаныя. Персанажы — ад школьнікаў да пенсіянераў. А з мастацкай перадачай псіхалогіі аўтары паспяхова спраўляюцца.

Ёсць, аднак, тое, што можа абагульніць усе творы. А менавіта: зямное каханне, паводле кнігі, бадай, не сінанімізуецца са шчасцем. Нават у творах з хэпі-эндам ("Дарога над прорвай" Г. Васілеўскай) пратаганісты маюць незайздросны лёс.

Абсалютная большасць аповедаў вядзецца ў традыцыйным ключы. Хіба толькі "Паэт, у якога ўсе дома" В. Шніпа прэтэндуе на постмадэрнісцкае арыгінальнічанне: у канцы твора выяўляецца, што два пратаганісты з'яўляюцца адной асобай (хоць уважлівы чытач гэта зразумее з першых старонак), да таго ж сам твор заканчваецца сваім пачаткам. Кампазіцыя і мастацкая гульня з вобразамі герояў — мусіць, і ўсё, што мне прыйшлося даспадобы.

Творы кнігі ў чарговы раз прымушаюць задумацца, чаму найлепшае мастацтва ўдаецца менавіта пры рэтрансляцыі вострых нервовых перажыванняў. Цяжка згадаць адразу шэдэўрэальны твор пра каханне ўзаемнае і шчаслівае. У сувязі з гэтым чамусьці ўспомніўся Арыстоцель: "Мастацтва завяршае тое, што не ў стане завяршыць прырода. Мастак дае нам магчымасць пазнаць мэты прыроды, якія не ажыццявіліся". Такім чынам, творы пра няшчаснае каханне можна разглядаць і праз прызму своеасаблівай сублімацыі: каб для рэчаіснасці пакінуць больш станоўчых эмоцый, адмоўныя аддаюць паперы.

Перавага аўтараў-мужчын абумовіла перавагу мужчынацэнтрычнасці ў аповедах (В. Кадзетава нават піша ад першай асобы мужчынскага полу). Зрэшты і нядзіўна, бо каханне — феномен мужчынскага паходжання. Пачуцці кахання ў жанчын відавочна адрозныя ад мужчынскіх. І толькі па нейкай недарэчнай памылцы, збегу акалічнасцей яны называюцца адным і тым жа словам. Але гэта — тэма для іншага водгуку.

Анатоль ТРАФІМЧЫК

Урокі харaства

Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва" апошнім часам ажыццяўляе шэраг цікавых кніжных праектаў. Адзін з самых значных — безумоўна, той, які дапамагае школьнікам праз мастацкую літаратуру лепей адчуць харaство беларускай прыроды, лішні раз пераканацца, наколькі ў свеце ўсё ўзаемазвязана і калі парвецца нейкі, няхай самы маленькі ланцужок у гэтай повязі, то пастаянства і гармонія знікнуць, а чалавецтва могуць чакаць самыя непрадсказальныя наступствы. Пры тым дасягаецца падобнае навучанне, а калі глядзець шырэй, то выхаванне хлопчыкаў і дзяўчынак праз творы розных жанраў.

У гэтым упэўнілі такія выданні, як "Чырвоная кніга для дзяцей" (2003) і "Чырвоная кніга ў казках і вершах" (2007), укладальнікам якіх з'яўляецца Раіса Баравікова, а таксама "Лясная кніга ў творах беларускіх пісьменнікаў" (2008), да падрыхтоўкі якой спрычыніўся Алесь Бадак. Нядаўна ў гэтай своеасаблівай бібліятэчцы прыроды пабачыў свет чарговы зборнік — "Блакітная кніга ў творах беларускіх пісьменнікаў".

Падрыхтоўка яго невыпадкова была даручана Алене Масла. Алена сама з маладзейшага пакалення беларускіх літаратараў, якія свае творы адрасуюць дзецям, паспела зарэкамендаваць сябе аўтарам некалькіх арыгінальных кніг дзіцячых казак. Відавочна, што А. Масла тонка адчувае псіхалогію сённяшніх хлопчыкаў і дзяўчынак, добра ведае іхнія запатрабаванні. То, як кажуць, ёй і карты ў рукі.

Сапраўды, кніга атрымалася такой, што і пагартаць яе прыемна (выканана на высокім паліграфічным узроўні, мастак Тамара Шэлест), а калі пачнеш чытаць, то не адарвацца. Здавалася б, сам, як чалавек дарослы, шмат з таго, пра што расказваецца, няблага ведаеш ды разумееш, але яшчэ раз пачуць пра гэта ніколькі не лішне. А што ўжо казаць пра школьнікаў, якія ў наш камп'ютэрны час не заўсёды і на прыроду могуць выбраца, а тут, калі ласка, свайго роду запрашэнне у адведзіны да яе.

У якасці запрашальнага білета ўзяты верш Віктара Гардзея "Незабудкі азёр", які і адкрывае кнігу:

Крычаць патрывожана гусі
У мройны азёрны разліў.
А карта маёй Беларусі —
Як луг, што блакітна зацвіў.

Запеў пастушковае дудкі
Ля плёсаў яшчэ не замёр.
І росна цвітуць незабудкі
Маіх беларускіх азёр.

Так і хочацца хутчэй сесці ў гэтую лодку. Тым больш, што на вёслах яе тыя, хто добра ведае сваю справу.

На старонках "Блакітнай кнігі..." казка адчувае сябе надзіва ўпэўнена, бо ў якім яшчэ жанры, як ні ў гэтым, можна даць багатую свабоду фантазіі. Ды, не будзем забываць — няма мяжы магчымага. Асабліва калі за пяро бяруцца аўтары, якія разумеючы невычэрпныя мажлівасці гэтага жанру, ствараюць непаўторныя сюжэты, а таксама тыя, хто асэнсоўвае, скажам, легенды, што бытуюць у народзе.

Што гэта сапраўды так, упэўніваюць творы Раісы Баравіковай, Людмілы Рублеўскай, Васіля Шырко, Генадзя Аўласенкі, Анатоля Бутэвіча, Уладзіміра Ліпскага, Алеся Бадака, Кацярыны Хадасевіч-Лісавой і іншых.

Асабліва прыемнае ўражанне пакідаюць казкі самой А. Масла "Споведзь мёртвай ракі" і "Крыўды старога Вадзяніка", якія, па сутнасці, ўзаемадапаўняюць адна адну. Напісаныя дасціпна, захапляльна, яны ўздымаюць тэму зберажэння ўсяго жывога на зямлі, у тым ліку нашых рэк і азёр. Услухоўваешся ў споведзь усохлай ракі, і быццам чуеш у яе споведзі заклапчаны голас самога аўтара: "Хто сказаў вам, што за грошы можна купіць чысціню? За грошы нічога вартае не купляецца: ні сумленне, ні сяброўства, ні каханне, ні вера. За грошы ўсё гэта толькі прадаецца. І чыстая вада — таксама. Нават не вада, а кавалачак бяспекі на вашай кухні, калі справіў сёй-той з вас дарагія ачышчальныя сістэмы".

Такія кнігі, як "Блакітная...", не могуць быць незапатрабанымі, бо яны даюць тым, хто знаёміцца з імі, сапраўдныя ўрокі любові да прыроды, прывучаюць дзяцей ашчадна ставіцца да ўсяго жывога да зямлі. Несумненна, што яна можа стаць і добрым дапаможнікам для настаўнікаў у іх пазакласнай рабоце.

Калі загортваеш яе апошнюю старонку, то міжволі зноў вяртаешся да верша В. Гардзея "Незабудкі азёр". Пасля прачытання кнігі ён набывае яшчэ больш значны сэнс. Дзякуючы гэтаму выданню, вобразна кажучы, лодка любові ўпэўнена плыве па хвалях жыцця, з задавальнннем запрашаючы ўсіх, хто небыякавы да прыроды, любіць яе і беражэ.

Алесь ВІШНЕЎСКІ

Помнік Аляксею Пысіну

Адметнай з'явай у айчынным літаратуразнаўстве, несумненна, стане манаграфія Таццяны Хоміч "Мастацкая канцэпцыя чалавека і свету ў лірыцы Аляксея Пысіна". На аснове твораў паэта, літаратурна-крытычных артыкулаў, архіўных матэрыялаў і ўспамінаў аўтар ўсебакова даследуе эстэтычныя ідэалы ў паэзіі Аляксея Пысіна, а таксама звяртае ўвагу на маладаследаваныя ў беларускім літаратуразнаўстве матывы яго паэзіі.

Аляксей Пысін сваімі творамі 1960 —1970 гг. вынайшаў індывідуальна-аўтарскую мадэль светабудовы, якая грунтуецца на ідэі гарманічнага суіснавання прыродных, матэрыяльных, маральна-духоўных праяў быцця. Сярод элементаў духоўнай культуры ключавое месца займае дабро. Паэт, які бачыць зло ў свеце ў вялікіх маштабах, здолеў выявіць аптымістычны погляд на свет, верыць у неперамажнасць дабра: "дабра больш сеецца, чым зла".

Вобраз вайны ў паэзіі А. Пысіна ўзнаўляецца ў рэальным і рэтраспектыўным планах. Даследчык асаблівую ўвагу ўдзяліла аналізу вершаў-успамінаў і элегічных і партрэтных балад, многія з якіх "сапраўды можна ставіць у адзін шэраг з экзістэнцыйнай прозай В. Быкава..." Творы паэта можна параўноўваць з лепшымі ўзорамі ваенных вершаў 1940-х (А. Куляшова, П. Панчанкі, М. Танка, П. Броўкі, М. Сурначова), і разам з тым відавочна, што балады А. Пысіна — гэта ўсё ж больш глыбокі, асэнсаваны з дыстанцый часу погляд на трагедыю вайны.

Ідэя несмяротнасці ў творах А. Пысіна звязана з верай у справядлівае вяртанне імёнаў і дасягненняў заўчасна памерлых. Мінулае, цяперашняе і будучае ўспрымаюцца паэтам як адзінства, а жыццё чалавецтва асэнсоўваецца ў мастацкім свеце А. Пысіна як адзіны непарыўны працэс. Ён быў перакананы, што "мінулае належыць нам так, як і будучыня" і гэтую сувязь часоў адметна адлюстраваў вершамі ў тэме пераемнасці пакаленняў. У паэта гэта тэма "набыла глыбокі філасофскі падтэкст, загучала ярка, самабытна, як, бадай, ні ў кога з беларускіх паэтаў".

Кніга Таццяны Хоміч — гэта літаратуразнаўчы помнік паэту Аляксею Пысіну. Даследчыца здзейсніла паездкі па пысінскіх мясцінах, гутарыла з роднымі паэта, з людзьмі, якія блізка ведалі яго і прычасціліся яго паэзіяй. Са старонак кнігі паўстае партрэт Аляксея Пысіна — асобы, вялікага паэта Беларусі.

Манаграфія зацікавіць і будзе карыснай выкладчыкам ВНУ, настаўнікам беларускай мовы і літаратуры, студэнтам-філолагам, а таксама чытачам, якія зацікаўлены ў паглыбленым вывучэнні паэтычнай спадчыны А. Пысіна.

Віктар АРЦЕМ'ЕЎ

Натхнілі дарогі

Дарога, сцяжына, пуцявіна, гасцінец — бадай, самыя распаўсюджаныя і невычэрпныя паэтычныя вобразы. Дэкан архітэктурнага факультэта БНТУ, доктар архітэктуры, прафесар Армэн Сардараў ужо больш як 40 гадоў вывучае шляхі зусім не метафарычныя.

У 1974 годзе ён адзін з першых ў СССР абараніў дысертацыю па тэорыі архітэктуры дарог. Армэн Сардараў з'яўляецца аўтарам многіх праектаў у транспартнай галіне — да прыкладу, такіх, як МКАД, бульвар на вуліцы Леніна ў Мінску, "Нулявы кіламетр" ды іншых. Сёлета выйшла новая кніга вядомага архітэктара пад назвай "Путетворение". У гэтым выданні, як і ў многіх папярэдніх яго працах, летапіс транспартных шляхоў багата аздоблены паэтычна-філасофскімі развагамі.

Крок за крокам аўтар дэманструе чытачу эвалюцыю беларускіх дарог — ад "шляха з варагаў у грэкі" да сучасных аўтамагістраляў. Паштовыя станцыі, прыдарожныя алеі, каплічкі і традыцыйныя крыжы на ўзбочыне, старадаўнія корчмы, што сустракалі падарожнікаў, валуны з пазнакамі адлегласці, масты, чыгунка і нават народныя прыкметы і павер'і, звязаныя са шляхам, — усё гэта адлюстравана ў кнізе як частка нашай дарожнай гісторыі. Увасабленню гэтай тэмы ў літаратуры і фальклоры прысвечаны адзін з раздзелаў, які пераконвае, што "дарога — самая яркая тэма ў беларускай паэзіі".

На прэзентацыі кнігі яе аўтар распавёў: "Беларусь — дарожная дзяржава, пра гэта кажуць многія дакументы: і статуты ВКЛ, і "Устава на валокі", у якіх ёсць артыкулы, прысвечаныя арганізацыі дарожнага руху, габарытам дарог, праблемам спагнання падаткаў за праезд, бо дарогі заўсёды мелі вялікае эканамічнае значэнне. Нават экалагічныя пытанні агаворваліся — кшталту таго, што нельга труціць ля дарог збожжа. І калі мы дбаем пра развіццё сучасных транспартных шляхоў, трэба звярнуць увагу і на мінулае, на нашу культуру і гісторыю".

У кнізе выкарыстаныя старажытныя карты, а таксама маляўнічыя фотапейзажы, зробленыя самім аўтарам, які, па яго асабістым прызнанні, з'яўляецца зацятым аўтамабілістам, таму і прысвяціў кнігу ўсім аматарам аўтавандровак.

Саша ДОРСКАЯ



Алег САЛТУК

Печка

Уздыхнула печка цягаю —
Комін выдыхнуў дымок,
Што пайшоў гуляць бадзягаю,
Нібы хворы, з боку ў бок.

Перахоплены туманамі,
З пахам высмяглых катлоў,
Над азяблымі палянамі
Вышыню сваю знайшоў.

Туманы — яны вяртаюцца,
Не вяртаюцца дымы,
І па свеце разлятаюцца,
І губляюцца, як мы,

Да крывінкі ссірацелыя —
Ажно хочацца завыць!..
Печ, без коміна збялелая,
Ў садзе прывідам стаіць.

Сустрэча

Ты ў сваіх вачах прывезла мора
І мядовы на плячах загар.
Я там быў, здаецца, яшчэ ўчора,
Дзе паўднёвы вецер лашчыў твар.

Уставала хваля пакрыёма
І сінела чорная вада.
Сустракаў мяне, нібы знаёмы,
За вякі ссівелы Мітрыдат.

Разам там хварэў з Аджымушкаем,
Які мсціўцам колісь пеклам стаў...
Сёння мы з табой успамінаем
Гэта ўсё сярод ушацкіх траў.

Возера сваё нас прывячае,
А над ім сузор'яў не злічыць...
Побач з нашай беларускай чайкай
Чайка чарнаморская крычыць.

Пра песню

У песні таемнасці болей не стала —
Эстрада папсовая ўсю пахавала,
Нахабна загрукала ў нашыя дзверы
Калянай, нібыта з марозу, фанерай...
Ды чуецца мне, дзіваку, і ўсё сніцца
Жураўка ў нябёсах, у садзе сініца.
Я бачу, як ружаньку дзеўчына поле,
Як нівай хвалюецца полейка-поле,
Як слёзна Праскоўя салдата чакае,
Як Волга здалёку цячэ, не ўсыхае,
Як воблакі ходзяць
над нашай граніцай,
І гарманіста, якому не спіцца...

Лета

Сэрца ўстрапянецца і замрэ
Перад разняволеным блакітам.
На кашулю драч яго дзярэ,
Перапёлкі клічуць спаць у жыта.

А блакіт рассыпаны паўсюль
Без пачатку, без канца, без краю.
Дзе ён нарадзіўся і адкуль
Хваляю бясконцай наплывае?

У жаночых ён цвіце вачах,
На мяжы ў валошках задуменных,
Туманком ляжыць на паплавах,
Плавае ў прысадах загумення.

З крыл яго страсаюць жаўрукі,
У сябе ўбіраюць прагна росы.
А нябёсы ў дзве свае рукі
Яго сыплюць
і не кажуць — досыць.

Прызнанне

Сваёй зямлі я не аддаў бы пядзі,
Як давялося б за яе стаяць...
На маладым, ружовым даляглядзе,
Бы парашуты, воблачкі вісяць.

Адно — імклівае блакітна-белае,
Вось-вось, здаецца, сядзе на зямлю...
Радзімы край, цябе душой і целам
Увесь свой век без памяці люблю.

Я сню твае сунічныя палянкі,
Зялёны клён, няўрымслівы ручаёк.
Мяне твой водар палынова-горкі
Ахутвае і зблізку, і здалёк.

Стаю пад раздарожыстай сасною,
За аблачынкай думкамі бягу...
Усё люблю з вясёлаю тугою
І разлюбіць ніколі не змагу.

На Нарачы

Бог сонца — ясны Ра,
Куды мне дзецца нанач?..
Ля зор з твайго кастра
Пусці пагрэцца, Нарач.

Ты — з вечнасці нямой
І з раніцы раёўнай,
Прымі і супакой,
Азёр усіх князёўна.

Абмыюся вадой
Святой тваёй з дарогі,
Агонь прымрою той,
Які натхняў тут многіх.

Сувой і мар, і хмар.
Славянка ты, этруска?
Егіпецкі загар
На соснах беларускіх.

Спамінанне

З аднавяскоўцамі сваімі
Сустрэўся я на Духаў дзень
Там, дзе над соснамі старымі
Лунаў маёй матулі цень.

І многіх цені там луналі
Знаёмцаў, блізкіх, сваякоў.
Крыжы, як рэкруты, стаялі,
Што павярталіся дамоў.

Віна прывусніў невясёла
У хаце добрае сястры.
О, колькі многа навасёлаў
Прыйшло ў Лабейкі з той пары,

Калі тут бесклапотна бегаў,
Сніў журавоў, сініц лавіў,
Дзе ўсё было мне абярэгам,
Каб толькі жыў, а не тужыў.

Шлях незваротны, непаўторны...
Я мамін крыж пацалаваў.
І мой анёл, святы і горны
Ў душы ад роспачы стагнаў.

Табе

Закрываючы грудзі рукой,
Ты спалохана-нечакана
Асвятліла сабой пакой,
Як зара асвятляе ранак.

І святло ад цябе расло,
У вянок запляталіся промні.
Гэта ўсё яшчэ не прайшло,
Гэта толькі патрэбна ўспомніць.

Прыгадаць таямнічую ціш
І на вуснах гарачыя словы,
І бяздонне, ў якое ляціш
Апантана і стрымгалова.

Мы ляцелі, луналі, плылі
У блакітнае і залатое.
І на ўсёй неабдымнай зямлі
Нас было толькі двое з табою.

Поўня дзьмулася з-за ствала
Нашай яблыні райскай...
Ты прыснілася ці была,
Не адкажаш, як не старайся.

Ігар КАНАНОВІЧ

Зноў

Пачынаецца верш ізноў.
І натхнення — ліхая сіла.
А я думаў — астыла кроў,
Меркаваў, што капец магілы
Змацаваў забыцця дзірван
У Памерлых Паэтаў парку,
Але верш, мой адвечны Пан,
Уваскрос. І паслаў па аркуш.

Ненавідзеў. Любіў. Згарэў.
Цяжкі попел сабрала урна.
Памянуў, але зноў, пся крэў,
Кроў аркестрам гучыць бравурна!..

Нечакана жартуе Бог,
Хоць і вельмі шаную гумар,
Значыць, нешта ў сабе збярог,
Каб ізноў зацвіла лагуна,
Дзе напалмам кіпеў пажар,
Дзе сплываўся пясок у крэмень...
"Ты ў сабе затрымаў удар —
Дык жыві і далей, змагар, —
шэпча думка. —
Ступай у стрэмя.
Хай ляціць над табой Пегас
На дабро і на радасць людзям!
Без гадзінніка бачыш: час —
Як звычайна — з нуля. І — будзе..."

Лекі (верш у прозе)

Ляжу без прытомнасці на хірургічным стале. Два спецыялісты дабрачыннага ляза стаяць нада мной і вырашаюць:
— Калі выплыве — вылечым таблеткамі. А цяпер — няхай не памірае, калі зможа...
— Сапраўды, калега, умешвацца не варта — яшчэ адной аперацыі арганізм не вытрымае...
Цемра.
Загараецца белым экран, і маладая сімпатычная медсястрычка настойліва прапануе мне цыліндрык лекаў:
— З'ешце, калі ласка!
Вам прапісаны курс каханняіну...
Непаслухмянымі вуснамі прымаю збавенне...

Пасля эпілогаў

Нянавісць абвастрала пачуццё.
І жыў, відаць, таму, што ненавідзеў.
Свой крохкі лёс пускаў на самацёк,
Каб толькі адказаць
радкамі крыўдзе.

Бо верыў: слова знойдзе вас — людзей, —
Калі і сам даўно сыду з арэны.
Бо верыў, што пакінуты бядзе,
Загіну. І хацеў, каб недарэмна.

Цяпер жыву: працую і люблю,
Кахаю і шукаю, весялюся,
Удзячнасць і віну ў душы спялю,
Часцей — на пазітыве,
менш — у скрусе.
Салдат памёр, застаўся чалавек
Сядзець, рабіць мінулага ўрокі,
Бо новую галінку прыжыве
Мой радавод

Фота Кастуся Дробава

Праз колькі год.
І сына ці дачку у шлях далёкі
Патрэбна выпраўляць: вучыць ісці
Наўпрост і ў абыход,
мячом і крыжам.
Каб ведалі заўжды: узяў — плаці.
Так, позна зразумеў,
і ўсё-ткі выжыў...

Нянавісць азарала смутны час
Маланкамі, узвівамі пажару.
...Пільную Зніч цяпер, каб ён не згас,
Каб ноч ліхая не кранула мару.

Любай

Не любАя — лЮбая: зважай...
Вер, мая маленькая жанчына.
Без цябе пустое месца — рай,
А з табой і ў пекле адпачынак.

Без цябе — цынічны гэты свет
(Ён і так бязлітасны, канешне).
Я кахаю моцна — не сакрэт.
Тым і ўратаваны, хоць і грэшны.
Без цябе — халодны, колкі стог,
Без цябе — з усіх вачэй праклёны,
Без цябе нашмат слабейшы Бог,
А з табой я сам —
прарок натхнёны.

Не любАя. лЮбая. Але!
Толькі так —
пяшчотна і прыгожа!
Адагрэй —
я, штосьці, укалеў.
Печ? Кілішак?
Ай, не дапаможа!

Увайшла, танцуючы, у лёс,
Расстраляла смелымі вачамі.
Не прыліп, здаецца, а прырос —
Нервамі, сасудамі, радкамі...

Вядзьмак *(абразок)*

Смачна, гулка, азваўся гром
І ад хмар грамады вялікай
Адпушчэнне прыйшло —
дажджом.
Гэта я навальніцу клікаў.

Гэта я варажыў на ноч,
Бо смылела ліхая рана.
І ў агідны чакання корч
Перунамі цаляе ранак.
Я не ведаю, дзе яшчэ
Паратунку шукаць. У храме?
Не. На лікі не ўзняць вачэй —
Грэх смяротны заплыў гадамі...

Клічу духаў зямлі сваёй
Кожны раз, як бязвер'е дойме.
Цар вужыны паўзе ў пакой.
Шэпт і шоргат паўсюль у доме...

Людзі ведаюць,
што вядзьмак,
Што нялюдскую сілу маю,
Але йдуць на парог, аднак,
Хоць не іхняй нуды чакаю...

* * *

Халуі забівалі. Жыву.
Стаўлю коску —
шукаю працягу...
Тлум пакінуў маю галаву,
І рыторыкі спрытная шпага
Хоча ў танец пусціцца: ангард!
Хто хацеў падначаліць гасконца?
Паспрабуйце —
праверым ваш гарт —
Выпаўзайце пад дзённае сонца!..

Памятаць, кім трэба стаць

Валерый ГАПЕЕЎ

Старонкі з аповесці

Менавіта з адзінаццатага, традыцыйна берасцейскага нумара, рэдакцыя часопіса "Маладосць" распачынае акцыю ўсеагульнага чытання і запрашае ўсіх сваіх патэнцыяльных чытачоў падключыцца да яе. На абмеркаванне, якое можа стацца гарачымдыспутам, выносіцца аповесць Валерыя Гапеева «Першы боль, або Доказ закона прыгажосці». Пра тое, што ў аповесці можа быць неадназначнае прачытанне, ужо гаворыць урывак з яе, які рэдакцыя прапануе «ЛіМу».

...Тры тыдні без маці цягнуліся доўга. Потым адбылося тое, на што Кацярына ніяк не магла разлічваць. Маці вярнулася з Сяргеем Віктаравічам, і праз два дні яны распісаліся ў ЗАГСе. У іх кватэры наладзілі вячэру — і колькі было вясёлых і добразычлівых гасцей у іх хаце! Як даўно ў іх не было столькі музыкі, вясёлага гоману і вэрхалу!

А назаўтра, пасля такога вось хатняга вяселля, маці паклікала яе на кухню. Там быў і Сяргей Віктаравіч, узрушаны (такім яго Кацярына яшчэ і не бачыла), хваляваўся крыху, калі звярнуўся да яе:

— Кацярына, тут такая справа... ты ж пазнаёмілася з маёй маці?

— Вядома, — кіўнула Кацярына.

Маці Сяргея Віктаравіча яна пабачыла на вячэры: сціплая сухенькая жанчына амаль увесь вечар прасядзела ў куточку пакоя, слухаючы вясельны шум і пазіраючы слязлівымі вачыма на гасцей. Больш за ўсё — на свайго сына і цяпер ужо на яго жонку, на маці Кацярыны.

— Дык вось, такая справа, — зноў пачаў Сяргей Віктаравіч. — Я цябе прашу зразумець правільна маю... нашу прапанову. Мама ў мяне вельмі добры чалавек. Яна слабая і старая, ёй цяжка жыць адной. Вядома, я буду заходзіць калі трэба... Ат, не тое кажу... Мама сама прапанавала нам, ды і, што тут хаваць, мы таксама... думалі пра гэта. У мяне ж двухпакаёвая кватэра... То... ты магла б жыць у адным пакоі...

Сяргей Віктаравіч змоўк, пэўна ж чакаючы адказу, але Кацярына маўчала, разгубленая такой перспектывай. Яе гоняць з роднай кватэры? Ці ёй даюць адной цэлы пакой у іншай кватэры, дзе не будзе штодзённай мітусні, дзе яна будзе сама сабе гаспадыняй?

— Кацюха, ты зразумей, мы цябе не гонім, — асцярожна пачала казаць маці. — Мне цяпер не трэба на дзвюх работах сядзець, я сама тут з усім спраўлюся. А ты ўжо дарослая, выпускны клас, табе пакой асобны трэба, а не на гэтай кухні ўрокі рабіць. А Ганна Міхайлаўна жанчына вельмі добрая, яна сама вельмі хоча, каб ты жыла з ёй...

Так у жыцці Кацярыны раптоўна ўсё змянілася. Праз тыдзень яна стала гаспадыняй вялікага, светлага пакоя, дзе для яе ўжо стаяла новая мэбля: шырокая тахта, вялікая шафа для адзення, шафа для кніг, новы пісьмовы стол. У першы вечар ёй было вельмі вусцішна тут, яна ніяк не магла паверыць у тое, што гэты пакой цяпер — яе. Яе ніяк не пакідала адчуванне таго, што яна тут часова, што вось прыйдзе вечар — і яна зноў будзе ў сваёй звыклай тлумнай кватэры. Але надышоў вечар, і гаспадыня, Ганна Міхайлаўна, ціхенька пастукаўшы ў дзверы (вось нечаканасць для Кацярыны), запрасіла яе на кухню — піць чай. Старэнькая жанчына вінавацілася, што не спытала адразу, якую гарбату любіць піць Кацярына — яна згатавала зялёную. Кацярына разгублена адказала, што не задумвалася раней пра гэта: абы былі гарбата ды цукар.

— О, гэта няправільна, — мякка паўшчувала яе Ганна Міхайлаўна. — Правільна выбраная гарбата, правільна згатаваная — гэта і настрой, і здароўе, і прыгажосць.

Пакуль яна разлівала напой у кубкі, раскладвала самаробнае пячэнне па сподачках, няспешна расказвала пра гарбату: як гатаваць, як піць...

А потым, бачачы скаванасць Кацярыны, пачала распытваць яе, старанна выбіраючы пытанні, тактоўна і нязмушана. Так пыталася, што адказваць хацелася... Крыху ніякавеючы, Кацярына адказвала састарэлай жанчыне. Праз колькі хвілін ніякаватасць знікла: Ганна Міхайлаўна слухала яе ўважліва, распытвала са шчырай цікавасцю. І вочы яе пазіралі на дзяўчыну з лагодай. Размова за сталом зацягнулася, чай даўно быў выпіты, а яны сядзелі на кухні — дзяўчына і старая жанчына, — быццам дзве сяброўкі, і гаманілі. Каця асмялела, сама распытвала старую аб яе жыцці, аб маладосці. Неяк незаўважна перайшлі на тэму адносін між хлопцамі і дзяўчатамі. Вочы Ганны Міхайлаўны раз-пораз гарэзліва ўспыхвалі, калі яна дзялілася ўспамінамі са сваёй маладосці. А Кацярына глядзела на яе, ссівелую, сухенькую, і ніяк не верылася, што яна была некалі такая ж маладая, прыгожая...

А потым у дзверы пазванілі — Сяргей Віктаравіч не стаў карыстацца сваім ключом. Ён занёс у кватэру, а потым у пакой Кацярыны вялікія каробкі. Праз дваццаць хвілін камп'ютэр быў сабраны: новенькі, бліскучы, з вялікім плоскім экранам.

— Гэта табе, Кацярына, каб не было часу сумаваць, — трохі ніякавата патлумачыў Сяргей Віктаравіч. — Прымі як падарунак. Я ведаю, сёння старшакласніку без яго не абысціся. Заўтра пад'едуць з сервіснага цэнтра, падключаць да Інтэрнету. Вось... карыстайся...

У гэтую ноч Кацярына ніяк не магла заснуць. За нейкі тыдзень яе жыццё перавярнулася: яшчэ колькі дзён таму бедная папялушка і вось цяпер, лічы, прынцэса.

Здаецца, усё было так добра, так нечакана добра — толькі радуйся. Але разам з радасцю вярэдзіла душу трывога. Як гэта: ні за што, задарма і адразу — гэтулькі шчасця і ёй, і маці, і сястры з братам. Хаця чаму задарма? Хіба не выпакутавалі яны сваё шчасце? Хіба 10 гадоў у школе Кацярына не была брыдкім качанём? І вось — лебедзь...

Прычына трывогі была глыбей і значней.

Усё сваё жыццё пасля смерці бацькі Кацярына разлічвала толькі на сябе і маці. Яна ведала, што яе заўтрашні дзень залежыць амаль цалкам толькі ад яе. Гэта было звыклым і зразумелым. І будучыню сваю Кацярына будавала, зыходзячы толькі са сваіх магчымасцей, свайго жадання. Цяпер жа раптоўна, за нейкіх тры тыдні ў яе жыцці адбылося столькі змен, жыццё стала зусім іншым, ніяк не падобным на тое, ранейшае — і Кацярына не мела да гэтых змен ніякага дачынення. Вось гэта хвалявала, вось гэта трывожыла. Так, безумоўна, змены добрыя, але ж калі яна не магла на іх паўплываць, то як прыйдзе нейкая навала, то таксама можа скласціся так, што Кацярына нібыта будзе стаяць убаку...

Яна нечакана для сябе, праз унутранае супраціўленне ўсё ж прызнала: жыццё яе залежыць ад іншых людзей куды больш, чым раней яна ўяўляла. І заснула, калі цалкам усвядоміла гэтую новую для сябе ісціну. Супакоілася. Бо ведаць — значыць быць гатовым...»

* * *

Ісці на высокіх абцасах не тое што нязручна — незвычайна. Кожны крок — вывераны. Ты ідзеш і падсвядома трымаеш у думках гэты працэс хадзьбы: правая нага, левая нага. Рэдка Кацярына абувала туфлі на высокім абцасе, хіба што на які вечар. А цяпер — яна абула іх проста на заняткі. У іх не пабяжыш, не заспяшаешся. І бегчы не хацелася — хацелася ісці вось так, пільна сочачы за кожным сваім крокам, адчуваючы сваю выключнасць і важкасць сярод цэлага натоўпу. На яе паглядвалі з цікавасцю, а ёй было прыемна адзначаць гэтыя погляды. Вось ля святлафора (праз дарогу — школа) прыпынілася, і нейкія малыя, пазіраючы цішком на яе, зашапталіся. Яна выразна пачула: «Кажу табе — новенькая...». Зразумела — яе прынялі за новую, маладую настаўніцу... З-за абцасаў. І яшчэ з-за касцюма. Касцюм — спаднічка, пінжачок і блузка — то не на свята, то на кожны дзень, Кацярына так вырашыла. Валасы не сабраны ззаду ў звычны хвост, а вольна раскінуліся па плячах, густыя, доўгія, толькі ледзь прыхопленыя ля скроняў заколкамі. І так будзе штодзень.

Ішла і быццам назірала за сабой збоку. Вось што значыць высокія абцасы...

— О-о!

Юрыс лыпаў вачыма, нават смешна патрос галавой, быццам хацеў прагнаць насланнё. — Таварыш... Ой, не... спадарыня стараста, дакладваю: 11«А» амаль у поўным складзе пасля лета гатовы кінуцца ў бой за атэстаты...

— Вольна, — Кацярына радасна ўсміхнулася Юрысу.

Ён не ўтрымаўся, выгукнуў:

— Ну, Кацька, ты і даеш! Крута! Божухна, якой ты стала!

— Якой? — Каця хітравата прыжмурыла вочы.

— Ну... — замяўся Юрыс. — Ты на настаўніцу падобная. І, гэта... прыгожая ты, вось, — закончыў ён, крыху ніякавеючы.

— На настаўніцу, кажаш? — усміхалася Каця. — Што, шкадуеш, што так старанна падрыхтаванае для мяне прывітанне, дзе будуць узгаданы мае медыцынскія прышчыкі, сарвалася?

Пінжачок не быў зашпілены, блузка, паўпразрыстая, не хавала бюстгальтара. І былі ў тым бюстгальтары зусім не медыцынскія прышчыкі — гэта Юрыс і заўважыў мо найперш.

— Ат, мінулася дурноты, — засаромеўся ён. — Не, праўда, ты файна глядзішся! Хоць і іншыя нявестамі парабіліся, аднак ты — круцейшая за ўсіх!

— Пайшлі, жаніх разгублены! Твой кампліМент прымаецца.

Ад агароджы, дзе Юрыс і сустрэў Кацярыну, яны пайшлі разам у школу.

Сваіх знайшлі адразу. І тут Кацярына заўважыла, што тыя змены, якія адбыліся з ёй за гэта лета, не выключныя, не нейкія асаблівыя. Не толькі ёй падаравала гэтае лета росквіт — вунь колькі дзяўчат раптоўна набылі сапраўдную жаноцкасць форм, вунь у колькіх свецішча ў вачах глыбіннае святло новага нараджэння. І апранутыя так, што самае лепшае, самае прыгожае — навідавоку, ці то спаднічкай, ці то блузкай падкрэсленае. А хлопцы — сур'ёзныя, у некага вунь, як у Сяргея, вусы так добра відаць. Погляды стрыманыя, усмешкі кароткія, толькі куточкамі вуснаў.

І класная, Вольга Фёдараўна, аж у ладкі пляснула ў захапленні:

— А воечкі, як жа выраслі! Войвой, такія ўсе дарослыя...

Кацярына была рада таму, што апошняе вучнёўскае лета не ёй адной прынесла змены. Не хацелася ёй быць у цэнтры ўвагі хоць адзін дзень з-за сваёй фігуры. Няхай бы толькі Ён заўважыў, няхай бы толькі Ён адзін ацаніў...

Таня падышла, вінавацячыся загаварыла:

— Каць, ты выбачай, мы з Сашкам сядзець разам будзем. Так атрымалася, мы за лета з ім... ну, сама разумееш. Не крыўдуй, што цябе кідаю...

— Ат, далібог, якія крыўды, — адмахнулася Кацярына, але навіна кранула непрыемна. Не, не таму, што Таня будзе сядзець з Сашкам, а таму, што яна раптоўна, нечакана для сябе, засталася адна. Тут жа даўно ўсё падзелена на пары... А Ён? З кім Ён? Як і ў мінулым годзе, з Віктарам?

Таня адышлася, і неспадзявана, быццам з-пад зямлі, перад Кацярынай апынуўся Юрыс.

— Шаноўная паненка! Дазвольце Вам прапанаваць на ўвесь гэты навучальны год маё існаванне побач з Вамі! Абяцаю весці сябе ціха-ціха, бегаць па ваду, насіць кніжкі па кабінетах і весці сябе прыстойна!

Замоўк, лыпаў смешна вачыма, а ў тых вачах недзе глыбока-глыбока тлеў на донцы ці то страх, ці то сорам.

— Ты пра што, Юрыс? — не зразумела Кацярына, на самай справе не надта задумваючыся над тырадай хлопца.

— Ну, як пра што, — разгубіўся Юрыс.

Ён апусціў галаву — і куды падзеліся яго пастаянная ўпэўненасць і гатоўнасць несці бязглуздзіцу ў любы момант. Так, не ўзнімаючы галаву, быццам нешта надзвычай важнае для яго позірку знаходзілася ля яго новых туфляў, ён прапанаваў проста:

— Таня ж з Сашкам сядзець будзе. Ну, ты адна засталася, я адзін таксама. У мяне развод канчатковы, абскарджанню не падлягае, — ён зноў сабраўся, гарэзліва зірнуў на Кацярыну: — Возьмеш да сябе за парту кінутага?

Кацярына не стала пытацца, чаму ён кінуты — яшчэ напрыканцы мінулага года сваркі Юрыса і яго дзяўчыны, Святланы, былі вядомы ўсяму класу. І адказала толькі:

— Ніякіх пытанняў. Але наконт падручнікаў помні. І калі што — адразу ў лоб.

Хацелася пашкадаваць, што так хутка пагадзілася — а раптам усё магло быць інакш? Але тут жа асекла сябе: памятай, кім табе трэба стаць. Хопіць табе добрых пераменаў у гэтым годзе. Аж занадта хопіць...

* * *

— Юрачка, не сумуй занадта, я буду тэлефанаваць штотыдзень, — казала маці, ужо апранутая.

Яны ўсе — Юрый, маці, бацька — прыселі ў пярэдняй, чакалі таксі. Бацька трохі нерваваўся — таксі затрымлівалася ўжо на тры хвіліны.

— Ды не будзе яму часу сумаваць, — буркнуў ён. — У разумнага чалавека няма часу на сум і дурныя заняткі.

— Ой, ды ведаю я, што наш сын разумны і сталы, — маці з пяшчотай паглядзела на Юрку. — Але ж першы раз на столькі часу, ды яшчэ заняткі...

— Мне сумна не будзе, — упэўнена адказаў Юрый. — Можаце асабліва не клапаціцца.

— Усё гэта вядома... — маці задумалася. — Як добра, што ты ў нас такі самастойны стаў. А то такі кантракт, столькі аб ім марылі...

— Едзьце спакойна ў свае Эміраты, — усміхнуўся Юрый. — Няма чаго з-за мяне хвалявацца.

— Дарэчы, пра грошы яшчэ раз, — загаварыў бацька. — Картка ў цябе ёсць, я буду пераводзіць, як дамовіліся, кожны тыдзень патрэбную суму.

— Хатняй работніцы плаціць буду асабіста, так што глядзі, калі яна пачне тут упарціцца — тэлефануй, разбяруся, — умяшалася маці. — І глядзі, каб сапраўдныя абеды гатавала, каб было прыбрана ў кватэры пастаянна, каб было ўсё памыта і адпрасавана. Ёй немаленькія грошы плаціць будзем, будзь смялей і патрабуй выканання яе абавязкаў.

— Добра, добра, не хвалюйцеся, я ўсё помню.

Трэнькнуў званок — таксі.

На парозе кватэры развіталіся, яшчэ колькі хвілін — вось ён і адзін. На цэлых паўгода — толькі на Каляды выпадае бацькам невялікі адпачынак. Эх, хутчэй бы лета — бацькі абяцалі, што адзін летні месяц Юрый прабудзе ў іх — там, у тых казачных Эміратах...

Ніякіх змен у сваім асабістым жыцці Юрый не планаваў і не прадбачыў. Тое, што бацькоў не будзе цэлых паўгода ў кватэры, асабліва не хвалявала. Па сутнасці, яны і так бачыліся хіба што па вячэрах за агульным сталом, ды яшчэ ў выхадныя дні — традыцыйны абед, але і то не кожную нядзелю. У бацькоў былі свае распарадкі, у Юрыя — свае. І ў апошнія два гады не так часта яны перасякаліся.

Недзе гадоў з трынаццаці бацькі, лічы, цалкам пачалі давяраць Юрыю — у яго на той узрост ужо ўпэўнена выбіваліся наперад галоўныя рысы яго характару: самастойнасць і адказнасць. Свой пакой Юрый цалкам перарабіў на свой лад, час ён планаваў толькі сам. Бацькі былі задаволеныя і яго паводзінамі, і поспехамі ў вучобе, толькі маці ў 10-ым, паўгода таму, неяк была спытала:

— Я ніколі не заўважала, каб у цябе была дзяўчына... Не думаю, што ты ад нас нешта можаш хаваць...

— А навошта яна мне цяпер? — проста і шчыра адказаў Юрый. — У нашым узросце ўсякія заляцанні — глупства. Толькі час марнуеш і грошы. Іншы раз у нашым класе такія страсці, а праз месяц — адзін смех і сорам застаюцца. Хіба не так?

— Вядома, так, — быццам і радасна ўсміхнулася маці, але ж нейкая іскрынка суму схавалася ў куточках вачэй.

Калі ўжо быць чэсным перад самім сабой да канца, то было ў Юрыя першае каханне. Тады яму было 14 год. Вядома, не ў сваю аднакласніцу ён закахаўся — у новую маладую настаўніцу па геаграфіі, учарашнюю выпускніцу універсітэта. Яна была прыгожая і незвычайная: хударлявая, з кароткай стрыжкай, апраналася заўсёды вельмі стыльна. Не, яна была не багіняй — гэта была фея з цудоўнай казкі...

Цэлы месяц Юрый чакаў урокаў геаграфіі як свята, рыхтаваўся... Ды што там рыхтаваўся! Ён ці не палову падручніка наперад вывучыў напамяць. А колькі розных цікавых звестак па ўсіх тэмах навышукваў у Інтэрнеце! Аліна Іосіфаўна (так звалі настаўніцу) звярнула ўвагу на Юрыя, на яго старанасць, і неяк яны разам з яшчэ трыма вучнямі з класа засталіся пасля заняткаў — абгаварыць распарадак падрыхтоўкі да алімпіяды. О, гэта быў цудоўны дзень, незвычайныя гадзіны... Яны былі амаль як роўныя, сядзелі блізка-блізка, і Юрый мог дакрануцца да пасмачак яе русявых валасоў...

Дзівосы стварыў чараўнік

Прыкладна так напісаў калісьці ў "Кнізе водгукаў І.Лізуры" рускі пісьменнік Віктар Астаф'еў. І сказана было гэта пра самабытнага разьбяра па дрэве Ігара Лізуру. Ёсць людзі, якія не могуць жыць без творчасці. З такіх — і жыхар Старых Дарог Ігар Лізура. Зайшоў я неяк у двор, што ля яго драўлянага дома, — і нібы трапіў у казачны гарадок. Такі настрой ствараюць фігуры, выразаныя гаспадаром з дрэва: хатка на курыных ножках, Змей Гарыныч, Іван-царэвіч, коцікі на агароджы, совы, гномы, вятрак... А на адмысловых арэлях і дарасламу, і дзіцяці можна ўзняцца даволі высока.

Арыгінальны твор прысвяціў майстар 65-годдзю вызвалення Беларусі: пабываўшы на вядомай "Лініі Сталіна", вырабіў сваю ўласную "Лінію Лізуры" з дзвюх соцень ваяроў ад старажытнасці да нашых дзён і каля 50 макетаў (з людзьмі) ваеннай тэхнікі розных гадоў. Мяркуе дапрацаваць яе і выставіць у Мінскім абласным цэнтры народнай творчасці да юбілею Перамогі.

Нарадзіўся ён у Асіповічах, што на Магілёўшчыне, юнацтва прайшло ў суседнім горадзе Старыя Дарогі на Міншчыне, 27 гадоў жыцця аддаў Уралу. Вярнуўшыся ў Беларусь, нейкі час жыў у Дараганаве на Магілёўшчыне, апошнія 19 гадоў зноў — у Старых Дарогах.

Майстэрства разьбяра перайшло да Ігара Іванавіча ў спадчыну ад дзеда па маці Вікенція Францавіча Дзятко, разьбяра-самавука. Дзед і навучыў унука адчуваць асаблівасці розных відаў драўніны. Пасля дзесяцігодкі Ігар закончыў у Эстоніі аддзяленне тэхналогіі апрацоўкі драўніны лесатэхнічнага тэхнікума.

Служыў у арміі ў Брэсцкай крэпасці і ў родных Асіповічах. Затым — два гады звыштэрміновай службы на Урале. Фактычна Ігар служыў у войску мастаком-афарміцелем.

Але пацягнула яго на цывільную справу, хацеў цалкам прысвяціць сябе маляванню. Уладкаваўся мастаком-афарміцелем на Ніжнетагільскі хімзавод. Супрацоўнічаў з заводскай шматтыражкай, маляваў карыкатуры, святочныя плакаты. Удзельнічаў у гульнях КВЗ, у мастацкай самадзейнасці. Ды ўспомніліся ўрокі дзеда. Пачаў выразаць фігуркі з пенапласту: літаратурных герояў, персанажаў казак, а калі было яму 33 гады, асвоіў тэхналогію разьбы па дрэве.

Ліпа, дуб, вольха, ясень... Набывае дрэва рысы знаёмага чалавека ці казачных герояў. І раскрываецца ў гэтых вырабах Лізура як сапраўдны мастак. Стварыў больш як дзесятак варыянтаў шахмат. Сярод іх Сталін і Гітлер са сваімі войскамі; Ленін і Крупская супраць Мікалая з царыцай; ваяры на Куліковым полі. Усё зроблена з самабытным густам, так што вачэй не адвесці, а гуляць такімі фігурамі — задавальненне. Праўда, сам майстар шахматамі не захапляецца.

Умее ён перадаць у дрэве чароўнасць звычайных мясцовых краявідаў. Дарэчы, яго дыптых "Месца жыхарства", (старадарожскі Палац культуры, былы Дом культуры, яго фасад з калонамі і аздабленнем) цяпер знаходзіцца ў мясцовым музеі, серыя работ на рыбацка-паляўнічую тэму трапіла ў прыватную калекцыю.

У Ігара Іванавіча ёсць "Кніга водгукаў" у разной вокладцы з дубу. Тут пакінулі свае запісы не толькі шматлікія простыя гледачы, зачараваныя выставамі яго работ, але і знакамітыя людзі, артысты. Напрыклад, народная артыстка СССР Стэфанія Станюта, літаратары Уладзімір Арлоў, Кастусь Цвірка, Віктар Астаф'еў...

Пакінуў станоўчы водгук і Прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка, які адкрываў Палац культуры ў Старых Дарогах.Тады майстар падараваў сваю кампазіцыю "Хакеісты" ганароваму госцю, які сярод спартсменаў "прызнаў" і сябе. Крыху пазней Ігару Іванавічу ва ўрачыстай абстаноўцы ўручылі падарунак ад кіраўніка дзяржавы. А яшчэ раней майстар быў адзначаны Ганаровай граматай Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.

50 работ І. Лізуры знаходзяцца ў раённым гісторыка-этнаграфічным музеі, які арганізоўвае іх экспазіцыю ў іншых гарадах краіны. У мясцовым праваслаўным храме вернікі захапляюцца Царскімі варотамі, аздобленымі разьбой земляка. Сёлета прайшла персанальная выстава яго работ на ваенную тэматыку ў Старадарожскай раённай бібліятэцы, дзе пастаянна знаходзяцца 10 пано І. Лізуры на беларускія гістарычныя тэмы... Работы майстра дэманстраваліся на шэрагу выстаў за мяжой краіны...

Ігару Іванавічу сёлета споўнілася 70 гадоў. Праўда, за яго жвавасць, непаседлівасць і гумар яму столькі не даюць. Ён поўны творчых планаў. І радуецца візітам дзяцей: з Урала — сына Уладзіміра, з Чукоткі — дачкі Наташы, якія прывозяць да дзядулі з бабуляй чацвёра ўнукаў.

Анатоль БАРЫС

На здымку: Ігар Лізура ля сваіх казачных работ у дварэ дома.

Фота аўтара г. Старыя Дарогі

Радуемся разам



Артысту Генадзю Гайдуку нядаўна споўнілася 50. Роўна палову жыцця, 25 гадоў, ён служыць на сцэне Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа. Першую значную ролю — маладзенькага салдата Адуванчыка сыграў тут у драме А. Дударава "Радавыя". З часам давялося ўвасобіць вобраз галоўнага героя-мастака ў спектаклі "Шагал... Шагал..." (п'еса У. Драздова). У адной з нядаўніх прэм'ер коласаўцаў — "Прывітанне, Альберт!" паводле Ю. Сохара Генадзь Гайдук стаў таксама цэнтральнай фігурай: славутым фізікам Эйнштэйнам. І менавіта пасля паказу гэтага спектакля ў Мінску, падчас нядаўніх гастроляў, коласаўцы публічна павіншавалі свайго калегу з двайным, жыццёвым і творчым, юбілеем. Да кветак ды сувеніраў, якія атрымаў артыст, дадаўся падарунак сталічных тэатралаў: шчодрая і працяглая авацыя.

З 7 па 31 кастрычніка ў Мінску пройдзе IV Міжнародны фестываль тэатральнага мастацтва "Панарама". Адкрыецца гэтае прадстаўнічае свята Мельпамены паказам камедыі Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча "Пінская шляхта" ў пастаноўцы Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы.

Дарэчы, у практыцы правядзення "Панарамы" яшчэ не было такога, каб фэст пачынаўся праграмай яго гаспадароў. Сёлета ж на працягу першага фестывальнага тыдня менавіта тэатры нашай краіны пакажуць свае лепшыя спектаклі. Сярод іх — "Вяселле" паводле А. Чэхава на Купалаўскай сцэне; "Бег" М. Булгакава ў Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя М. Горкага; "Матылёк" П. Гладзіліна і "Пацалунак ночы" С. Кавалёва — работы ТЮГа; "Каралева прыгажосці" М. МакДонаха ў Новым драматычным тэатры ды інш.

Мінск чакае прыезду замежных творчых калектываў з адметнымі спектаклямі. Завітаць на "Панараму" рыхтуюцца артысты з польскага горада Супрасля, Новы рыжскі тэатр, швейцарскі "Schauspielhaus Zurich" (са спектаклем Пітэра Брука "Чаму, чаму"), Башкірскі дзяржаўны акадэмічны тэатр драмы імя народнага паэта Башкартастана М. Гафуры, Тэатр Оскара Коршунаваса з Літвы, "Gota Dulce Teatro" з Венесуэлы, "Vene Teater" са сталіцы Эстоніі, два тэатры з Санкт-Пецярбурга. І гэта далёка не поўны пералік гасцей.

На закрыццё "Панарамы" плануецца візіт Міланскага тэатра "Piccolo" — Тэатра Еўропы, першага ў Італіі стацыянарнага драматычнага тэатра, заснаванага знакамітым рэжысёрам XX стагоддзя Джорджа Стрэлерам і яго калегам Паола Грасі. Артысты з Італіі выступяць на купалаўскай сцэне, і камусьці з нашых чытачоў пашанцуе ўбачыць легендарнага стрэлераўскага "Арлекіна"...

Сачыце за афішамі! Апроч спектакляў, у праграме фэсту нямала іншых цікавых імпрэз: майстар-класы вядомых рэжысёраў, сустрэчы з дзеячамі тэатра, выстаўкі, творчыя акцыі студэнтаў БДАМ, пасяджэнні міжнароднага клуба крытыкаў і да т.п. А таксама — ужо традыцыйны для "Панарамы" праект "On-line": творчая інтрыга жывога і непаўторнага тэатра.

Лана ІВАНОВА

На здымках: артыст Генадзь Гайдук у ролі Шагала; сцэна са спектакля "Пінская шляхта".

Фота Аляксандра Дзмітрыева

Бацькавай зямлі — паклон...



Польскі інстытут у Мінску, Беларускі саюз мастакоў, Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў зладкавалі сёлета выстаўку графікі Анджэя Струмілы "Зямлі майго Бацькі". Вернісаж у новай сталічнай галерэі "Акадэмія" спалучыўся з прэзэнтацыяй кнігі "Вялікае княства Літоўскае", укладальнікам якой з'яўляецца прафесар А. Струміла.

Заўсёднікам сталічных вернісажаў было прыемна знаёміцца з арыгінальнымі работамі шаноўнага госця з Польшчы, усведамляючы, што Анджэй Струміла — буйная і адметная постаць у сусветнай культуры — наш зямляк. Бацька і дзед мастака нарадзіліся ў Мінску, сам ён — у Вільні, у 1928-м. Перажыўшы трагічныя для яго гады вайны, А. Струміла стаў студэнтам Дзяржаўнай вышэйшай школы выяўленчага мастацтва ў Лодзі, адначасова паступіў тамсама на гуманітарны факультэт універсітэта. Затым скончыў факультэт жывапісу Акадэміі выяўленчага мастацтва ў Кракаве. Год таму ў польскім горадзе Сувалкі, дзе цяпер жыве прафесар, адкрылася Галерэя Струмілы.

"Я шмат бачыў у жыцці. Падарожжы — цераз горы, пустыні, стэпы, тайгу, джунглі, моры, акіяны, праз цывілізацыі — і час навучылі мяне талерантнасці, памяркоўнасці і наблізілі да прымірэння з лёсам, — распавядае А. Струміла. — Мастацтва падалося мне актам жыцця настолькі натуральным, як і ўсё іншае, што знаходзіцца паміж нараджэннем і смерцю. Абміну тут пералік таго, што я зрабіў за некалькі дзесяткаў гадоў працы ў галіне жывапісу, малюнка, графікі, кніжнай ілюстрацыі, арганізацыі выставак, сцэнаграфіі, фатаграфіі, паэзіі. Абміну і ўзнагароды і поспехі, а таксама паразы, прыніжэнні і разгромы, якіх лёс, што дбае пра раўнавагу, не пашкадаваў. Не раз я быў вымушаны рабіць рэчы дробязныя, неадпаведныя, чужыя самому сабе. Некалькі гадоў працаваў асістэнтам і прафесарам жывапісу. Два гады я быў чыноўнікам Арганізацыі Аб'яднаных Нацый у Нью-Йорку, кіруючы там майстэрняй графічнага праектавання. Манхэтэн даў мне ўсё, што можа даць цывілізацыя горада. Я агледзеў сотні галерэй, тысячы выставак пад дэвізам "I am the best", якія ў крыку паказваюць трагедыю існавання. Пасля ўсяго гэтага не застаецца нічога больш вартага, чым маўчанне... У думках я быў над мяжой маёй Літвы. Шмат гадоў частку сваіх сіл я прысвячаў "стварэнню асяроддзя чалавека", працуючы ў галіне аховы краявіду паўночна-ўсходняй Польшчы, якая блізкая майму сэрцу таксама і таму, што нагадвае край дзяцінства".

Прэзентаваны ў Мінску унікальны і салідны, у літаральным сэнсе важкі фаліянт "Вялікае княства Літоўскае", укладзены Анджэем Струмілам і прысвечаны 1000-годдзю Літвы, аб'яднаў пад адной вокладкай тэксты аўтараў з трох краін, якіх злучала ВКЛ: Беларусі, Літвы, Польшчы. Артыкулы пададзеныя на чатырох мовах: англійскай, беларускай, літоўскай і польскай. На думку А. Струмілы, "кніга закліканая паказаць пазітыў таго часу, калі жылі мы ў пэўнай еднасці, калі не было падзелу каштоўнасцяў, калі гэтыя каштоўнасці былі агульныя, агульна створаныя. Гэта быў час высокай талеранцыі — вышэйшай, чым у многіх месцах Еўропы. Культура стваралася супольна... І была такая спроба — аб'яднаць розныя нацыі, розныя рэлігіі, розныя традыцыі..."

Жывапісец, графік, фотамастак, падарожнік, літаратар, збіральнік унікальнай этнаграфічнай калекцыі, абаяльны, лёгкі ў стасунках, мудры 80-гадовы чалавек Анджэй Струміла шчыра пакланіўся бацькавай зямлі, на якой спаткаў шмат прыхільнікаў свайго багатага творчага таленту.

Я. КАРЛІМА

На здымках: Анджэй Струміла і плакат яго мінскай выстаўкі.

Яскравы талент «фармаліста»

Мастацтва памірае, калі пошук спыняецца. З гэтым перакананнем прайшоў праз усё творчае жыццё Леў Літвінаў, 110 гадоў з дня нараджэння якога адзначыла культурная грамадскасць краіны.

Жаданне служыць Мельпамене выявілася ў яго рана. Ва ўзросце дваццаці гадоў таленавіты юнак ужо кіруе аматарскім калектывам і хутка становіцца адметным арганізатарам тэатральнай самадзейнасці Мінска 1920-х, а затым — студыйцам пры МХАТ-II. Калі Л. Літвінаву было 28, ён паставіў у Дзяржаўным яўрэйскім тэатры БССР свой першы прафесійны спектакль "Фуэнтэ Авехуна" ("Авечая крыніца") Лопэ дэ Вегі, які атрымаў усесаюзную вядомасць. А ў 33 гады ён — мастацкі кіраўнік вядучага тэатра Беларусі — БДТ-1, у якім на працягу шасці гадоў ставіць шэраг бліскучых, удалых, а таксама спрэчных спектакляў і ў 1938 годзе пакідае тэатр з кляймом "фармаліста".

*Нейкі час папрацаваўшы ў тэатрах Беларусі ды Украіны, Леў Маркавіч у 1943 г. вяртаецца ў БДТ-1 (якому пры канцы 1944-га нададзена імя Янкі Купалы. — **Рэд**.) галоўным рэжысёрам, ставіць новыя спектаклі, некаторыя з іх уваходзяць у залаты фонд беларускага тэатральнага мастацтва. Пры канцы 40-х гадоў рэжысёра бязлітасна крытыкуюць на старонках беларускай тэатральнай прэсы, у выніку чаго ён вымушаны ў 1950-м назаўсёды пакінуць Беларусь. Наступныя 13 гадоў Літвінаў плённа і паспяхова працуе ў Казанскім рускім драматычным тэатры — да апошняга дня (памёр 21 кастрычніка 1963 г.).*

На працягу дзесяці гадоў, пачынаючы з 1987-га, у БДАМЛМ паступалі дакументы рэжысёра ад яго сына — Ігара Львовіча Літвінава. У выніку быў створаны асабісты фонд Л. Літвінава. На аснове архіўных дакументаў: пісьмаў, артыкулаў, выказванняў пра рэжысёра і манаграфіі Ігара Літвінава пра творчую дзейнасць Льва Маркавіча ў Купалаўскім тэатры падрыхтаваная сённяшняя публікацыя.

Эстэтычныя погляды Л.Літвінава фарміраваліся ў перадрэвалюцыйныя і паслярэвалюцыйныя гады. Ён захапляўся футурыстычнай паэзіяй, пісаў п'есы, але асноўнай сталася рэжысёрская праца. У рэжысуру Леў Маркавіч прыйшоў як пастаноўшчык масавых імпрэз. Яго вабіў героіка-рамантычны тэатр. У 1926 —29 гг. Л. Літвінаў працаваў акцёрам і рэжысёрам Дзяржаўнага яўрэйскага тэатра БССР. Так атрымалася, што лепшай работай першых гадоў існавання тэатра стаўся спектакль не кіраўніка трупы — М. Рафальскага, а яго вучня, маладога рэжысёра Л. Літвінава, чыя пастаноўка "Фуэнтэ Авехуна" ўражвала смеласцю, яскравасцю, тэмпераментам, майстэрствам кампазіцыі масавых сцэн. Вядомы тэатральны крытык П. Маркаў пісаў, што гэтая работа параўнальная па мастацкім ўзроўні з лепшымі спектаклямі маскоўскіх тэатраў.

Малады Літвінаў лічыў, што акцёрам патрэбна новая сістэма ігры: не рэалізм Станіслаўскага і не біямеханіка Меерхольда, а нешта іншае. Але калектыву і рэжысёру так і не ўдалося стварыць гэтую новую сістэму.

З 1932 па 1938 гг. Л. Літвінаў працуе мастацкім кіраўніком і рэжысёрам БДТ-1, а з 1943 па 1950 гг. — мастацкім кіраўніком і галоўным рэжысёрам, затым рэжысёрам гэтага тэатра. Тут ён паставіў 20 разнажанравых, розных па вобразнай глыбіні спектакляў. Сярод іх "Жакерыя" П.Мерымэ, "Бацькаўшчына" К. Чорнага, "Далёкае" А. Афінагенава, "Як яе клічуць" М.Адуева, "Неспакойная старасць" Л. Рахманава, "За тых, хто ў моры" Б. Лаўранёва. На ўзроўні беларускай тэатральнай класікі бліскуча ўвасобіў Купалаву "Паўлінку" і шэкспіраўскую трагедыю "Рамэо і Джульета", карнавальны "Дзень цудоўных падманаў" Р. Шэрыдана, кранальнае "Позняе каханне" А. Астроўскага. Літвінава вінавацілі ў захапленні фармалістычнымі прыёмамі і ў адвольнай перапрацоўцы драматургічнага тэксту. Як сапраўды таленавіты чалавек, ён адстойваў сваё права на самастойную трактоўку п'ес, ведаючы, што ў такой спрэчцы лепшым доказам уласнай слушнасці можа быць толькі спектакль. Літвінаў быў не фармалістам і не прыхільнікам сістэмы Станіслаўскага, ён шукаў, шукаў заўсёды і ведаў: мастацтва памірае, калі пошук спыняецца.

Літвінава абвінавачвалі ў імкненні стварыць з БДТ-1 тэатр героіка-рамантычнага кшталту. Гэта не зусім так. Ён вызначыў героіка-рамантычны стыль як найбольш важны кірунак для тэатра таго часу: эпоха вымагала раманты кі і давала бліскучыя яе прыклады. Ды Леў Маркавіч памылкова не ўлічыў, што "відовішчнае" ўвасабленне гэтага стылю было з-за шэрага прычын не сугучнае савецкаму тэатру 1930-х гадоў, і асабліва калектыву БДТ-1, выхаванага Е. Міровічам у іншых традыцыях. Пэўна, у спрыяльных гістарычных умовах творчыя магчымасці Літвінава маглі б рэалізавацца ў цікавы вынік. Аднак рэжысёр і не казаў пра героіка-рамантычны кірунак як пра адзіны стыль БДТ-1. Наадварот, ён настойліва падкрэсліваў полістылёвасць тэатра, яго жанравую шматстайнасць. І сам, паралельна "фармалістычнай", відовішчнай "Жакерыі" П. Мерымэ, ставіў глыбока рэалістычны "Канец дружбы" К. Крапівы і дасягаў вялікіх вяршынь, працуючы з акцёрамі над глыбока народнымі вобразамі ў псіхалагічным спектаклі "Бацькаўшчына" паводле К.Чорнага, дзе ва ўсім бляску раскрыліся таленты І.Ждановіч і Г.Глебава.

На працягу працы над спектаклямі галоўнай задачай Літвінава быў напружаны пошук максімальнай сцэнічнай выразнасці і псіхалагічнай глыбіні ў мэтах найбольшага данясення да гледача ідэі пастаноўкі. З такім рэжысёрам было цікава, ён захапляў калектыў і няўрымслівым тэмпераментам, і эрудыцыяй. Яго творчасць несла радасць і артыстам, і гледачам. "Заўсёды з удзячнасцю ўспамінаю нашу сумесную работу. Я асабліва цаніла ў ім як у рэжысёры адну найкаштоўную якасць: ён глыбока разумеў своеасаблівую, часам загадкавую прыроду акцёрскай індывідуальнасці, глыбока паважаў і цаніў працу і захопленасць акцёраў", — гэта словы народнай артысткі СССР незабыўнай Л. Ржэцкай.

У 1944 годзе, калі БДТ знаходзіўся ў Томску, Літвінаў паставіў выдатную камедыю Янкі Купалы "Паўлінка", у якой кожнае слова поўніцца сакавітым народным гумарам. Дзякуючы багаццю мовы і па-майстэрску выпісаным характарам, твор стаў сапраўдным шэдэўрам беларускай драматургіі. Літвінаў па-новаму трактаваў фінал п'есы: зрабіў яго аптымістычным. Надзвычай удалае размеркаванне роляў паспрыяла выключнай ансамблевасці, а таксама сакавітасці кожнага вобраза. Бліскуча ігралі Р.Кашэльнікава, Б. Шаціла, У. Дзядзюшка, Л. Ржэцкая, Б.Платонаў, В. Пола, Г. Глебаў. Здавалася, што вялікі аўтар напісаў камедыю менавіта для гэтых артыстаў. Прэм'ера была сапраўдным трыумфам. Але пасля вяртання тэатра ў Мінск тагачасная крытыка непрыхільна сустрэла работу Літвінава. Яго абвінавачвалі ў залішняй тэатралізацыі, у адыходзе ад традыцыйнай трактоўкі класічнага твора Янкі Купалы, нягледзячы на тое, што нават удава класіка — Уладзіслава Францаўна Луцэвіч дала "добра" фіналу "Паўлінкі". Доўгае сцэнічнае жыццё спектакля аспрэчыла ўсе абвінавачванні на адрас рэжысёра, "Паўлінка" Л. Літвінава ўвайшла ў залаты фонд тэатра і дагэтуль з'яўляецца яго візітоўкай.

У 1946 г. упершыню на беларускай сцэне Літвінаў ставіць трагедыю У. Шэкспіра "Рамэо і Джульета". Спектакль становіцца падзеяй тэатральнага жыцця Беларусі. У гэтай пастаноўцы, як адзначае тэатразнаўца І.Шостак, рэжысёру "ўдалося стварыць рамантычны спектакль сродкамі сапраўды акцёрскага, вострапсіхалагічнага беларускага тэатра, тыповымі прадстаўнікамі якога былі І.Ждановіч і Б. Платонаў, якія паказалі шэкспіраўскія характары ў іх развіцці, шматграннасці, складанасці і інтэлектуальным багацці. Працуючы над гэтым патэтычным творам, рэжысёр быццам браў за аснову словы Бялінскага пра Шэкспіра — "тонкі аналіз чалавека з усімі выгібамі яго душы і сэрца" стаў асноўнай заслугай пастаноўкі Літвінава".

У канцы 1940-х гадоў Л.Літвінаў стаў адной з галоўных мішэняў разгорнутай кампаніі супраць "касмапалітаў". На яго абрынуўся шквал артыкулаў, падобных да палітычных даносаў, з абвінавачваннем у развале беларускага тэатра. Працаваць у такіх варунках было немагчыма. Ігар Літвінаў у сваёй манаграфіі пісаў: "Я з пачуццём глыбокай павагі глядзеў, як бацька цудам знаходзіў сілы для стварэння іскрыстай "Дуэны", пяшчотнага, усхваляванага спектакля "Таленты і паклоннікі" і іншых сцэнічных твораў. Праз шмат гадоў я прачытаў лісты бацькі таго часу, у якіх ён гаворыць: "У існуючых абставінах болей немагчыма жыць і працаваць, я ў роспачы, я губляю сілы ў гэтай невыноснай атмасферы злосці". Міжвольна думаецца, колькі не створаных "Паўлінак", "Рамэо і Джульет" недалічыўся беларускі тэатр у выніку гэтых абставін".

У 1950 годзе славуты рэжысёр ад'язджаў у Казань "хаваючы слёзы роспачы і ўсміхаючыся сваёй звыклай усмешкай". У Казанскім рускім драматычным тэатры імя В.Качалава Л. Літвінаў прыязна быў прыняты калектывам. Аднавілася нармальная творчая праца. На гэтай сцэне ён, галоўны рэжысёр, паставіў змястоўныя, падтрыманыя гледачом і тэатральнымі крытыкамі, спектаклі... Апошнім з іх стала камедыя А. Макаёнка "Лявоніха на арбіце".

Літвінаў-рэжысёр меў яскравы, багаты талент і сцвердзіў сябе як выдатны майстар сцэны. Да звання заслужанага дзеяча мастацтваў БССР дадалося званне заслужанага дзеяча мастацтваў Татарскай АССР. Пра яго пісалі многія і рознае, але самым сумленным, непрадузятым аўтарам быў і застаецца тэатразнаўца Б. Бур'ян. У сваіх артыкулах і ўспамінах і ў даўнія 1960-я, і ў 90-я гады ён паслядоўна абараняў творчасць майстра. Вось, напрыклад, як пісаў Барыс Іванавіч пра Літвінава: "У розныя часы нашай гісторыі па-рознаму караліся за падобныя нібыта адхіленні ад генеральнай лініі сацыялістычнага рэалізму савецкія рэжысёры. Выгнанне з Беларусі Л. Літвінава захавала яго ад больш прыкрых непрыемнасцей, ён паспеў зрабіць многа на рускай сцэне ў Татарыі. Але ў кожнага адданага тэатрала застаецца адчуванне нейкага злачынства, якое было зроблена ў нас, калі мы ўголас ці моўчкі, актыўным удзелам або сваім маўчаннем патуралі рэпрэсіўнаму ганенню і ўціску самавітага рэжысёрскага таленту. Перакрэсліць усе здабыткі і пазбавіць грамадскага прызнання — што можа быць горшым для мастака такога маштабу!"

Льва Маркавіча не пакідала мара вярнуцца ў краіну сваёй маладосці — Беларусь. Тут ён нарадзіўся, вырас, развіў свой талент, тут у яго засталіся верныя сябры-купалаўцы: У. Уладамірскі, С.Бірыла, Б.Платонаў, І.Ждановіч, У.Дзядзюшка, В.Галіна, Г.Глебаў, Л. Шынко, з якімі рэжысёр ліставаўся да сваіх апошніх дзён. Два лісты Л. Літвінава — да народнага артыста БССР С. Бірылы і народнага артыста СССР Б.Платонава прапануюцца (у скарачэнні) чытачу.

[1950-я гг.]

Дарагі сябра Барыс!

Абставіны не дазваляюць мне з'ездзіць у Мінск пабачыцца з табою, пагаварыць. Мне, прызнацца, вельмі не хапае тваёй прысутнасці для ўдзелу ў працы і жыцці тэатра. Хочацца верыць, што нядоўга чакаць твайго прыезду сюды — гэта вельмі патрэбна ўсім нам.

Адпачывай, дарагі сябра, лячыся і рабі ўсё, каб хутчэй вярнуцца "ў строй" [...]

У думках размаўляю з табою і жадаю гэтага рэальна. Моцна абдымаю. Літвінаў.

Казань. 10.X.56

Дарагі сябра, Сцяпан Сцяпанавіч!

Дзякую Вам за прысланы артыкул (назва не высветленая. — Н. С.) і пісьмо з добрымі словамі пра мяне. Я ўспамінаю, што Вам давялося перанесці за праўду, і разумею, што гэты артыкул (я яго называю ліквідацыяй вынікаў культу асобы ў прымяненні да тэатра) з'яўляецца і Вашай перамогай і кампенсацыяй за многія цяжкія перажыванні. Колькі добрых работ мы маглі стварыць і колькі здароў'я падарвана гэтымі шматгадовымі пакутамі! [...]

Хочацца жыць, каб убачыць перамогу дабра над злом. [...]

Я па-ранейшаму люблю Мінск і Беларусь, і многіх людзей, якія там жывуць, але з пагардай успамінаю тых, якія аказаліся несумленнымі. Шкада, што цудоўны тэатр Купалы томіцца ў руках малаталенавітых "кіраўнікоў". [...]

Чуў, што ставіце "Салаўя" і "Бацькаўшчыну". Рады і шкадую, што не магу ўнесці сваю лепту ў рэканструкцыю пастановах. Жадаю поспеху.

Я стаўлю іспанскую п'есу "Чалавек і воўк", рыхтуемся да дэкады Татарскай.

Дома ў мяне ўсё добра. Адчуваю сябе калі як, але працую на поўную сілу. Атмасфера працы — выдатная. Збіраю кнігі, іграю на гітары. Так і жывём. Цалую Вас і ўсіх сяброў. Літвінаў.

Наталля САКАЛОЎСКАЯ,
вядучы навуковы супрацоўнік Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва

У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі ў рамках Дзён еўрапейскай спадчыны пад эгідай Міністэрства культуры нашай краіны адбылося пасяджэнне "круглага стала" на тэму "Беларусь самабытная. Традыцыі. Мова. Рамёствы", прысвечанага праблемам захавання нацыянальнай гісторыка-культурнай спадчыны.

Спадчына вызначае будучыню

Кожны год у верасні паўсюль у Еўропе праводзяцца Дні еўрапейскай спадчыны. Мэта гэтай акцыі — папулярызацыя культурнай спадчыны і пашырэнне інфармаванасці грамадства пра багацце і разнастайнасць культур еўрапейскага кантынента, магчымасць ацаніць багатую мазаіку еўрапейскіх культур, паспрыяць умацаванню еўрапейскай самабытнасці.

У НББ у "круглым стале" "Беларусь самабытная. Традыцыі. Мова. Рамёствы" бралі ўдзел прадстаўнікі Міністэрства культуры Беларусі, Нацыянальнай камісіі нашай краіны па справах ЮНЕСКА, Нацыянальнай акадэміі навук рэспублікі, Беларускага камітэта Міжнароднага савета музеяў "ICOM", Беларускага фонду культуры, ВНУ, тэатраў, бібліятэк і іншых устаноў і арганізацый, якія займаюцца пытаннямі захавання гісторыка-культурнай спадчыны.

На абмеркаванне выносіліся наступныя пытанні:

— роля і значэнне гісторыка-культурнай спадчыны ў фарміраванні нацыянальнай ідэнтычнасці, выхаванні маладога пакалення, развіцці культуры; умацаванне паступальнага развіцця грамадства праз засваенне, пераасэнсаванне помнікаў гісторыі і культуры ў сучасным палітычным, эканамічным і сацыяльным кантэксце;

— праблемы і шляхі інтэграцыі беларускай культурнай спадчыны ў еўрапейскую і міжнародную культурную прастору: удзел у міжнародных праектах, інтэгрыраваных базах даных культурнай спадчыны; развіццё міжкультурных камунікацый; уключэнне нацыянальных культурных каштоўнасцей у Сусветны спіс культурнай спадчыны;

— пытанні стварэння нацыянальнай стратэгіі аховы і выкарыстання нематэрыяльнай культурнай спадчыны, у тым ліку: распрацоўка і прыняцце агульнай палітыкі, садзейнічанне навуковым, тэхнічным, мастацтвазнаўчым даследаванням; праблемы захавання і развіцця беларускамоўнай прасторы...

Распачаў мерапрыемства ўступным словам намеснік міністра культуры Уладзімір Грыдзюшка, які зазначыў, што Рэспубліка Беларусь ратыфікавала Еўрапейскую культурную канвенцыю 18 кастрычніка 1993 года і з гэтага часу штогод далучаецца да святкавання гэтай агульнаеўрапейскай акцыі, якая адзначаецца ў розных рэгіёнах краіны.

Уладзімір Паўлавіч падкрэсліў, што без мінулага няма сённяшняга і будучыні. Кожны грамадзянін выдатна разумее, што спадчына — гэта той шматгранны набытак, які садзейнічае ўмацаванню ўзаемаразумення, узаемнага даверу паміж народамі шматлікіх краін, а таксама адначасова аб'ядноўвае і дае магчымасць адрозніваць той ці іншы народ адно ад аднаго. Да таго ж, прынцыпова важна не толькі разумець спадчыну. Бо нехта лічыць, што спадчына — гэта толькі помнікі культуры ды архітэктуры. Іншыя — што гэта наша гісторыя, традыцыі, абрады. Усё пералічанае і шмат чаго яшчэ іншага і складае спадчыну народа і краіны...

Вялі "круглы стол" Ала Сташкевіч, намеснік дырэктара Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы, і Людміла Кірухіна, намеснік дырэктара па навуковай рабоце і сувязям з грамадскасцю НББ. Ала Барысаўна адзначыла, што адна з місій музея не толькі захоўваць, але і перадаваць інфармацыю. Сёння ў беларускім грамадстве на ўзроўні сям'і няма, так бы мовіць, "рэтрансляцыі", перадачы паданняў ды легенд ад пакалення да пакалення — ад бабулі да маці, ад маці да дзіцяці. Цяпер усе разлічваюць на школу, музей, на іншыя ўстановы, але гэта няправільна.

У сваю чаргу Людміла Генадзьеўна вызначыла, што бібліятэка прызвана для таго, каб збіраць, захоўваць і трансліраваць ўсё тое, што датычыць дакументальнай спадчыны нашай краіны. Беларусь у цэлым і бібліятэкі ў прыватнасці шмат што страцілі падчас розных трагічных момантаў за час сваёй гісторыі. Прыкладам, войны знішчылі значную частку фондаў. Да і папера не можа захоўвацца вечна, асабліва унікальныя рэдкія выданні XV — XVI стагоддзяў. Усё гэта падлягае кансервацыі, рэканструкцыі, узнаўленню. Трэба выкарыстоўваць сусветныя тэхналогіі, напрыклад, алічбоўку, засвойваць інтэрнет-прастору і ўжываць сучасныя сродкі, якія спрыяюць і захаванню, і вяртанню, хоць і віртуальнаму, помнікаў на нашу радзіму.

Валянціна Пісарэнка, загадчык філіяла Нацыянальнага мастацкага музея нашай краіны музея беларускай народнай творчасці, прыйшла да высновы, што народнае мастацтва патрэбна толькі тым, хто з ім працуе, тым, каму за гэта плацяць малыя грошы і дазваляюць займацца любімай справай.

Алена Красоўская, саветнік Міністэрства замежных спраў Беларусі, адказны сакратар Нацыянальнай камісіі па справах ЮНЕСКА, засяродзіла ўвагу прысутных на тым, што стартаваў і на працягу некалькіх год актыўна развіваецца праект "Радзівіліяна" па вяртанні на радзіму алічбаваных копій дакументаў, які аб'яднаў рэсурсы разнастайных краін: Польшчы, Літвы, Расіі....

Наталля Дзмітрыеўна Хвір, загадчык сектара па ахове гісторыка-культурнай спадчыны ўпраўлення па ахове культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Міністэрства культуры Беларусі, адзначыла, што, на жаль, на сённяшні дзень працэс уключэння ў дзяржаўны Спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей нематэрыяльных аб'ектаў ідзе значна марудней, чым матэрыяльных. Але Міністэрства культуры нашай краіны робіць шмат намаганняў, каб паскорыць гэты працэс.

Усяго ў Нацыянальным гістарычным музеі Беларусі больш як 370 тысяч адзінак захоўвання, з якіх сорак працэнтаў прадметаў патрабуе рэстаўрацыі.

Час мінае, і мы ўсё больш і больш усведамляем і разумеем, што нематэрыяльная культура — гэта аснова самазахавання беларускага этнасу. Гісторыка-культурныя каштоўнасці — падмурак і жыватворная крыніца нацыі. Паўстае пытанне аховы нематэрыяльнай культуры, і, зыходзячы з гэтага, мэтазгодна прыняцце такога закона, — падкрэсліла Алена Новік, дэпутат, член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічным прагрэсе. Таксама Алена Аляксандраўна выказалася за пашырэнне сфер ужывання беларускай мовы.

Святлана Лакотка, дырэктар Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і быту, паскардзілася на недахоп спецыялістаў. А Ніна Калымага, намеснік дырэктара Нацыянальнага гістарычнага музея Беларусі (да нядаўняга часу Нацыянальны музей гісторыі і культуры Беларусі), — на цяжкасці з працэсам рэстаўрацыі экспанатаў. Усяго ва ўстанове больш як 370 тысяч адзінак захоўвання, з якіх сорак працэнтаў прадметаў патрабуе рэстаўрацыі.

Да абмеркавання, гэтых і іншых праблем далучыліся Раіса Вайцяхоўская, дырэктар Мінскага абласнога цэнтра народнай творчасці, Аляксандр Смоліч, загадчык кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства БДУКіМ, Марына Сатоліна, памочнік старшыні Канстытуцыйнага Суда Беларусі, Вячаслаў Калацэй, загадчык кафедры этналогіі і фальклору БДУКіМ.

Раман Падаляка, акцёр Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы, закрануў некалькі пытанняў, у тым ліку акрэсліў праблему мізэрнай колькасці беларускамоўных садкоў, школ і ўжытку беларускай мовы. Была выказана думка, што, можа, ужо надышоў час стварыць Інстытут захавання беларускай мовы...

Як зазначыў Аляксандр Лукашанец, дырэктар Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі, — нацыянальная мова з'яўляецца адным з важнейшых элементаў нематэрыяльнай спадчыны, але мае і матэрыяльнае ўвасабленне як у гістарычным плане — помнікі пісьменства, так і ў сучасным — слоўнікі, граматыкі, іншыя даведнікі, якія прадстаўляюць сучасную сістэму мовы, што дазваляе ёю сёння карыстацца. Мы жывём сёння ў такім грамадстве, што пісьмовая мова з'яўляецца фактычна сферай самастойнай дзейнасці. І для таго, каб яна існавала, павінна быць нейкае матэрыяльнае ўвасабленне. А што рабіць, каб захаваць родную мову? Трэба, па-першае, самім на ёй размаўляць. Па-другое, прытрымлівацца моўнага заканадаўства і ўмець адстойваць свае правы.

А што рабіць, каб захаваць родную мову? Трэба, па-першае, самім на ёй размаўляць. Па-другое, прытрымлівацца моўнага заканадаўства і ўмець адстойваць свае правы.

Аляксандр Аляксандравіч акцэнтаваў увагу на тым, што не трэба зводзіць нацыянальную беларускую мову толькі да літаратурнага варыянту, бо гэта яе вельмі збядняе. Нацыянальная мова — значна больш складаны і аб'ёмны механізм. Яна ўключае не толькі літаратурны варыянт — гэта рафінірваная, так бы мовіць, несапраўдная жывая мова, — але і народныя гаворкі, тарашкевіцу, дыялекты, трасянку... Родная мова мае тэндэнцыі да пашырэння сфер свайго выкарыстання, прыкладам — набажэнствы, Інтэрнет... Калі кожны грамадзянін, пачынаючы яшчэ са школы, будзе ведаць, што, каб заняць любую службовую пасаду, яму трэба рэальна ведаць дзве дзяржаўныя мовы, то зусім па-іншаму будуць адносіцца да вывучэння беларускай мовы ў школе і бацькі, і самі дзеці.

Аляксандр Лукашанец упэўнены: гаворачы пра матэрыяльную і нематэрыяльную спадчыну, мы павінны думаць пра яе моўную прэзентацыю ўнутры краіны і, у большай ступені, так паза яе межамі. Яна павінна мець толькі беларускамоўнае ўвасабленне.

Удзельнікі "круглага стала" адзначылі вялікае значэнне культурнай спадчыны ў фарміраванні нацыянальнай ідэнтычнасці, выхаванні маладога пакалення, развіцці культуры і адукацыі. Яны прызналі, што культурная спадчына Беларусі з'яўляецца неад'емнай часткай еўрапейскай культурнай спадчыны, але валодае спецыфічнымі рысамі, уласцівымі менавіта дадзенаму рэгіёну. Таксама была выказана занепакоенасць, што асобныя яе аб'екты знаходзяцца пад пагрозай разбурэння, якое выклікана не толькі натуральнымі прычынамі, але і развіццём працэсаў глабалізацыі і уніфікацыі сацыяльнага і эканамічнага жыцця...

Напрыканцы мерапрыемства палічылі мэтазгодным прыняць наступныя рэкамендацыі: разгледзець магчымасць стварэння Беларускага нацыянальнага каардынацыйнага цэнтра па ахове і вывучэнні культурнай спадчыны краіны; звярнуць увагу СМІ на неабходнасць распрацоўкі спецыяльных радыё- і тэлевізійных праграм і раздзелаў у перыядычных выданнях, якія б адлюстроўвалі стан захавання культурнай спадчыны; прапанаваць міністэрствам адукацыі, працы і сацыяльнай абароны Беларусі ўвесці пасаду этнапедагога ва ўстановах адукацыі, культуры і пазашкольнага навучання і выхавання. Таксама трэба звярнуць асаблівую ўвагу на стварэнне дзяржаўнай праграмы ахоўных мерапрыемстваў у дачыненні да нематэрыяльнай культурнай спадчыны, якая з'яўляецца найбольш адчувальнай да знешніх пагроз, у тым ліку: прасіць Міністэрства культуры распачаць падрыхтоўку асобнага Закона Рэспублікі Беларусь "Аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны"; актывізаваць дзейнасць па стварэнні электронных баз даных у галіне нематэрыяльнай спадчыны і вызначыць каардынацыйны цэнтр для арганізацыі абмену інфармацыяй і ўзаемадзеянню адпаведных нацыянальных структур...

Віктар КАВАЛЁЎ
Фота аўтара

З музычным акцэнтам

Міжнародны сімпозіум "Сучаснае музыказнаўства ў сусветнай навуковай прасторы" адбыўся ў Мінску на пачатку верасня. Навукова-музыказнаўчая падзея такога высокага ўзроўню ладзілася ў нашай краіне ўпершыню. Сімпозіум арганізавалі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі ды Міжнароднае музыказнаўчае таварыства (IMS).

Сусветная музыказнаўчая эліта з 14 краін, у тым ліку і нашай, сабралася ў беларускай сталіцы, каб умацаваць прафесійныя і творчыя кантакты між калегамі, пашырыць навуковыя сувязі з мэтай ажыццяўлення буйных навуковых музыказнаўчых праектаў, стымуляваць развіццё даследаванняў у розных галінах музычнай навукі. Удзельнікамі сімпозіуму былі прадстаўнікі Аўстрыі, Беларусі, Бельгіі, Вялікабрытаніі, Германіі, ЗША, Ізраіля, Італіі, Літвы, Польшчы, Расіі, Украіны, Францыі, Швейцарыі.

Падчас афіцыйнага адкрыцця сімпозіуму ўдзельнікаў і гасцей гэтага прадстаўнічага навуковага сходу павітаў міністр культуры нашай краіны Павел Латушка. Ён, у прыватнасці, адзначыў, што сёння, калі чалавецтва заклапочанае пераважна праблемамі эканамічнага характару, узнікла небяспека забыцца на тое, што ва ўсе часы адзіным стымулам развіцця цывілізацыі былі і застаюцца перадусім культурныя каштоўнасці — духоўнасць, рэлігія, мараль, мастацтва. Менавіта яны аб'ядноўваюць краіны і народы, усталёўваюць паразуменне між людзьмі розных веравызнанняў, вырашаюць канфлікты і даюць надзею на прагрэсіўнае развіццё чалавека і чалавецтва. Разумеючы гэта, кіраўніцтва нашай краіны вялікую ўвагу аддае развіццю культуры і мастацтва, арганізацыі міжнародных фестываляў і конкурсаў, падтрымцы таленавітай моладзі ды перспектыўных мастацкіх праектаў.

Аднак гэты сімпозіум, на думку міністра, — падзея для Беларусі унікальная, і ёсць надзея, што яго правядзенне стане крокам да ўключэння Мінска ў лік прызнаных цэнтраў развіцця акадэмічнага класічнага мастацтва і музыказнаўчай навукі. Павел Латушка падкрэсліў, што наша культура з'яўляецца неад'емнай часткай еўрапейскай культурнай прасторы, злучальным звёнцам паміж заходнееўрапейскай і ўсходнееўрапейскай цывілізацыямі. Міністр прыгадаў знаных у музычным свеце асоб: Станіслава Манюшку, Восіпа Казлоўскага, Напалеона Орду, народжаных на беларускай зямлі; Міхаіла Глінку, Ігара Стравінскага, Дзмітрыя Шастаковіча, Міхала Клеафаса Агінскага, якія маюць беларускія карані.

На сімпозіуме прысутнічалі прэзідэнт IMS прафесар Інсбрукскага універсітэта Цільман Зеебас, генеральны сакратар таварыства прафесар Цюрыхскага універсітэта Даратэя Баўман, ганаровыя госці — прадстаўнікі вядомых музычных дынастый Алена Стравінская, Усевалад Сцяпанаў ды Ірына Шастаковіч.

На пленарным пасяджэнні, падчас працы па секцыях гаворка вялася ў такіх тэматычных напрамках, як "Этнамузыкалогія ў XXI стагоддзі: гістарычныя і этнічныя аспекты традыцыйных музычных культур", "Стравінскі: паміж Усходам і Захадам", "Шастаковіч і яго асяроддзе"... Больш як 40 дакладаў прадставілі вучоныя з буйных навуковых і адукацыйных цэнтраў свету.

Лана ІВАНОВА

Нават самыя чароўныя сны саступаюць магічнай прыгажосці бяздонных зорных вышыняў. Каб у гэтым пераканацца трэба ўсяго толькі ў ясную маладзіковую ноч паглядзець на неба праз тэлескоп – і гэтае відовішча скорыць вас назаўжды. Пачынаючым сузіральнікам касмічных прастораў дапаможа кніга "Над намі — неба", якая нядаўна выйшла ў выдавецтве "Мастацкая літаратура". Яна ў цікавых фактах, паданнях і легендах распавядае пра сузор'і, зацьменні, планеты, астэроіды, каметы і метэоры. Такое выданне на беларускай мове — першае ў нашай краіне. Яго аўтар Кастусь Цыркун, настаўнік фізікі па адукацыі, свае захапленне і веды перадае маладому пакаленню — ужо больш як трыццаць гадоў ён вядзе астранамічны гурток у Рэспубліканскім цэнтры тэхнічнай творчасці навучэнцаў.

Усе мы ляцім да зор

— У кнізе сярод іншай вельмі жыва і вобразна пададзенай інфармацыі, безумоўна, прыцягваюць увагу расповеды пра тое, як пэўныя сузор'і ўяўляліся беларусам, якія назвы ім давалі нашыя продкі. Адкуль гэтыя звесткі?

— Матэрыялы, змешчаныя ў выданні, збіраліся вельмі даўно. Я заўсёды імкнуўся зацікавіць сваіх гурткоўцаў пытаннем: як беларусы ў даўніну ставіліся да зорнага неба? І вось мой вучань Цімафей Авілін даследаваў літаратуру XVII–XVIII стст., ездзіў па вёсках, апытваў старых людзей і сабраў вельмі адметны матэрыял. Высветлілася, што, да прыкладу, Вялікая Мядзведзіца, якую звычайна ўяўляюць, як коўш, беларусам бачылася ў выглядзе стога сена альбо каня з возам, Малая Мядзведзіца нагадвала нашым продкам каромысла, а сузор'е Касіяпеі — двух касцоў. Скарыстаныя ў кнізе і іншыя вучнёўскія працы. Напрыклад, у 1985 годзе дзве дзяўчынкі зацікавіліся касмічнай тэмай у творчасці Язэпа Драздовіча. У той час якраз выйшла кніга "Вечны вандроўнік" Арсена Ліса пра гэтага мастака. Дзяўчынкі (адна з іх, Таццяна Кальтман, дарэчы, сёння прафесійны астраном у Расіі) прааналізавалі не толькі яго карціны, але і брашуры "Нябесныя бегі", у якіх ён разважаў, да прыкладу, пра кольцы Сатурна. Асобныя моманты з той працы таксама знайшлі месца ў кнізе.

— У чым унікальнасць вашай кнігі? І ўвогуле ці шмат існуе літаратуры па астраноміі беларускіх аўтараў?

— Беларускіх выданняў вельмі мала, іх можна лёгка пералічыць: "Открытие Вселенной: прошлое, настоящее и будущее" (1991) Аляксандра Патупы, Галіны Макеевай "Что мы знаем о планетах?" (1978), Аляксандра Трафіменкі "Вселенная: творение или развитие" (1987) ды некаторыя іншыя. Апошнім часам выйшаў першы беларускі падручнік па астраноміі для 11 класа, а з ім вучэбна-метадычны комплекс па астраноміі для настаўнікаў.

Астраномія — фізіка-матэматычная навука, яна досыць складаная для чалавека, які застаецца сам-насам пад начным небам і хоча проста атрымаць эстэтычныя ўражанні, а не імкнецца ведаць, якія працэсы адбываюцца ў недрах Сонца ці зор. У маёй кнізе няма ніводнай формулы, затое тут шмат легенд і паданняў, цытат з твораў беларускіх паэтаў і пісьменнікаў — У. Караткевіча, А. Звонака, М. Багдановіча. Дарэчы, у мяне ёсць задума сабраць творы беларускіх аўтараў пра зорнае неба і зрабіць такую своеасаблівую анталогію — хаця б у фармаце часопісных публікацый.

— Большасць матэрыялаў кнігі друкавалася ў часопісе "Роднае слова" з 2000 па 2007 год. Як вы трапілі ў рэдакцыю?

— Вельмі проста. Міхась Шавыркін раней працаваў у часопісе "Народная асвета", рэдакцыя якога знаходзілася ў адным будынку з нашым Рэспубліканскім цэнтрам. І ён часам заходзіў да нас у гурток, глядзеў праз тэлескоп на Венеру і Сатурн, а пасля, калі стаў галоўным рэдактарам "Роднага слова", прапанаваў мне зрабіць такі праект.

— Часта бывае, што пакінуўшы гурток, вашы вучні працягваюць цікавіцца астраноміяй? І з якімі пытаннямі прыходзяць да вас сучасныя дзеці?

— Для многіх гэта пасля становіцца хобі на ўсё жыццё. Вось, напрыклад, у маёй кнізе змешчаныя фота фаз Месяца, зробленыя былымі гурткоўцамі Канстанцінам Марозавым, Юрыем Гарачкам, Міхаілам Абгаранам. Яны займаюцца гэтым пааматарску, робяць сайт (objectstyle.org/astrominsk), але ўжо выйшлі на дастаткова сур'ёзны ўзровень, іх здымкі былі апублікаваныя ў двух апошніх нумарах вельмі прэстыжнага амерыканскага часопіса "SKY & TELESCOPE". Часам, былыя вучні прыходзяць да мяне з сем'ямі, са сваімі дзецьмі, мы абмяркоўваем пэўныя пытанні, і я ўжо не ведаю, хто каго вучыць — я іх, ці яны мяне.

А сучасныя дзеці часта ведаюць, чаго хочуць, маюць канкрэтныя ідэі. Многія прыходзяць спытаць, чаму людзі бачаць "талеркі". Быў час, калі кожны другі мяне гэтымі "талеркамі" закідваў. Ёсць дзеці, якім цікава назіраць, яны купілі тэлескоп, але не ведаюць, што з ім рабіць.

— А што вы ім адказваеце пра "талеркі"?

— Кажу, што трэба праводзіць даследаванні. Ёсць шмат невытлумачальнага. Вось я, напрыклад, калісьці зрабіў некалькі кадраў, на якіх адлюстраваўся незвычайны вялікі шар у небе, на здымках бачна, што ён рухаўся адносна аблокаў. Нават даслаў у маскоўскі уфалагічны цэнтр, праўда, адказу не атрымаў.

Мой вучань Цімафей Авілін даследаваў літаратуру XVII–XVIII стст., ездзіў па вёсках, апытваў старых людзей і сабраў вельмі адметны матэрыял. Высветлілася, што, да прыкладу Вялікая Мядзведзіца, якую звычайна ўяўляюць, як коўш, беларусам бачылася ў выглядзе стога сена альбо каня з возам, Малая Мядзведзіца нагадвала нашым продкам каромысла, а сузор'е Касіяпеі — двух касцоў.

— У Беларусі ёсць прафесійныя астраномы?

— Тых, якія атрымліваюць за сваю працу грошы, няма. Ды і ва ўсім свеце прафесійных астраномаў усяго некалькі тысяч. Досыць шмат людзей з астранамічнай адукацыяй, многа аматараў. У Беларусі ёсць тры прыватныя абсерваторыі — Сяргея Шурпакова пад Оршай, Івана Сяргея каля Маладзечна і Віталя Неўскага, які ў 2009 годзе на сваёй абсерваторыі, у дачным пасёлку пад Віцебскам першы ў Беларусі адкрыў астэроід. А каметы беларусы пакуль што ніводнай не адкрылі.

— А метэарытаў шмат знойдзена ў нашай краіне?

— На тэрыторыі Беларусі адбылося выпадзенне шасці метэарытаў. Некаторыя з іх можна пабачыць у музеі мінералаў Інстытута геахіміі і геафізікі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Выпадзенне — даволі рэдкая з'ява, яго нельга прадказаць, за ім нельга назіраць. Колькі мне прыносілі ўсялякіх "метэарытаў"! У асноўным гэта былі альбо незвычайныя камяні, альбо вытворчыя шлакі. А бывала, я сам не мог зразумець, што гэта такое, тады адпраўляў у Інстытут геахіміі і геафізікі. Але ніколі не прыходзіла да мяне навіна, што гэта быў сапраўдны метэарыт.

— Вы знаёмыя з касманаўтамі?

— З беларусамі Клімуком і Кавалёнкам ніколі не сустракаўся. А ўвогуле я часта ездзіў на розныя міжнародныя канферэнцыі, дзе пасля афіцыйных сустрэч, вялася доўгія нефармальныя размовы, часам, да самай раніцы са многімі касманаўтамі. Я збіраў іх аўтографы — толькі ад савецкіх і расійскіх касманаўтаў у мяне каля сарака. Доўгі час ліставаўся з японскім касманаўтам Маморы Моры, з якім мы хацелі рабіць сумесны адукацыйны праект. З расіянінам Аляксандрам Серабровым я ўвогуле добра знаёмы ўжо больш як 20 гадоў.

— Можаце даць такі астранамічны анонс: што цікавае можна будзе назіраць у небе над Беларуссю ў бліжэйшы час? І якія з'явы вас найбольш уражваюць?

— Больш за ўсё ўражвае сонечнае зацьменне. Я ў 1990 годзе адмыслова ездзіў у Беламорск, гэта немагчыма перадаць: над светлым морам узыходзіць Сонца, і раптам усё патанае ў поўнай цемры, неба сярод раніцы іскрыцца зоркамі, планетамі, караблі на рэйдзе запальваюць ліхтары... У маёй кнізе даецца інфармацыя, калі сонечныя зацьменні здараліся ў Беларусі. Апошняе поўнае зацьменне Сонца назіралася ў нас у 1954 годзе, я сустракаўся з многімі людзьмі, якія яго бачылі — успаміны засталіся на ўсё жыццё. Наступнае чакаецца не хутка — у 2048 годзе. Затое можна будзе назіраць частковыя сонечныя зацьменні — напрыклад, 4-га студзеня 2011 года. А бліжэйшае частковае ценявое зацьменне Месяца чакае нас сёлета пад Новы год — 31 снежня. Поўнае месяцовае зацьменне адбудзецца 15 чэрвеня 2011 года.

З іншых самых яркіх відовішчаў — невытлумачальна прыгожая планета Сатурн з чароўнымі кольцамі, якія ў добрае надвор'е можна назіраць нават у аматарскі тэлескоп. Цяпер добра бачны Юпітэр, а калі прачнецеся за гадзіну да світанка, то на ўсходзе пабачыце яскравую планету кахання Венеру. Гледзячы на начное неба за горадам, раптам заўважыце некалькі знічак, загадайце жаданне — гэта метэорная плынь. З'яўляюцца ў небе і каметы, але яны, як правіла, дастаткова слабыя, іх трэба назіраць у магутны тэлескоп.

Зорнае неба ўвесь час змяняецца, гэта такая ж частка нашага жыцця, як лес, поле, рэчка, як наша родная мова. Таму яно заўсёды цікавіць людзей.

Саша ДОРСКАЯ

Мастацтва перамогі

Упершыню за шасцігадовую гісторыю існавання міжнароднага конкурсу "Мастацтва кнігі" краін-удзельніц СНД Беларусь узяла "Гран-пры". Перамогу прынёс фаліянт "Напалеон Орда. Шлях да Бацькаўшчыны", які пабачыў свет у выдавецтве "Мастацкая літаратура".

У конкурсе ўдзельнічалі выданні з дзевяці краін — Азербайджана, Арменіі, Беларусі, Казахстана, Кыргызстана, Малдовы, Расіі, Таджыкістана, Украіны, а таксама Эстоніі, якая сёлета далучылася да спаборніцтва ўпершыню. Але ўдача гэтым разам была на баку нашых кнігавыдаўцоў, якія прывезлі на радзіму самую большую колькасць узнагарод — сем дыпломаў розных ступеняў. Акрамя "Мастацкай літаратуры", былі адзначаныя кнігі выдавецтваў "Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі", "Беларуская Праваслаўная Царква", выдавецкага дома "Беларуская навука".

Назва конкурсу кажа сама за сябе — ацэньваецца ў першую чаргу менавіта "знешнасць" выдання — праца дызайнераў, мастакоў, паліграфія. Кнігу "Напалеон Орда. Шлях да Бацькаўшчыны" афармляў вядомы беларускі мастак-акварэліст Вячаслаў Паўлавец. "Нам цяжка саперніцаць у якасці паліграфіі, напрыклад, з Расіяй, бо яны многія кнігі друкуюць у Кітаі ці Японіі, а мы — заўсёды на беларускіх камбінатах. Але вынікі конкурсу паказваюць, што і нашы кнігі канкурэнтаздольныя", — кажа галоўны рэдактар выдавецтва "Мастацкая літаратура" Віктар Шніп.

Другі год запар конкурс "Мастацтва кнігі" падтрымліваецца Міждзяржаўным фондам гуманітарнага супрацоўніцтва краін-удзельніц СНД. Па ўмовах конкурсу, выдавецтва "Мастацкая літаратура" як яго пераможца атрымала мільён расійскіх рублёў для выпуску дадатковага тыражу. Кніга будзе распаўсюджвацца ў краінах СНД. Віктар Шніп распавёў, што альбомы, прысвечаныя творчасці мастака, педагога, музыканта Напалеона Орды, выходзілі раней у некалькіх выдавецтвах. Але гэтая кніга, складзеная кандыдатам гістарычных навук, спецыялістам па ахове гісторыка-культурнай спадчыны Брэсцкай вобласці Леанідам Несцярчуком — найбольш поўная беларускамоўная навуковая манаграфія, прысвечаная выбітнаму дзеячу нашай культуры. Леанід Несцярчук даўно даследуе яго творчасць, матэрыял для кнігі збіраўся на працягу 15 гадоў, трэба было падрыхтаваць і сістэматызаваць усе фотакопіі акварэляў Орды, для іх публікацыі браліся дазволы ад кіраўніцтва нацыянальных музеяў Кракава і Варшавы. У выданні змешчана 238 ордаўскіх выяў беларускіх гарадскіх аб'ектаў і пейзажаў, а таксама 98 малюнкаў, прысвечаных пераважна гістарычным краявідам памежных з Беларуссю рэгіёнаў. Ордаўскія подпісы аб'ектаў перакладзеныя з польскай і французскай моў на беларускую. Для даследчыкаў архітэктурнай спадчыны Беларусі пейзажы Напалеона Орды маюць неацэннае значэнне, бо дазваляюць вызначыць, дзе размяшчаліся тыя ці іншыя будынкі, убачыць аблічча радзімы XIX стагоддзя.

Аляксандра ХАЛОПІК

Даследчык «Сымона-музыкі»

Заўважнай постаццю ў літаратурным руху 20—30-х гадоў мінулага стагоддзя быў літаратуразнаўца, таленавіты крытык, празаік і паэт Адам Антонавіч Бабарэка (1899—1938), адзін з заснавальнікаў і кіраўнікоў літаратурна-мастацкіх згуртаванняў "Маладняк" і "Узвышша".

Нарадзіўся Адам Бабарэка ў вёсцы Слабада-Кучынка Слуцкага павета Мінскай губерні (цяпер Капыльскага раёна Мінскай вобласці) у сям'і беззямельных сялян. Бацька яго памёр рана, і Антона як сірату прынялі ў Слуцкую бурсу. Потым ён скончыў Мінскую духоўную семінарыю. Настаўнічаў у вясковых школах на Случчыне. У час польскай акупацыі А. Бабарэка ўдзельнічаў у партызанскім руху, быў арыштаваны польскімі ўладамі. У 1921—1922 гадах ён служыў у Чырвонай Арміі, быў палітработнікам. Пасля дэмабілізацыі вучыўся на этнолага-лінгвістычным аддзяленні Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Выкладаў беларускую мову і літаратуру ў Камуністычным універсітэце Беларусі, быў асістэнтам на кафедры беларускай літаратуры БДУ.

Першыя літаратурныя спробы А. Бабарэкі адносяцца да 1918 года, калі ён, як амаль усе беларускія пісьменнікі і публіцысты, працаваў селькарам. У 1920 годзе творы А. Бабарэкі пачалі з'яўляцца на старонках рэспубліканскага друку пад псеўданімамі Якім Каліна, Адам Чырвоны, Адам Гаротны. Яго першыя вершы былі пра рэвалюцыю, новае жыццё і сацыялістычнае будаўніцтва, яны звярнулі на сябе ўвагу Цішкі Гартнага. Апавяданні А. Бабарэкі даносяць атмасферу тагачаснай беларускай вёскі ("Каля балота"), нагадваюць літаратурна апрацаваныя ўспаміны з часоў падпольнай барацьбы супраць белапольскай акупацыі ("Цёмнай ночкай"). Гэтай тэме прысвечаны і ўрыўкі з аповесці "Мяцежным шляхам". У гумарыстычных апавяданнях пісьменніка "Мікіта Шпэндзік" і "Як красназорцы зямлі сцураліся" адлюстраваны асобныя моманты жыцця новай сацыялістычнай вёскі. У 1925 годзе выйшла асобная кніжка пісьменніка "Апавяданні". Да 1926 года ён надрукаваў напісаны ў жанры апавядання цыкл сімвалічных імпрэсій "Вобразы без рамак і асадкі" і свае апошнія вершы, але часцей у друку пачалі з'яўляцца яго крытычныя артыкулы і даследы, якія выявілі сталыя веды пісьменніка ў галіне літаратуразнаўства.

Яшчэ ў 1923 годзе А. Бабарэка хацеў напісаць манаграфію пра творчасць Міхася Чарота. Гэты намер ён ажыццявіў толькі часткова ў 1925 годзе, калі надрукаваў літаратурна-даследчы артыкул "Лірыка Міхася Чарота", у якім прааналізаваў працэс ідэйна-мастацкага станаўлення паэта на падставе яго першага зборніка вершаў "Завіруха". А. Бабарэка быў адным з першых беларускіх крытыкаў, які прыкмеціў арыгінальны, тыпова беларускі сатырычны талент Кандрата Крапівы, высока ацаніў творчасць У. Дубоўкі, Паўлюка Труса, прозу Кузьмы Чорнага і Змітрака Бядулі, даў усебаковы аналіз выдатнай коласаўскай паэме "Сымон-музыка". Яго крытычную пранікнівасць высока ацаніў Якуб Колас. Першым з маладых крытыкаў А. Бабарэка пачаў гаварыць пра неабходнасць вывучэння старажытнай беларускай літаратуры, творчасці Ф. Скарыны, С. Буднага, В. Цяпінскага. У шматлікіх выступленнях у друку ён развіваў думку аб тым, што рух моладзі ў літаратуры і мастацтве трэба вітаць, узнімаў шэраг тэарэтычных пытанняў і на гэтай падставе быў абвінавачаны ў фармалізме, ідэалізме і антысаветчыне. У 1930 годзе пісьменніка арыштавалі і саслалі ў пасёлак Слабадскі Вяцкай вобласці, а ў 1937 годзе рэпрэсіравалі другі раз. Пакаранне адбываў у Комі АССР. Жыццёвы шлях літаратара трагічна абарваўся ў 1938 годзе. Рэабілітаваны ён быў у 1957 і 1959 гадах.

Кацярына ВАРАНЬКО

Працяг тэмы

Юзаф Ігнацы Крашэўскі — польскі пісьменнік і гісторык, публіцыст, этнограф, фальклярыст, які пакінуў у спадчыну найбагацейшую літаратурную скарбонку не толькі роднай Польшчы, але і Беларусі.

На старонках "ЛіМа" (№ 30, 14 жніўня 2009 года, артыкул Аляксандра Вашчанкі "Кнігі, невядомыя сучаснікам") прачытала: "Яго глыбокія веды робяць даступным кожны прадмет, і гэта дае яму ганаровае месца не толькі паміж пісьменнікамі сваёй айчыны, але нават паміж еўрапейскімі знакамітасцямі. Яго творы перакладзены не толькі на рускую мову, але на нямецкую і французскую".

Загадкі гісторыі

А на беларускую? Давайце паглядзім. У 2007 годзе выдавецтва "Мастацкая літаратура" ў серыі "Скарбы сусветнай літаратуры" выпусціла на роднай мове гістарычныя аповесці Юзафа Крашэўскага "Маці каралёў (Ягайлавы часы)" (1883) і "Паперы Глінкі" (1872). Са старонак аповесці "Маці каралёў" паўстаюць выразныя постаці Вітаўта і Ягайлы, палітычныя адносіны паміж Вялікім княствам Літоўскім і Польшчай. Галоўная гераіня твора — маці будучых каралёў Уладзіслава і Казіміра Соф'я Гальшанская (з беларускіх князёў — друцкіх) з'яўляецца яскравым прыкладам жаночай мудрасці. Справядлівая і добрая Соф'я, ласкавая пакорлівая жонка, нябачна кіруе праз Ягайлу Польшчай так, быццам знаходзіцца зусім воддаль ад палітычных падзей. "Русінка", як называла яе шляхта, прысвяціла ўласнае жыццё сынам і ўзвяла на польскі трон 14-гадовага Уладзіслава. Міхась Кенька ў прадмове да аповесці робіць акцэнт на мастацкім вымысле і тлумачыць гэта тым, што Крашэўскі будаваў сюжэт на падставе "Хронікі Польшчы" і скарыстаў непраўдзівыя звесткі. Можа, гэта і так. Але польскі пісьменнік С. Жэромскі пісаў, што "Крашэўскі быў здольны з археалагічнай дакладнасцю маляваць жыццё дзядоў нашых"...

"Паперы Глінкі" і "Кароль у Нясвіжы" (1887) яскрава паказваюць неўтаймаваны нораў і багатую фантазію Каралля Станіслава Радзівіла (Пане Каханку). Толькі дзівак Радзівіл, ласы да жанчын, палявання і тэатралізаваных пастановак, мог паддацца на падман авантурыста Кшыскага, няўзброены пабегчы на раз'ятранага мядзведзя ды бамбардзіраваць абралтар (у замалёўках "Кароль у Нясвіжы" ("Маладосць", 2009, № № 2—6) так, што Станіслаў Аўгуст Панятоўскі ледзь не страціў прытомнасць...

На старонках часопіса "Маладосць" (2008, № № 4—9) пабачыла свет і гістарычная аповесць "Апошняя са Слуцкіх князёў: хроніка Жыгімонта Трэцяга" (1841) у перакладзе М. Кенькі.

"Апошняя са Слуцкіх князёў" Соф'я Алелькавіч таксама стала галоўнай дзеючай асобай гістарычнай драмы "Магнаты і сірата" ("Маладосць", 2009, №№ 6-7), напісанай Уладзіславам Сыракомлем праз 18 год пасля твора Крашэўскага. М. Кенька ў прадмове піша: "Магчыма, абодва пісьменнікі — і Крашэўскі, і Сыракомля — карысталіся адным і тым жа зыходным матэрыялам". А са слоў І. Багдановіч, перакладчыка твора "Магнаты і сірата", "...шлюб з Янушам непажаданы для Соф'і не толькі з-за амбіцый яе апекуна, але і па прычыне яе даўняй глыбокай закаханасці ў іншага. Яе абраннік — пляменнік Хадкевіча Караль, таксама таемна даўно закаханы ў Соф'ю. Януш — пагардлівы, пыхлівы, самаўлюбёны. Караль наадварот шчыры, далікатны. Яна, пераадольваючы найвялікшую душэўную пакуту, адмаўляецца ад шчаслівай будучыні з Каралем і згаджаецца на шлюб з Янушам Радзівілам. Толькі так яна можа выратаваць свой народ і край. Адзін далікатны жэст яе рукі спыняе раз'ятраныя, узнятыя над галовамі палашы зацятых, аслепленых нянавісцю ваяроў". "Апошняя са Слуцкіх князёў" апавядае пра сяброўства, яшчэ з дзяцінства, Януша і Соф'і, каханне, пакуты князёўны з-за вайны і магчымага скасавання шлюбу з Янушам.

Калі Крашэўскі і Сыракомля пры напісанні карысталіся аднымі і тымі ж крыніцамі, адкуль такое разыходжанне фактаў? І каго на самай справе кахала апошняя князёўна са старадаўняга роду? Зноў загадка...

Вольга ПАЛУНЧАНКА

На адметнасць асобы ўказаў... аўтограф

Некалькі гадоў таму ў букіністычнай кнігарні "Вянок", што ў Траецкім прадмесці на беразе Свіслачы, я набыў кнігу М. Безбародава "Гутніцтва ў Старажытнай Русі". Кніга гэтая была выдадзеная яшчэ ў 1956 годзе выдавецтвам Акадэміі навук БССР дзвюхтысячным накладам. Аднак не толькі год выдання і наклад прыцягнулі маю ўвагу. На зваротным баку цвёрдага пераплёту ўбачыў аўтарскі надпіс: "Шматпаважанаму Георгію Іосіфавічу Пех у знак удзячнасці ад аўтара. М. Безбародаў. 18. XII. 1956 г. г. Мінск". Ні аўтар, ні той, каму падпісана гэтая кніга, мне не былі вядомыя. Таму ў першую чаргу я пачаў шукаць звесткі пра аўтара кнігі.

Міхаіл Аляксеевіч Безбародаў — вядомы савецкі вучоны ў галіне фізічнай хіміі і тэхналогіі шкла і сілікатаў, акадэмік Акадэміі навук БССР, доктар тэхнічных навук, прафесар. Ён нарадзіўся ў 1898 годзе ў Пецярбургу. Па заканчэнні Петраградскага тэхналагічнага інстытута Міхаіл Аляксеевіч прыехаў у Беларусь і звязаў з ёй усё сваё далейшае жыццё.

Згаданая вышэй манаграфія — гэта першая частка задуманага аўтарам даследавання развіцця гутніцтва ад зараджэння да нашых дзён. Яна пабудавана на аснове хімікатэхналагічнага вывучэння старажытнарускага шкла, а таксама іншых прыёмаў эксперыментальных даследаванняў, праведзеных у 1952—1955 гг. лабараторыяй тэхналогіі шкла і сілікатаў Беларускага політэхнічнага інстытута.

Што да Г. І. Пеха, то пра яго доўгі час не ўдавалася знайсці ніякіх звестак. І вось аднойчы ў мяне ў руках апынуўся зборнік матэрыялаў навукова-практычнай краязнаўчай канферэнцыі, што праходзіла ў Ваўкавыску ў 1995 годзе пад назвай "Ваўкавышчына: з гісторыі краю і людзей". Сярод іншых публікацый у зборніку былі і артыкулы Я. Звяругі і А. Чарныша, якія і дапамаглі мне ў высвятленні асобы гэтага чалавека.

Аказваецца, Георгій Іосіфавіч Пех жыў і працаваў у Ваўкавыску, жыхары лічылі яго самародкам-краязнаўцам. Яшчэ ў 1925 годзе разам з Ю. Ядкоўскім, а пазней і самастойна ён праводзіў першыя археалагічныя раскопкі так званай "Шведскай гары" і Замчышча. Відаць, гэта і падштурхнула Георгія Іосіфавіча да збірання помнікаў матэрыяльнай культуры Ваўкавыска. Калі ў 1940 годзе пастановай Савета народных камісараў БССР быў адкрыты Ваўкавыскі краязнаўчы музей, то асновай яго паслужыла археалагічная калекцыя, сабраная Г. Пехам на працягу многіх гадоў.

Цяжка сказаць, якой была гэтая даваенная калекцыя, Г. Пех ніякіх успамінаў не пакінуў. Сама калекцыя не захавалася — музей быў абрабаваны фашысцкімі акупантамі. Адзіным сведчаннем яго існавання і яго экспазіцыі з'яўляецца невялікая нататка "Помнікі старыны", змешчаная ў газеце "Заря" (№ 68 за 1940 г.), якую напісаў будучы дырэктар музея — Г. Пех: *"Археалагічныя даныя, атрыманыя пры раскопках у гэтай мясцовасці, дазваляюць аднесці помнікі старыны да IX—XII стагоддзяў. Тут былі ўсходнія славяне. Шляхам раскопак супрацоўнікі атрымалі шмат гістарычных матэрыялаў, напоўнілі краязнаўчы музей новымі цікавымі экспанатамі"*.

Другое нараджэнне музея адбылося восенню 1948 года і зноў ля яго вытокаў стаяў Георгій Іосіфавіч. Раскопкі археалагічнага комплексу ў Ваўкавыску вяліся ўжо вучонымі АН БССР, але ў іх, як і раней, актыўны ўдзел прымаў Г. Пех. Да гэтага пасляваеннага перыяду, відаць, і адносіцца яго знаёмства з Безбародавым, пра што сведчыць удзячнасць апошняга Г. Пеху за прадастаўленне для кнігі фрагментаў шкляных вырабаў, знойдзеных пры археалагічных раскопках.

Георгій Іосіфавіч Пех завяршыў сваю працу ў музеі ў 1967 годзе, аддаўшы яму амаль чвэрць стагоддзя. Цяпер гэты музей носіць імя рускага палкаводца П. Багратыёна. Удалося адшукаць пакуль толькі адзін артыкул Г. Пеха "Раскопки в Волковыске в 1958 году", які быў надрукаваны ў першым нумары часопіса "Советская археология" ў 1963 годзе.

Так аўтограф на адной кнізе паяднаў лёсы двух неардынарных людзей Беларусі — выбітнага вучонага-хіміка, акадэміка Міхаіла Безбародава і краязнаўцу-энтузіяста, археолага-аматара Георгія Пеха.

Вячаслаў АФАНАСЬЕЎ

Сёлета споўнілася б 95 год з дня нараджэння Данілы Канстанцінавіча Міцкевіча, заслужанага дзеяча культуры Беларусі, стваральніка і першага дырэктара Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа, старэйшага сына песняра. Колькі разоў і з якіх розных нагод даводзілася Данілу Канстанцінавічу выступаць са словам пра свайго бацьку ў аўдыторыях, па радыё, у друку! Дачка Данілы Канстанцінавіча — Вера Данілаўна — увазе чытачоў газеты "Літаратура і мастацтва" прапануе выступленне Данілы МІЦКЕВІЧА "Якуб Колас і музыка", якое прагучала на Беларускім радыё да 100-годдзя народнага паэта ў 1982 годзе. Рукапіс захоўваецца ў сямейным архіве і раней не друкаваўся.

Якуб Колас і музыка

Беларускі народ можа ганарыцца сваёй багацейшай музычнай спадчынаю. Нашы песні прыгожыя і чароўныя.

Музыку любілі ў сям'і бацькоў Якуба Коласа. Сястра паэта Алена Міхайлаўна Лойка прыгадвае: "Хораша брат іграў на скрыпцы. Іх вучылі ў семінарыі. А Уладзя (старэйшы брат Коласа) — на гармоніку. Сам па сабе. Дык яны выйдуць, помню, вечарам, сядуць на дварэ і як зайграюць! Рэха разлятаецца навокал. Назаўтра хто прыйдзе з Акінчыц: "Малайцы, хлопцы! Дзякую за канцэрт!" Наогул у нас у сям'і любілі музыку, песні. Усе ўмелі спяваць. Я нават у хоры царкоўным была, у Мікалаеўшчыне." Колас чуў, як спявала яго маці, даводзілася з дзяцінства слухаць песні сялян. Гэта запомнілася на ўсё жыццё. Пэўныя музычныя веды дала вучоба ў Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі.

У Першую сусветную вайну Коласу давялося служыць у арміі — у Маскоўскім вайсковым вучылішчы, у запасным палку ў Пярмі, на Румынскім фронце. Часамі бацька прыгадваў вайсковую службу і спяваў салдацкія песні той пары. Я паспрабую ўзгадаць частку радкоў з дзвюх песень:

"Тучки тёмны, тучки грозны
По поднебесьи плывут.
Эй, эй, о-хо-хо,
По поднебесьи плывут.
Наши славные стрелочки
В соучении идут.
Эй, эй, о-хо-хо,
В соучении идут.
Они идут, маршируют,
Между собою говорят" —

і далей гэтак жа з прыпевам, спяваюцца наступныя радкі:

"Трудно, трудно нам, ребята
Как немецкий город брать.
А ещё, братцы, труднее
Нам под пушки подбежать.
Мы под пушки подбежали,
Закричали там: "Ура!"
Задрожала вся земля,
Сила русская взяла.
Офицерам — похвала,
Солдатушкам — награда."

А вось як пачыналася другая — жартоўная — песня:

"Пошли девки в Дон купаться (2 разы)
В Дон купаться кума, в Дон купаться..."

У нас дома былі дзве скрыпкі. Меншая, больш простая, весела ў бацькавай спальні над яго ложкам, большая, даражэйшая, ляжала ў футарале. Бацька гадзінамі граў на сваёй скрыпцы беларускія народныя песні. З класічных кампазітараў яму найбольш падабаліся Чайкоўскі і Грыг, але ж сваё роднае было бліжэй і мілей.

А па радыё найбольш любіў слухаць народныя песні сербаў і харватаў. Вельмі падабалася яму мелодыя марша Ваенна-паветранага флоту кампазітара Сяргея Васіленкі, якая часта гучала ў гады вайны.

Спявала беларускія народныя песні і наша маці. Асабліва любілі слухаць у яе выкананні песні: "З гары па даліне галубы ляталі" і "Ой, зацвіла ружа, белы цвет".

Калі ставіўся спектакль па пьесе Коласа "Вайна вайне", кампазітар спектакля Міхаіл Красеў вывучаў беларускую музыку. Ён быў у нас і прасіў паслухаць народныя песні. Помніцца, маці спявала "Ой, цёмна ночанька, яшчэ цямней будзе...".

Памятаю, як маці спявала песню на словы бацькавага верша "Каханне": "Ці помніш ты, Ганна, шчаслівы мамэнт, як граў раз на дудцы нябожчык Вінцэнт?" Акампаніраваў на скрыпцы бацька. Толькі не ведаю, чыя была музыка, ды і мелодыя не запомнілася.

Тэма музыкі сустракаецца ў творчасці Якуба Коласа. Самы яскравы прыклад — гэта яго славутая паэма "Сымон-музыка". Яна напісана пра лёс музыкі, пра музыку і сама з'яўляецца музычнай.

Коласу было вядома, што паводле гэтай паэмы ствараласа опера кампазітарам Канстанцінам Галкоўскім. Мела намер зрабіць тое самае і кампазітар Варвара Гайгерава. Вялікаю падзеяю ў культурным жыцці рэспублікі, у музычнай каласіяне, была пастаноўка на сцэне нашага Вялікага тэатра оперы і балета оперы Анатоля Багатырова "У пушчах Палесся". Прэм'ера адбылася 28 жніўня 1939 года. Перад вайною была зроблена новая рэдакцыя оперы. Бацьку асабліва падабаліся арыі Кузьміча, Аўгінні, Андрэя, арыя "Ты прыйдзі, вясна жаданая, прыйдзі".

Дзед Талаш ніяк не мог змірыцца, што ў оперы пяюць, а не гавораць. Цікава, што ён трапна падказаў мастаку оперы Сяргею Нікалаеву, як аформіць месца сховішча партызан — за дрэвам.

Якуб Колас цікавіўся развіццём музычнай справы ў рэспубліцы. Хочацца прывесці ўрывак з пісьма Коласа да тагачаснага сакратара ЦК КПБ Цімоха Гарбунова, якому бацька пісаў з Ташкента 17 чэрвеня 1942 года: "Вельмі дзякую за Ваша пісьмо, за пахвальнае слова майму вершу "Вясною"... Хацелася б ведаць, як мая "Партызанская". Можа б пры здарэнні пераслалі музыку песень? Тут жа ёсць беларускі джаз пад мастацкім кіраўніцтвам Эдзі Рознера. Пры ўсім маім скептыцызме ў адносінах да джаза, я з прыемнасцю слухаў яго выступленне. Джаз робіць вельмі прыемнае ўражанне. Нумары падаюцца з вялікім густам, умела, з захаваннем пачуцця меры. Карыстаецца джаз вялікім поспехам. Шкода толькі, што ў рэпертуары мала беларускіх нумароў, што ўсведамляе і кіраўніцтва джаза. Тут хацелася б сказаць Вам колькі слоў аб белостоцкім ансамблі песні і танца, кіраўніком якога быў у свой час Шырма. Ансамблю трэба аказаць маральную, матэрыяльную і іншую дапамогу. Вам будуць пісаць пра гэта прадстаўнікі ансамбля. Прашу ўважна паставіцца да іх паведамленняў. Ансамбль перажывае цяжкі час. Прычым некаторыя адказныя работнікі пазіраюць на ансамбль не па-балышавіцку. Адзін нават дагаварыўся да таго, што беларуская музыка і песня такі прымітыў, з якім зазорна выходзіць у свет. Гэты ж ансамбль мае свой твар. З'яўляецца чымся новым у галіне мастацтва, калі на яго сцэну выходзіць сялянства, а тутэйшыя знатакі музыкі і сцэны дабіваюцца трафарэтнага прафесіяналізму. Пагутарыце з Панцеляймонам Кандратавічам. На мой погляд, ансамбль заслугоўвае таго, каб яму давесці болей увагі і клопату...".

І гэта было сказана Якубам Коласам у грозны час вайны. Ён вельмі любіў і паважаў Рыгора Шырму, як выдатнага музычнага дзеяча і вучонага.

Якуб Колас быў членам Камітэта па дзяржаўных прэміях. Яму даводзілася знаёміцца і з музычнымі творамі, якія вылучаліся на атрыманне прэміі. Помніцца, што ён падтрымаў вядомага ўкраінскага кампазітара Канстанціна Данькевіча, твор якога спадабаўся бацьку, нягледзячы на тое, што Ілья Эрэнбург знаходзіў гэты твор прымітыўным.

Багатая творчая спадчына Якуба Коласа з'яўляецца невычэрпнай крыніцай натхнення для кампазітараў. Каля трыццаці нашых кампазітараў стваралі музыку на творы Коласа.

Да 100-годдзя з дня нараджэння Якуба Коласа створана опера"Новая зямля" паводле аднайменнай паэмы. У оперы гучыць выдатная музыка кампазітара Юрыя Семянякі. Завяршаецца і фільм-опера "У пушчах Палесся" кампазітара Анатоля Багатырова. Гэта значная падзея ў культурным жыцці рэспублікі, дарагія падарункі да 100-годдзя народнага песняра.

Публікацыя Веры МІЦКЕВІЧ

На здымках: Э. Белагураў "Дыялог"; скульптурная выява Сымона-музыкі.

Фота Віктара Кавалёва

На сваёй зямлі свае песні

Паэма "Сымон-музыка" вядома аматарам беларускай літаратуры як дзіўная гісторыя аднаго хлопчыка з душой музыкі-скрыпача. Але сэнс яе ляжыць глыбей: гэта гісторыя пра чалавека, які бачыў прыроду не толькі вачыма, але і адчуваў душой, перажываў сэрцам усе яе змены і ваганні.

І у душы яго усе з'явы
Сваё мелі аблічча.
Ён і рэха сваё кліча
І размову вядзе з ім...

Гукі так вабілі Сымона, што ён не мог не захапляцца імі пры любой магчымасці.

Але чуў ён, чуў душою
Сэрцам чуткім і жывым
У тым звоне штось такое,
Што жыло і ў ім самім.

Ён усё жыццё шукаў нейкія патаемныя месцы ў сваім сэрцы, якія адчыняліся толькі пад гукі прыроды. Сапраўдным адкрыццём для яго стала музыка для дуды. Своеасаблівае ўвасабленне і сінтэз гукаў перуноў і песень птушак — гэта тое, што ён так шукаў.

Сапраўды, гук дуды, самага містычнага інструмента нашых продкаў, пранікае ў самае сэрца. Бо канструкцыйна дуда спалучае нізкі гук, які пастаянна грае, і меладычнай жалейкі, якая настроена на інтэрвалы, дакладна якія можна сустрэць у гуках жывой прыроды. Атрымліваецца магутнае спалучэнне нізкага перуноўскага гуку і птушынай песні з боку жалейкі. Музыка дудароў так запала ў душу Сымону, што ён не мог пра іх забыць. І вось тут наступае момант, калі Сымона заўважае дзед-дудар і дорыць яму дуду ("дудку-весялушку").

Дудку дам табе я ў дар:
Ты музыка, брат няйначай,
Будзеш некалі дудар...

Так вось Сымонка і граў усё, што ў яго душы творыцца, яго пальцы як бы самі гралі, адлюстроўваючы тонкія ноты настрояў. Дуда стала яго правадніком эмоцый, яна дазволіла хлопцу зазірнуць глыбока ў сябе, убачыць тое, што так даўно не давала яму спакою...

Дуда — інструмент унікальны, як я ўжо згадваў, гэта спалучэнне нізкага гуку і высокай жалейкі, якія мантуюцца ў мех, выраблены са скуры жывёлы (часцей з казы). Музычны тон атрымліваецца ад вібрацыі пішчыка, які ўсталёўваецца на пачатку кожнай трубкі бліжэй да меха. Ён робіцца з кавалка чароту, альбо з птушынага пёрка. Гук (вялікая музычная трубка з ражком) настройваецца ў натуральны інтэрвал ад жалейкі (малая музычная трубка з адтулінамі і ражком) — квінта, альбо актава. Пры ігры ў мяху ўзнікае рэзананс паміж гукам і жалейкай, які настройвае дудара на нейкую "дудовую хвалю", што бяжыць па ўсім целе і праходзіць праз сэрца дудара (бо дуду спрадвеку па ўсім свеце трымаюць пад левай рукой). У гэты момант цяжка сказаць, хто кіруе граннем: дуда альбо дудар.

Паводле даследчыкаў XIX ст. нашага краю, дуда была вельмі папулярнаю сярод музыкаў і мелася ў кожнай вёсцы. Дудары гралі на вяселлях, хрэсьбінах, на Каляды, Купалле, нават падчас пахавання. Пра гэта сведчыць каляндарна-абрадавы фальклор Беларусі, у які дуда вельмі шчыльна ўпісана. Дудар лічыцца незвычайным чалавекам, бо ён быў не толькі музыкам, але і чараўніком. Сярод баек і паданняў часта сустракаюцца сюжэты, калі дудар зачароўвае драпежных звяроў сваім граннем, альбо як нячыстая сіла праганяецца дудовымі найгрышамі. Сустракаюцца гісторыі нават і пра самую нячыстую сілу — чорта, які граў на дудзе і "роў нечалавечым голасам".

Дудар сам быў майстрам, ён рабіў сабе дуду, аздабляў яе інкрустацыяй, настройваў і сам на ёй граў, бо гэты *сакрамэнт* лічыўся часткай дудара, і нават калі ён паміраў, дуду клалі разам з музыкай, а ражкі забіраў сабе сын-дудар.

Звычайна працэс майстравання дуды складваецца з некалькіх стадый:

— нарыхтоўка дрэва (клён, ясень, бэз, груша, яблыня). Дрэва павінна быць "перуноўскім", г. зн. пабітым маланкай-перуном;

— выпрацоўка скуры (каза, барсук, сабака), пажадана знятай цалкам з ахвяры;

— майстраванне асноўных музычных трубак;

— мантаж;

— майстраванне рагаўнёў. Дарэчы з'яўляецца самай складанай стадыяй, бо яны выраблялися цалкам з кавалка дрэва і таксама аздабляліся металічнай інкрустацыяй;

— настройка. Уключае ў сябе майстраванне пішчыкаў, свідраванне адтулін, і разлік балансу ціску паміж жалейкай і гукам.

На жаль, зараз цяжка сказаць, як дакладна і з якім міфалагічным суправаджэннем гэта рабілася, у які час, і якія пры гэтым праводзіліся абрады. Гэта вялікая тэма яшчэ чакае свайго даследчыка. Але сёння можна дакладна сцвярджаць, што дуда — інструмент містычны, высокатэхналагічны і вельмі цесна ўвязаны ў міфалогію і фальклор Беларусі, не мае дакладных аналагаў у свеце. Па сутнасці — гэта інструмент, які сабраў у сабе ўсе эмоцыі прыроды і вельмі яскрава перадае тонкі настрой песні чалавечай душы.

Такім чынам Якуб Колас намаляваў вобраз незвычайнага чалавека, музыкі, мастака і філосафа, які ўсё адчуваў сэрцам і душой, але прыйшоў да гэтага праз нешта сакральна-патаемнае — дуду. Менавіта яна раскрыла Сымона і дала яму тое пачуццё, якога ён так доўга шукаў, але ніяк знайсці не мог. Прыкладна такое "нараджэнне" адчувае кожны дудар, калі чуе тое, на што не хапае слоў, а думкі маюць вобразна-эмацыйны характар.

Дударамі-музыкамі нараджаюцца, але вельмі важна такога чалавека заўважыць і падтрымаць, накіраваць, бо калі ён не знойдзе тое, што шукае, то згубіць сэнс жыцця.

Цяпер у грамадстве адбываюцца працэсы рэвіталізацыі і адраджэння дуды. Ладзяцца сустрэчы дудароў, з'яўляюцца новыя майстры, а таксама сапраўдныя дудары: майстры-музыкі. Яны граюць на сваёй зямлі свае песні і выхоўваюць маладое пакаленне дудароў-музыкаў.

Цікава, што гэты культуральны і эмацыйны працэс нараджэння дудара, так як гэта намаляваў Якуб Колас на прыкладзе Сымона-Музыкі, адбываецца як і 1000 год таму, так і ў наш час і, спадзяюся, будзе адбывацца ў далёкай будучыні...

Алесь СУРБА,
майстар музычных інструментаў, дудар

На здымку: віленскі дудар (канец XIX — пачатак XX ст.).

Сэрца старажытнай Літвы

Усялюб — Навагрудак — Любча

Глядзім беларускую готыку

Населеныя пункты кшталту Усялюба ніяк не выпадае называць вёскамі. Мястэчка. І гучыць лепш, і адразу адчуваецца яго гістарычная важкасць.

Ва Усялюбе размяшчаецца адзін са старажытнейшых каталіцкіх храмаў у Беларусі — Крыжаўзвіжанскі касцёл. Упершыню ўзгадваецца ён у 1433 годзе. Зразумела, што ўзведзены быў яшчэ раней. Як у Вялікае княства Літоўскае прыйшла Рэфармацыя, касцёл з 1576 па 1642 быў перароблены ў кальвінскі збор. А калі зноў яго вярнулі каталікам, то пераасвяцілі ў гонар св. Казіміра. Але адметнасць святыні ў іншым — у тым, што на сёння гэта найбольш ранні ўзор готыкі ў Беларусі.

Маёнтак Усялюб некалі належаў роду графаў О'Руркаў. Гэта род ірландскага паходжання. Ірландцы, шведы, немцы, французы валодалі землямі ў нашай краіне. Было б цікава скласці асобную кнігу і ў сціслых формах падаць інфармацыю пра замежных землеўладальнікаў у Беларусі. Глядзіш, за працай над такім даведнікам атрымалася б адшукаць і шмат новай інфармацыі.

Вядома, што пры О'Рурках маёнтак быў адным з асяродкаў "галандскага" сыраварства ў Навагрудскім павеце. Ва Усялюбе захаваліся рэшткі парку пры былой сядзібе ірландскіх графаў, а таксама іх пахавальная капліца.

У мястэчку ёсць і праваслаўны храм — царква св. Міхаіла Архаанёла (1884). Захаваўся будынак сінагогі і рэшткі яўрэйскіх могілак.

Горад Міцкевіча

Сёлета Навагрудак адзначыў сваё 965-годдзе.

Нават не ведаю, чым найбольш вядомы горад. Ці то Адамам Міцкевічам, які тут жыў, а магчыма, і нарадзіўся, ці руінамі самага старога ў Беларусі замка. Прынамсі кожны, хто сюды прыязджае, не праміне наведаць старажытнае замчышча і домузей славутага пісьменніка.

Каменны замак у Навагрудку паўстаў у XIII стагоддзі. Да гэтага на яго месцы стаяла драўляная крэпасць, якая з'явілася яшчэ на два стагоддзі раней. Але з-за пастаянных набегаў крыжакоў прыйшлося будаваць умацаванне з каменя. Сёння ад замка захаваліся толькі паасобныя часткі. Але гэта напамін пра слаўную гісторыю. Бо, як сцвярджаюць гісторыкі, Навагрудак стаў першай сталіцай Вялікага княства Літоўскага. Тут быў каранаваны і першы князь ВКЛ Міндоўг. Па легендзе, у Навагрудку ён і быў пахаваны. Існуе нават гара Міндоўга, дзе нібыта і знайшоў свой спачын вялікі князь. Да 740-годдзя яго каранацыі ў 1993 г. тут з'явіўся памятны знак пра гэту дату.

З замчышча добра праглядаюцца вежы Фарнага (Праабражэння Гасподняга) касцёла. Яго заснаваў у 1395 годзе князь Вітаўт. Тут у 1799 годзе быў ахрышчаны Адам Міцкевіч. Першапачаткова касцёл быў названы ў гонар Усіх Святых, затым — Маці Божай, а пазней — Праабражэння Гасподняга. Сучасны выгляд касцёл займеў у 1723 годзе. У храме знаходзяцца парэшткі адзінаццаці сясцёр-назарацянак, якія былі забіты гітлераўцамі ў 1943 годзе. Немцы правялі масавыя арышты сярод насельніцтва горада. І тады сёстры прамовілі: "Мой Божа, калі патрэбна ахвяра жыццю, няхай лепш нас расстраляюць, чым тых, у каго ёсць сем'і". Жанчын расстралялі недалёка ад горада. Пазней Ватыканам яны былі залічаны да ліку блажэнных.

У цэнтры Навагрудка стаіць касцёл св. Міхала Архаанёла (1624). Храм неаднаразова гарэў. І кожны раз узнаўляўся. У горадзе вуліц Спартыўная і Інтэрнацыянальная знаходзяцца старажытныя татарскія могілкі. На іх налічваецца амаль дзве тысячы надмагільных помнікаў, старэйшы з якіх датуецца пачаткам XIX стагоддзя.

На праваслаўных могілках пахаваны ўнук Аляксандра Пушкіна Пётр. У 1870 годзе старэйшы сын паэта таксама Аляксандр быў прызначаны камандзірам 13-га гусарскага Нарвскага палка, які знаходзіўся тады ў Навагрудку. Тут і нарадзіўся Пётр. Але праз пяць месяцаў хлопчык памёр.

Складана вандраваць па мясцінах, якія насычаны гісторыка-культурнымі аб'ектамі. Хутка стамляешся, калі пастаянна пераязджаеш ад касцёла да царквы, ад сядзібы да музея. І гутаркі, гутаркі з людзьмі. Але па-іншаму нельга. Прапусціўшы хаця б адзін аб'ект, пасля будзеце сябе доўга дакараць.

У Навагрудку знаходзіцца дом-музей Адама Міцкевіча. У горадзе проста ўсё звязана з гэтым слынным геніем. Ёсць нават курган бессмяротнасці Адама Міцкевіча. Ён быў штучна насыпаны яшчэ ў першай палове мінулага стагоддзя. Сёння можна падняцца на яго вяршыню ды агледзець ваколіцы.

Не менш вядомы ў свеце і іншы чалавек, чый лёс звязаны з Навагрудкам. Гэта Барыс Кіт. Прафесар Кіт вынайшаў ракетнае паліва. Гэта адзін са знаных вучоных у свеце. Сёння Барыс Уладзіміравіч жыве ў Германіі. І рыхтуецца адзначыць сваё стагоддзе ў красавіку будучага года. Некалі ён выкладаў у Навагрудскай беларускай гімназіі, у будынку якой сёння размяшчаецца сярэдняя школа № 1. У школе ў адным з класаў размяшчаецца музей гэтага славутага беларуса.

Пашпацыраваць па вулачках Любчы

Мястэчка вядзе свой летапіс з XIII стагоддзя. Пахадзіць па ім — адно задавальненне. Натуральна, тут няма старых маленькіх вулачак, па якіх можна прайсціся ў Вільні ці Рызе. Але тут свая атмасфера, непаўторная. Абавязкова падыдзіце да Нёмана. Гэта рака, пра якую зараз піша кнігу адзін нямецкі даследчык. Чаму замежнікі захапляюцца нашай прыродай, а мы не? Бо гэта побач. А мы заўжды едзем абы далей ад радзімы. Трэба навучыцца бачыць прыгажосць вакол сябе.

У Любчу едуць, каб паглядзець на замак. Ад яго, праўда, захаваліся толькі дзве вежы і падмурак сцяны. Сёння тут праводзіцца рэстаўрацыя. Прычым гэта адзіны настолькі буйны праект рэстаўрацыі ў краіне, які фінансуецца не з дзяржаўнага бюджэту. Гэта прыватная ініцыятыва. Таму і справа ідзе не так шпарка, як хацелася б. Затое людзі ў сваю працу ўкладаюць душу. І тут проста не можа быць нейкіх памылак, якія здараюцца на рэстаўрацыі іншых аб'ектаў.

Побач з вежамі стаіць будынак вучэбна-вытворчага камбіната. Памылкова некаторыя думаюць, што гэты будынак належыць да старой забудовы. Ён з'явіўся ў 1950-60-х гадах. Верагодна, што пры яго будаўніцтве былі выкарыстаны рэшткі замкавых сцен. Побач стаіць флігель — гаспадарчая пабудова пачатку XX стагоддзя.

У мястэчку прыгожая царква св. Ільі (1910). Захаваўся будынак сінагогі, хедэра (яўрэйская рэлігійная пачатковая школа), міквы (басейн для рытуальнага ачышчэння пры сінагозе). А дзе ж касцёл? Касцёл, які быў пабудаваны перад пачаткам Другой сусветнай вайны, разабралі ў 1980-х гадах. Пакінулі толькі падмурак, на якім паўстаў двухпавярховы жылы дом.

Што да ўраджэнцаў Любчы, то адсюль паходзіць кампазітар Мікалай Набокаў, вядомы пісьменнік даводзіцца яму стрыечным братам. Але найлепей пра вядомых землякоў раскажа мясцовы краязнаўца Міхаіл Карповіч. Заходзьце наўпрост у школу. Там вам падкажуць, дзе шукаць краязнаўцу. А разам з тым добрага апавядальніка і экскурсавода.

Сяргей МАКАРЭВІЧ

На здымках: Крыжаўзвіжанскі касцёл ва Усялюбе; Фарны касцёл у Навагрудку; рэшткі Навагрудскага замка; вежа-брама ў Любчы; рака Нёман каля сцен Любчанскага замка.

Фота аўтара

ЛіМ

Выходзіць з 1932 года
У 1982 годзе газета ўзнагароджана ордэнам Дружбы народаў

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь

ГА "Саюз пісьменнікаў Беларусі"

РВУ "Літаратура і Мастацтва"

В.а. галоўнага рэдактара
Мікола СТАНКЕВІЧ

Рэдакцыйная калегія:
Анатоль Акушэвіч
Лілія Ананіч
Алесь Бадак
Дзяніс Барсукоў
Святлана Берасцень
Віктар Гардзей
Уладзімір Гніламёдаў
Вольга Дадзіёмава
Уладзімір Дуктаў
Анатоль Жук
Вольга Казлова
Анатоль Казлоў
Алесь Карлюкевіч
Анатоль Крэйдзіч
Віктар Кураш
Алесь Марціновіч
Мікола Станкевіч
Юрый Цвяткоў
Мікалай Чаргінец
Іван Чарота
Іван Штэйнер

Адрас рэдакцыі:
220034, Мінск,
вул. Захарава, 19

Тэлефоны:
галоўны рэдактар,
намеснік — 284-66-73

Аддзелы:
публіцыстыкі — 284-66-71
крытыкі
і бібліяграфіі — 284-44-04
прозы і паэзіі — 284-44-04
мастацтва — 284-82-04
бухгалтэрыя — 284-66-72
Тэл./факс — 284-66-73

E-mail: lim_new@mail.ru

Адрас у Інтэрнэце:
www.lim.by

Пры перадруку просьба спасылацца на "ЛіМ".
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе.
Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі, асноўнае месца працы, зваротны адрас.
Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі і думкамі аўтараў публікацый.
Набор і вёрстка камп'ютэрнага цэнтра РВУ "Літаратура і Мастацтва".

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах.

Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва".

Друкарня Рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку"
г. Мінск,
пр. Незалежнасці, 79.

Індэкс 63856
Наклад 3016
Умоўна друк. арк. 3,72
Нумар падпісаны ў друк 30.09.2009 у 11.00

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 715
Заказ — 5295

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

ISSN 0024-4686